№5 (126) 15 САКАВІКА 1999 г.
НН
НАША НІВА
Газэта заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991
ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА
ВЫДАВЕЦ РЭДАКЦЫЯ ГАЗЭТЫ «НАША НІВА»
HTTP://MEMBERS.XOOM.COM/NASA_NIVA

МОДА НА ЭКСТРЭМІЗМ

Тэма нумару

У мэтро на «Кастрычніцкай», дзе раней тусаваліся панкі-пацыфісты, цяпер зьбіраюцца скінгеды. Фанаты менскага «Дынама» голяць галовы, карыстаюцца сымболікай гішпанскіх фашыстаў і арганізоўваюцца, як нямецкія хуліганы. Расісцкая рок-група «Красные звезды» раве «Russland über alles», наш сьцёбны «Нэйрадзюбэль» адказвае песьняй «Bielarus über alles». Купка РНЕ-ПТВ-шнікаў прымусіла пра сябе гаварыць, бо пазаклейвала платы сваім «калаваротам», стылізаванай свастыкай. «Спарыш» «Белага легіёну», таксама стылізаваны, клеяць паверх калавароту. РНЕшнікі з выбрытымі на скронях свастыкамі рэгулярнымі і арганізаванымі палётамі зьбіваюць нэграў і кітайцаў у інтэрнаце Лінгвістычнага ўнівэрсытэту на Варвашэпі – міліцыянты, якія там жывуць, баяцца ўмяшацца, хоць гэта іхны, баісься не баісься, абавязак — і пакуль прыяжджае выкліканая імі падмога з пастарунку, нацысты ўжо зьнікаюць. Лібэрал-дэмакраты, атожылак Жырыноўскага, сьпісачна самая шматлікая партыя Беларусі — насамрэч партыя братвы і абшчака. Беларуская моладзь выдае самадрук «Гэта мы», якому ў 1939 годзе пазайздросьціў бы Акінчыц, а эпатажны «Правы рэванш» стае адным з найбольш яркіх мастацкіх праектаў 90-х. Сёйтой з наведнікаў «Нашай Нівы» вітаецца «гайль гітлер» — прыкол.

Мода на экстрэмізм? Тэксты, сабраныя ў гэтым нумары «Нашай Нівы», пацьвярджаюць гэтую моду. «А я пайду па мястэчку, вазьму ў рукі кала і засьпяваю «ла-ла-ла-ла», — сьпявае Вольскі.

Свастыка была сымбалем усяго ангельскага панк-року канца 70-х. Але фактычна моладзь ужывае фашысцкія знакі, надаючы ім іншы сэнс. Моладзь адпрэчвае паноўную культуру хамства і даляра. Запярэчыць ёй найлепш можа тое, што найбольш моцна забаронена і выцясьняецца ў добрапрыстойным сьвеце. Моладзь абірае поўнае адмаўленьне – і апынаецца ў тусоўцы скіноў на «Кастрычніцкай». Мы зьдзіўлена адкрываем, што расісты і экстрэмісты таксама стварылі сваю субкультуру, у тым ліку й расейскія расісты й беларускія экстрэмісты, і што яны зрастаюцца з крыміналам. Якая контракультура больш прыцягальная для моладзі: расейсканацысцкая ці беларуская? Два гады таму адназначна здавалася – наша. Цяпер, гледзячы на шыхток РНЕўцаў, што з расейскай песьняй крочаць на трэніроўку ў Палац воднага спорту ці спартзалю Акадэміі мінабароны... Мы закручаныя, яны простыя. Мы гермэтычныя, яны адкрытыя. Мы ставім моўны цэнз, яны – цэнз здароўя. Мы імкнемся максымальна выкарыстоўваць магчымасьці легальнай працы, падтрымліваем клясычны сярэднеэўрапейскі рух дэмакратычнага супрацьву – публічны, грамадзянскі, негвалтоўны; за імі – клясычная нелегальная пайпадпольная арганізацыя. Мы спрабуем ствараць беларускую этыку, яны вызваляюць інстынкты. Фармальна «РБ» – наш дзяржаўны мэханізм, фактычна – іхны. Мы «не бярэм да галавы», яны «не прінімают блізка к сердцу». Мы п'ем, яны ядуць.

Агульнаэўрапейская мода на экстрэмізм падмацоўваецца ў нас яшчэ й тым, што ўсё жыцьцё вакол прасякнутае нянавісьцю. Чэргі ў крамах, пашпартныя сталы, аддзелы асьпірантуры, перапоўненыя тралейбусы на Малінаўку ці Кунцаўшчыну, мытня на мяжы – гэта штодзённыя школы нянавісьці, спадчына Савецкага Саюзу. «Красные Звёзды» — група з Кунцаўшчыны... Як і ўсюды ў Эўропе, сёньняшні беларускі экстрэмізм – рэальнасьць спальных раёнаў. «Нянавісьць» Касовіца й «Trainspotting» Уэлша – гэта пра нас. Толькі ў нас спальныя раёны большыя за цэнтар.

Расейскі імпэрскі выклік правакуе беларускі папулісцкі нацыяналістычны адказ. Калі ў 1994-м Статкевіч заявіў, што ЗБВ навядзе парадак і разьбярэцца з засільлем каўказцаў, беларуская інтэлігенцыя прамаўчала. Падтрымліваць экстрэмізм, калі ён свойскі, ці выступаць супраць любога экстрэмізму — вось тэма для роздуму.

Працяг на старонцы 5

Віктар Ганчар:

«Я АДЧУВАЮ АДКАЗНАСЬЦЬ ЗА КРАІНУ...»

Абставіны вызваленьня Віктара Ганчара, аслабленае пасьля зьняволеньня і сухой галадоўкі здароўе старшыні Цэнтравыбаркаму прымусілі мяне задумацца над журналісцкай настойлівасьцю. Ведаючы, што пляны Камісіі па выбарах прэзыдэнта не разгалошваюцца, а факты абыходжаньня зь Віктарам Ганчаром у спэцпрымальніку і вакол ягонага арышту будуць апісаныя ў іншых газэтах, я спынілася на тэме: Ганчар — чалавек і Ганчар — у сьвятле прынцыпаў газэты «Наша Ніва». Абавязкова хачу падзякаваць жонцы палітыка і яму асабіста за выдзелены мне ў такі няпросты пэрыяд час.

«НН»: Мне здаецца, што так моцна рызыкаваць сваім здароўем і нават жыцьцём можна хіба толькі ў імя ідэі ці вельмі прагматычнай мэты...

Віктар Ганчар: Насамрэч тут нават не было праблемы выбару. Для мяне асабіста выбар быў зроблены даўно. Калі, на вялікі жаль, не застаецца іншых спосабаў і сродкаў для абароны сваіх прынцыпаў, прыходзіцца йсьці на пакуты. У гэтым сэнсе, падкрэсьліваю, праблемы выбару для мяне не было. А ўлічваючы, што да ўсяго дадаецца пачуцьцё элемэнтарнай мужчынскай годнасьці, сапраўды ровень матывацыі быў надзвычай высокі. І я магу сказаць, калі б для таго, каб адстаяць свае прынцыпы, трэба было пайсьці на яшчэ большыя пакуты, я ня думаю, што для маёй матывацыі была б мяжа.

«НН»: Газэта «Народная Воля» напісала «Віктар Ганчар гатовы памерці за вольную Беларусь». Месца й роля Беларусі як краіны ў вашым змаганьні?

В.Г.: Стопрацэнтнае. Я б, можа, не пераходзіў на той высокі патэтычны ровень. Я гэта значна спрашчу, бо праўдзівыя інтэлігенты заўсёды выражаюць самае патаснае дастаткова проста. І хоць я інтэлігент у першым калене і насамрэч не прэтэндую на асаблівую інтэлігентнасьць, тым ня менш, для мяне гэта была праблема выбару для маёй краіны. Я проста не хачу жыць у краіне, дзе пануе беззаконьне і жудасны садызм.

«НН»: А Вы б змаглі жыць у Саюзе Беларусі і Расеі?

В.Г.: Гэтае пытаньне для мяне на сёньняшні дзень абсалютна абсурднае. У нас ёсьць свая краіна, свой дом. І гэтыя словазлучэньні не ба-

Працяг на старонцы 4

Знакам тым

Замежны калега-журналіст папрасіў коратка апісаць гісторыю Беларусі за апошнія пяць гадоў. Калі трэ было перачытаць кампутарны тэкст, напісаны па-ангельску, стала чырвона ўваччу ад падкрэсьленага як памылковае слова Lukashenka. Пасьля стала мутарна ў галаве, бо пасьля кожнага тэматычнага абзацу ў калегі ўзьнікала пытаньняў дваццаць. Далей – болей. А скончыла я сваю асьветніцкую дзейнасьць для калегі – журналіста, калі ён, гасьцюючы ў мяне дома ў жніўні, глядзеў Беларускае тэлебачаньне, якое паказвала «Дажынкі». Я, як магла, перакладала калегу на цывілізаваную мову нецывілізаваны канцэрт. А пасьля перакладзенай прыпеўкі, якую весела выканаў фальклёрны ансамбаль, калега проста сказаў: «Я ня веру. Ня можа такога быць». А з тэлевізара раўло:

Мы сьпявалі, танцавалі, добра веселіліся,

Выбіралі прэзыдэнта і не памыліліся...

Ужо чатыры гады назад недзе веснавою парой можна было пачуць – «Гэта ўсё. Большага маразму быць ня можа. Канец хуткі.» Пасьля слова «маразм» становіцца скарочаным камэнтаром у абмеркаваньні беларускай сытуацыі. Супрацьстаялі маразму хто як мог – галадавалі ў будынку парлямэнту, станавіліся дабраахвотным штатнымі пікетчікамі ці публіцыстамі, вывеш-

Працяг на старонцы 4

Чэслаў Сэнюх:

«Я ПАПРАСІЎСЯ Ў ГРАМАДЗЯНСТВА БНР»

Чэслаў Сэнюх — вядомы польскі літаратар, перакладчык і папулярызатар беларускай паэзіі (некалькі апошніх гадоў ён працуе над перакладам «Новай зямлі» Якуба Коласа), жыве ў Варшаве. «Новая зямля ад перакладчыка», паэма Ч.Сэнюха, выходзіць у першым нумары часопісу «ARCHE» сёлета. У 1992-м спадар Чэслаў наведваў рэдакцыю «НН», гутарка зь ім друкавалася ў газэце. А сёньня наш карэспандэнт завітаў да яго ў Варшаву.

Чэслаў Сэнюх: Пачнем з таго, што я зьяўляюся сябрам ЗАІКСу — польскай арганізацыі дзеля абароны правоў кампазытараў, паэтаў, празаікаў ды іншых людзей творчых прафэсіяў. Чэслаў Любча — мой літаратурны псэўданім, бо нарадзіўся я ў беларускім мястэчку Любча.

Ня памятаю ўжо, у якім сваім вершы згадаў, што я выхаваны чатырох славянскіх моваў. Мая мама ведала беларускую, бо яна беларуска, тады польскую, украінскую (доўгі час жыла ў Кіеве) і расейскую. Яна мне сьпявала калыханкі на гэтых чатырох мовах: «Плыне, Вісла, плыне...», «Спі, младенец мой прекрасный...» і гэтак далей. Бацька мой сьпяваў па-нямецку — як колішні аўстрыйскі падданы, бо родам з Падольля. Сам я вывучаў нямецкую ў часы акупацыі разам зь беларускай. Ні польскай, ні расейскай пры немцах ужо не было. Навуку здабываў у беларускай семігодцы, якая месьцілася ў Любчанскім замку, а таксама на панадворку, на вуліцы. Любча была такім, я сказаў бы, міжнародным мястэчкам, чатыры з паловай тысячы жыхароў. Палову складалі жыды, працэнтаў трыццаць — беларусы, у астатнія дваццаць уваходзілі палякі ды іншыя.

«НН»: Што яшчэ помніцца з часоў нямецкай акупацыі?

Ч.С.: Помніцца сяброўства ў СБМе — Саюзе Беларускай Моладзі, як сьпявалі «Мы выйдзем шчыльнымі радамі». Песьню-малітву «Магутны Божа» я пачуў упяршыню ў Любчанскай праваслаўнай царкве.

Працяг на старонцы 16

Дарагія нашаніўцы!

Ад імя Каардынацыйнага камітэту беларусаў Канады й свайго асабіста вітаю вас з 81-мі ўгодкамі Акту 25 Сакавіка 1918 году. 81 год таму 25 сакавіка ў Менску Рада Беларускай Народнай Рэспублікі як законны сувэрэнны орган беларускага народу, сваёй Трэцяй Устаўной Граматай пад назвай Акту 25 Сакавіка перад усім сьветам урачыста заявіла: «Цяпер мы, Рада БНР, скідаем з роднага краю апошняе ярмо дзяржаўнае залежнасьці, якая была накінутая расейскім царызмам на наш вольны й незалежны край. Ад гэтага часу Беларуская Народная Рэспубліка абвяшчаецца незалежнай і вольнай дзяржавай...» Словамі гэтымі Рада БНР абвесьціла дзяржаўную незалежнасьць Беларусі ды парвала ўсякія дзяржаўныя сувязі з Расеяй, часткай якой датуль была Беларусь. Сёлета, у асабліва цяжкія для Беларусі часы, сьвята адзначаючы 81-я ўгодкі векапомнага Акту 25 Сакавіка, жадаем вам добрага задроўя, непахіснай веры ў ідэалы 25 Сакавіка, духовай сілы, вытрываласьці й багатых плёнаў у вашай працы на карысьць беларускай вызвольнай справы — змаганьня за аднаўленьне дзяржаўнае незалежнасьці Беларусі.

Жыве Беларускі Народ у змаганьні!

Жыве Беларусь!

Доктар Раіса Жук-Грышкевіч, Старшыня.

ХАЙ АЛЛАГ ПАКАРАЕ ЗАБОЙЦАЎ!

Мяне, Крыніцкага Алі Мустафавіча, 3 жніўня 1993 году прызначылі на пасаду мухтасіба РБ і Калінінградзкай вобласьці РФ. І з тых часоў: у верасьні 1994 году спрабавалі забіць маю жонку, а ў 1998 годзе зьнішчылі ўсю сям'ю майго сына Юсуфа. Люда, забітая жонка Юсуфа, прыняла ў 1997 г. іслам у мячэце Навагрудка і стала Ляйлой. Была добрай мусульманкай. Старанна малілася. Свайму сыну зрабіла згодна з мусульманскім звычаем азан (хрост), назваўшы яго Цімурам. Зрабіла сюннат (абразаньне).

Рэдка калі за 750 гадоў існаваньня татараў-мусульманаў на землях ВКЛ, Польшчы і Расеі было, каб хрысьціянка стала мусульманкай у сапраўднасьці. Дагэтуль хрысьціяне ніколі не навярталіся ў мусульманства, гэта забаранялася. Можа, цяпер іх забілі за гэта? Усю сям'ю майго сына Юсуфа, у тым ліку й гадавалага дзіцёнка, расстралялі. Трагедыя адбылася а дзясятай раніцы ў цэнтры Горадні ў прысутнасьці вялікай колькасьці сьведкаў.

Юсуфу з двума кулявымі раненьнямі ўдалося зьбегчы з чацьвертага паверху свайго дому, перабегчы дарогу — вуліцу Ажэшкі. Ён спрабаваў з тэлефоннага аўтамату пазваніць у міліцыю, але тут зьявіўся тэрарыст-забойца зь пісталетам. Юсуф забег у прадуктовую краму «Верасень», дзе яго й нагнаў забойца і пусьціў яму кулю ў галаву. Пасьля раненьня Юсуф паведаміў міліцыянту, хто яго забіваў, аднак забойцу дагэтуль не знайшлі.

Праз тое, што татары-мусульмане ў Вялікім Княстве Літоўскім валодалі зямлёю, яны былі ваеннаабавязаныя і мусілі зьяўляцца на вайну. Войны тады вяліся часта. Так гінулі татары-мужчыны, пасьля чаго жонка забітага вымушана была браць шлюб з хрысьціянінам, бо жывых мусульман-мужчынаў заставалася мала. І ў выніку татараў-мусульманаў зьмяшанымі шлюбамі ператварылі ў хрысьціянаў.

Тады, у сярэднявеччы, за забітымі ня плакалі. Сьмерць за веру лічылася подзьвігам.

Мая жонка, маці Юсуфа, плача за сынам дзень і ноч. Няхай Аллаг пакарае забойцаў.

Мухтасіб Алі Крыніцкі, Горадня

***

Разумныя людзі (як, дарэчы, і нацыі) звычайна вучацца на чужых памылках, адсталыя ж — ня здольныя рабіць адпаведных высноваў нават са сваіх уласных. Выбары прэзыдэнта 16 траўня гэтага году — вось што пакажа, ці сталы наш народ. Дай жа Бог нашаму народу гэты іспыт вытрымаць з годнасьцю і ўжо зь першай спробы. Галоўнае сёньня, як мне здаецца, — перамагчы страх, які моцна запаланіў розум, сумленьне ды волю многіх беларусаў.

Ну і дае рэжым наш маху:
Усё трымае ён на страху.
Аднак, як толькі пройдзе страх,
Рэжыму тут жа прыйдзе крах!

Алесь Ляскоўскі, в. Сугакі

***

Можаце павіншаваць нас, чатырох афіцыйна, па перапісе, зарэгістраваных Ліцьвіноў. Гэта я й мае дзеці.

Ганна Сьцепулёнак, Койданава

***

Праехаў цягніком ад Берасьця да Воршы туды й назад. Скалечаная зямля. Паўсюдна так званыя дачы і на гэтых лапіках — «сабачыя будкі». Разгаварыліся з адной жанчынай і прыйшлі да высновы, што цяжка сказаць, у якое стагодзьдзе апусьціўся наш народ пасля расейскага каляніяльнага палітыка. Было кепскага, што аралі зямлю сахой і плугам, а цяпер усім дачнікам уручылі лапату. Дык ці станем мы заможнымі напрыканцы дваццатага стагодзьдзя, маючы асноўную прыладу з каменнага веку? Тым больш, што машына гною зараз каштуе 30—40 даляраў, што не кожны зарабляе такія грошы за месяц, пры сёньняшніх коштах на прадукты ў крамах.

Л.Ахрэмчык, Берасьце

DYJANETYKA NIE TAKAJA KIEPSKAJA

Paspračajusia ź ciozkam Vierabjom (Nr. 4 «NN» za hety hod). Z «Dyjanetykaj» ja znajomy ŭžo niekalki hadoŭ. Jana akazałasia asabista dla mianie karysnaj. Paznajomiŭsia i z «hrybajedaŭskimi» habardystami, i zusim nie škaduju. Va ŭsim hetym vučeńni jość peŭnyja analohii z masonstvam, ale liberalizmu ŭ habardystaŭ pabolej, a hłyboka siahać nia treba. Na moj pohlad, «Dyjanetyka» — neapahanstva, pryčym nieapahanstva jaskrava zachodniaje, prahmatyčnaje. I, miarkuju, sučasnym bielarusam bolš blizkaje pa duchu, čym polski kaścioł ci maskoŭskaja carkva. Padazraju, dziaržułady RB padumali pra toje ž, bo try hady tamu praviali kampaniju zmahańnia jakraz z kryšnaitami i habardystami. Šyrokaviadomy zaraz «prezydencki» žurnalist Jury Dudzinaŭ vystupiŭ tady ŭ «Narodnaj hazecie» z «hnieŭnym abličenniem» kryšnaitaŭ i «Dyjanetyki», pryčym z tymi ž dovadami, što i Andrej Vierabiej. Da honaru Vierabja, jon nie apuskajecca da dudzinaŭskich metafar dy epitetaŭ. A jak pa-mojmu, siamu-tamu «Dyjanetyka» sapraŭdy moža dapamahčy. «Šyzanucca» ž možna i na zvyčajnaj matematycy.

Andrej Mielnikaŭ

ПОП-КАЛЯНІЯЛІЗМ

Як пачынаецца незалежнасьць? Хутчэй за ўсё – з разуменьня сваёй выключнасьці, непадабенства да іншых, нават процістаўленьня сябе ім. Гэтае правіла распаўсюджваецца як на людзей, так і на цэлыя нацыі. Умацаваньне самасьвядомасьці звычайна адбываецца разам з барацьбой за нацыянальнае вызваленьне, якую завяршае абвяшчэньне і афіцыйнае прызнаньне незалежнасьці.

Юрыдычна Беларусь сувэрэнная. Пры гэтым наша замежная палітыка сатэлітная адносна Расеі, беларускае сяло працуе вылучна на расейскага спажыўца, беларускае тэлебачаньне – на расейскую ідэю. Быццам да самаўсьведамленьня беларусамі сябе як нацыі з асобнымі інтарэсамі справа не дайшла. Але ж мы жывем у дзяржаве пакуль юрыдычна сувэрэннай. Дзе ж найбольш страчаны сувэрэнітэт?

АСКЕПКІ ІМПЭРСКАГА БРАЦТВА

Азірнемся на пачатак 90-ых. Кажуць, з разбурэньнем камуністычнай ідэалёгіі ўтварыўся ідэалягічны вакуум. Пры гэтым не адрозьніваюць вакуум на ўзроўні афіцыйнай прапаганды і ў звычайнай сьвядомасці абывацеля. Для захаваньня ідэалёгіі найбольшае значэньне мае найніжшы ўзровень – тыя неўсьвядомленыя стэрэатыпы мысьленьня, якія завуць здаровым сэнсам. Здаровы сэнс, аднак, гэта ня нешта самаіснае, ён залежыць ад пэўнай культуры. Праз яе засваеньне чалавек адрозьнівае здаровае ад нездаровага.

Калі камуністычная ўтопія зьнікла, засталіся створаныя ёю ў масавай сьвядомасьці культурныя клішэ. Як аскепкі злога чароўнага люстэрка ў казцы Андэрсэна. Камунізм пакінуў па сабе падсьвядомыя штампы, успрыманыя іх носьбітамі як само сабой бясспрэчныя.

Зьвернем увагу: ідэя адзінства беларусаў і расейцаў у выступах беларускага прэзыдэнта ці расейскіх сьпікера Селязьнёва і мэра Лужкова пасапраўднаму й не абгрунтоўваецца. Проста абвяшчаецца адзінства гістарычных лёсаў.

Эканамісты зь лічбамі ў руках пытаюцца: што атрымае з таго яднаньня грамадзтва цалкам, а ня пара сацыяльных групаў. Як што? Гістарычны лёс, зразумела. І гэткая падмена нацыянальных інтарэсаў на мітычныя гістарычныя лёсы не сустракае непрыманьня ў большасьці людзей. Наадварот, шмат хто ўвогуле не заўважае падмены. Бо зь імі размаўляюць на мове іх здаровага сэнсу. Адной з праўдаў саўка, якія ўспрымаюцца ім як сьвятыя й бясспрэчныя, былі й застаюцца каляніяльныя ідэалягема трыадзінства ўсходніх славянаў і ўспрыманьне ўласнай нацыянальнай культуры абавязкова ў складзе больш вялікага адзінства, атассамленьне нацыянальнага вылучна з фальклёрам і самадзейнасьцю. Вось на гэтым і паразытуюць інтэгратары.

Акрамя савецкіх штампаў, у беларускім мэнталітэце ёсьць яшчэ фактар, на які натыкаецца нацыянальная самасьвядомасьць. У сучаснай культуры нацыянальная прыналежнасьць – не адзіны значны пункт самаўсьведамленьня. Аўтэнтычна нацыянальная культура ў Беларусі памерла разам з індустрыялізацыяй. Яе замясьціла іншая, тая, у якой усе мы цяпер існуем. Але барацьбіты за беларускасьць не заўважаюць зьменаў і таму церпяць няўдачу за няўдачай.

ЦЕНЬ СТАРЭЙШАГА БРАТА

Беларусь і Расея гуляюць у палітыка-эканамічную інтэграцыю, якая пагражае нам інкарпарацыяй у Расею на правах губэрні-калёніі. Значная частка беларускай інтэлігенцыі гэта разумее. Але адначасова адбываецца яшчэ адзін аншлюс, малазаўважны, які аднак зайшоў куды далей. Нацыянальную палітыку кампартыі ўжо ў часы застою перакрыў сваёй эфэктыўнасьцю буйны культурны працэс — у Савецкім Саюзе разьвівалася свая масавая культура.

З распадам СССР культурныя запыты ды эстэтычныя перавагі засталіся ранейшыя. Супольнасьць «савецкі народ», разьдзеленая дзяржаўнымі межамі, засталася без ранейшай ідэалёгіі, але з ранейшымі густамі і перавагамі. Калі раней сымбалем еднасьці расейцаў зь беларусамі былі серп і молат, то сёньня гэта шлягеры Пугачовай і кіношныя гіты Гайдая для старэйшага пакаленьня, а маладзейшым, у залежнасьці ад культурнага ўзроўню, ці Алеграва з Кіркоравым, ці Даўлатаў зь Пялевіным.

Ізноў мы апынуліся ў «рускай», зараз ужо не савецкай, а постсавецкай культуры зь яе праклятымі пытаньнямі і адказамі. «Крамрої-нэйрадзюбелі» ня здолеюць супраць адзінага Гарыка Сукачова, «Ляпісы» адны ня зробяць надвор'я ў папсе. Беларуская літаратура застаецца літаратурай для абраных, на мяжы самсябедруку для ўнутранага спажываньня. Народная Аляксандра Марыніна ляжыць тым часам на прылаўках тонамі.

Карацей, сардэчна запрашаем у поп-каляніялізм. Мы, зрэшты, не адны такія. Эўропа таксама адчувае моцны націск амэрыканскай поп-культуры. Амэрыка душыць Галівудам, Расея – Кіркоравымі-Шуфуцінскімі. Але ж Эўропа незадаволеная амэрыканскім націскам, дрыгаецца, спрабуе нечым адказаць. І штатаўцы мусяць здымаць другаякасныя рэміксы на эўрапейскія матывы. У нас жа на расейскі «внедрёж» рэагуюць найбольш пастравусячаму – галаву ў пясок.

Культурная глеба падрыхтаваная. Расейскі маскульт зьвязвае беларусаў і расейцаў у адзіную непатрабавальную публіку.

ПРАРОКІ ПА-ЗА АЙЧЫНАЙ

Каб ідэя незалежнасьці ўмацавалася ў народнай свядомасьці, трэба вызваліць гэтую сьвядомасьць ад схаваных у ёй ідэалягемаў камунізму. Але старыя песьні аб галоўным будуць вяртацца зноў і зноў, калі іх месца ня зоймуць новыя. Барацьба за незалежнасьць быццам незалежнай Беларусі – гэта таксама барацьба за месца ў культурнай прасторы ўсходнеэўрапейскага рэгіёну.

Паток расейскай папсы не адвесьці ад нашых межаў. І вось пытаньне, на якое трэба адказваць зараз: хто і як у Беларусі можа зрабіць канкурэнцыю расейцам на іх полі, ці то ў папсе, ці ў высокім штылі, як умельствам, так і колькасьцю, каб прагучаць ня толькі ў межах краіны, але, і ў першую чаргу, за яе межамі – як украінскія «Воплі Відаплясава»? Прарокі тады будуць прарокамі ў сваёй айчыне, калі іх прызнаюць прарокамі па-за яе межамі.

Алексей Маковец

ЗВАРОТ

СТАРШЫНІ РАДЫ БЕЛАРУСКАЙ НАРОДНАЙ РЭСПУБЛІКІ ІВОНКІ СУРВІЛЫ З НАГОДЫ 81-Х УГОДКАЎ АБВЕШЧАНЬНЯ ДЗЯРЖАЎНАЙ НЕЗАЛЕЖНАСЬЦІ

Дарагія суродзічы!

Зноў чорная хмара вісіць над Беларусяй. Зноў, як і чарнобыльская, надышла яна з Усходу. У надзеі на кавалак хлеба некаторыя гатовыя зноў зьяднаць свой лёс з адвечным захопнікам. Кажуць, што народ наш няжыцьцяздольны. 81 год таму нашыя дзяды абвесьцілі сьвету, што яны ЁСЬЦЬ жыцьцяздольнымі, і што яны ГАСПАДАРЫ на сваёй зямлі. Сёньня мы адзначаем гэты вялікі дзень — калі народ наш здабыў права «людзьмі звацца» і людзьмі быць.

У гэты памятны дзень я хацела б, каб кожны з нас задумаўся над тым, што ён можа зрабіць, каб не дапусьціць да новага гвалту над беларускім народам, каб народ наш выратаваўся ад новай бяды — інтэграцыі ў расейскую імпэрыю. Калі мы гэтага ня зробім, мы зноў прачнемся ў няволі. І, як кажа Васіль Быкаў, «той раз — назаўжды». Масква больш ня выпусьціць нас з кіпцюроў, і трэба будзе ў «крывавых муках» ізноў здабываць страчаную людзкую годнасьць.

Дарагія суродзічы, на пасадзе прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь сёньня ня «свой чалавек», а маскоўскі калябарант, які працуе выключна на карысьць імпэрыі. Месяц пасьля таго, як кляўся ў сваім навагоднім пасланьні, што незалежнасьць Рэспублікі Беларусь — рэч «сьвятая», ён ужо дзеліцца сваімі марамі пра ваенную магутнасьць новай імпэрыі.

Дарагія мае сёстры-беларускі, зьвяртаюся да вас, бо так, як і вы, бясконца люблю наш край. Няўжо вы дазволіце, каб вашыя сыны і ўнукі зноў паміралі за чужую імпэрыю? Яшчэ не запозна сказаць Лукашэнку ды яго маскоўскім панам: годзе ўжо нас дурыць. МЫ ХОЧАМ ЖЫЦЬ У НАШАЙ УЛАСНАЙ ДЗЯРЖАВЕ, БЯЗ СТРАХУ, БЯЗ ВОЙНАЎ, ЖЫЦЬ ДРУЖНА З НАШЫМІ СУСЕДЗЯМІ, АЛЕ АДНАЧАСНА БЫЦЬ ГАСПАДАРАМІ НА СВАЁЙ ЗЯМЛІ. МЫ ХОЧАМ ЖЫЦЬ У ДЭМАКРАТЫЧНАЙ І НЕЗАЛЕЖНАЙ БЕЛАРУСІ.

Дарагія суродзічы, прашу і заклікаю вас, не дапусьцеце да ліквідацыі нашай дзяржавы! Ад вас залежыць будучыня вашых дзетак, вашых унукаў. Не пакіньце ім у спадчыну забраны, паняволены край заміж вольнай, заможнай і гордай Бацькаўшчыны. Толькі вы можаце не дапусьціць яе загібелі. Разам мы яе адбудуем, вылечым ад ейных боляў і ўзьнясем на сьветлы пасад.

ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ!

Івонка Сурвіла,
Старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі

ЯК БУДЗЕЦЕ АДЗНАЧАЦЬ ДЗЕНЬ ВОЛІ

Менавіта такое апытаньне вырашылі мы правесьці ў гэтыя перадсьвяточныя дні.

Івонка Сурвіла, Старшыня Рады БНР: «Асабіста я буду сьвяткаваць у гэтым годзе на ўрачыстасьцях нашай грамады ў Нью-Ёрку, у Таронта і ў Манрэалі. Думкамі буду зь беларускім народам. Запалю сьвечку памяці й надзеі і пастаўлю ў вакне разам зь бел-чырвона-белым сьцягам».

Ібрагім Александровіч, Згуртаваньне беларускіх татараў: «Які дзень?.. Не, мы яго ніколі не адмячаем. Нас тут нямнога, то ад палітыкі мы трымаемся ў старане. Але ад народу мы не адлучаемся, пра сьвята ведаем, газэты ж чытаем. У нас цяпер іншыя клопаты: са дня на дзень чакаем чалавека з Савудаўскай Арабіі, які нам дасьць грошай на пабудову ў Менску мячэту па чарцяжах таго, што ўзарвалі ў 60-ых».

Міхал Анемпадыстаў, паэт, аўтар «Народнага альбому»: «Пэўне, як звычайна: схаджу на мітынг, а потым вып'ю грамаў 100—120, ня больш, бо мне здаецца, што такія даты трэба адзначаць мінімальнаю колькасьцю алькаголю».

Сяргей Астраўцоў, Горадня: «Мабыць, ніяк, бо гарэлкі я ня п'ю і, наагул, аніякіх сьвятаў не адзначаю, акрамя Вялікадня і Божага Нараджэньня. Але ўсё ж, пэўна, нейкую сымбалічную чарку падыму. Памятаю, як дзесь у 88-ым ладзілі музычную праграму, прысьвечаную ўгодкам, з «Мы выйдзем шчыльнымі радамі» і г. д. Памятаю, і апавяданьне ў мяне было «25 Сакавіка». Вось і зараз хачу напісаць невялічкае эсэ пра БНР. У нас жа тут у Горадні захаваўся дом, дзе месьціўся ўрад БНР. А яшчэ, мусіць, ускладзем кветкі да мэмарыяльнай капліцкі паўстанцам 1863-га і да Пагоні на Грунвальд ля Каложы».

Наталка Бабіна, літаратар: «За гэты год дакладна не адкажу, бо цяпер ніхто ня ведае нават, што там будзе заўтра. А звычайна мы, дарослыя, з раніцы ідзем на шэсьце, а потым удома адзначаем па-сямейнаму, гатуем сьвяточны полудзень, не працуем ужо ў гэты дзень. І першы тост маем адметны, яшчэ са студэнцкіх гадоў: «Няхай жыве й пасецца беларуская птушка бусел!» У нас два такія асаблівыя тосты: гэты – на беларускі Дзень волі, а на ўкраінскі Дзень незалежнасьці – традыцыйны ўкраінскі: каб кулі міналі, каб шаблі ня бралі. Вось так і адсьвяткуем, калі ня вырвецца чаго ліхога».

Станіслаў Багданкевіч, старшыня Аб'яднанай Грамадзянскай Партыі: «Прынамсі, пойдзем на шэсьце. Нашая партыя прыняла рашэньне прыняць актыўны ўдзел у дадзеным мерапрыемстве. Бо Воля ёсьць Воля. Я вось зараз знаходжуся пад уражаньнем ад прагляду навінаў. Наш галава зьняў з пасады магілёўскага губэрнатара. Ізноў шалеў, лаяўся, так вішчэў, што аж трэсься. А каб такога не адбывалася, каб была воля, незалежнасьць і дэмакратыя, трэба шмат працаваць».

Сяргей Высоцкі, лідэр Беларускай Партыі Свабоды: «Мы 25-га сакавіка звычайна адзначаем нейкімі акцыямі, але якімі і дзе яны будуць, мы пакуль рэклямаваць не зьбіраемся. Дзень Незалежнасьці, на мой погляд, мае пэўную аўру. Для нашае партыі ён, як і Дзень Слуцкага Збройнага Чыну, ёсьць вельмі адказным сьвятам. Хоць для сапраўднага змагара кожны дзень павінен быць адказным».

Кася Камоцкая, сьпявачка: «25-га я буду сьпяваць у клюбе «Альтэрнатыва», дзе адбудзецца прэзэнтацыя кампакт-дыску «Вольныя танцы». Днём будзе праца, падрыхтоўка да канцэрту, а потым, пасьля ўжо, зьбярэмся і адзначым усе разам. Дзень Волі — гэта дзень ушанаваньня таго ўмоўнага абвяшчэньня незалежнасьці, якое тады адбылося. Яно й сапраўды было чыста сымбалічным. Дый 27-га тое самае... Сапраўдны Дзень Волі будзе тады, калі ўлада ўсё ж лясьне, і Беларусь будзе нашай».

Аляксандар Кулінковіч, гурт «Нэйрадзюбэль»: «Можна адказваць па-расейску? Адзначу дома з жонкай, бо нагода ж ёсьць — чарговая нагода паплакаць па нашай незалежнасьці... Я ў гэты дзень з задавальненьнем заграў бы ды прасьпяваў, няхай на расейскай мове, пра тое, як я люблю сваю краіну... Не, «Belarus über alles!» з «Deutschland über alles!» ніякім чынам не зьвязаная, гэта проста пародыя на «Dead Kennedys». Увогуле, я не пераварваю ўсялякіх там скіноў, фашыкаў, баркашоўцаў, і мне дужа непрыемна, што сярод фанаў нашага гурта ёсьць такія, што на канцэртах крычаць: «Дзюбель, Гайль!» Мне здаецца, што я граю музыку не для тупых, а для разумных».

Адам Мальдзіс, дырэктар Скарынаўскага цэнтру: «25-га я буду ў Польшчы на канфэрэнцыі, прысьвечанай барока. Але падрабязьней распавесьці пра сьвята я Вам не магу, патэлефануйце, калі ласка, праз гадзіну». (Праз гадзіну): «У маім уяўленьні, той дзень быў пераломным момантам усяго беларускага адраджэньня таго пэрыяду. Канечне, тая спроба абвешчаньня Незалежнасьці не магла быць удалай. Але ж без БНР не было б БССР, як без БССР не існавала б зараз РБ. У аднаўленьне БНР я ня веру, бо тады трэ будзе гаварыць і аб вяртаньні БССР. Будзе проста Беларусь, бо ўсе астатнія словы — залішнія. Беларусь была й застаецца Беларусяй».

Зянон Пазьняк, старшыня БНФ: «Я на такую далячынь пакуль не загадваю. Усяляк можа быць. Можа, буду ў Нью-Ёрку, можа, у Варшаве, а калі пагонім Лукашэнку, дык і ў Беларусі. Вось такія вось тры варыянты».

Андрэй Пачобут, гурт «Deviation», Горадня: «Будзе, кажуць, дэманстрацыя, то сходзім на яе, а потым у вузкім коле сяброў вып'ем трохі. Для мяне Дзень Волі, як гэта ні банальна гучыць, — гэта сьвята свабоды, незалежнасьці. Хоць, насамрэч, на мяне і на маю творчасьць больш паўплывала 27-ае, бо я яго перажыў асабіста, а пра 25 Сакавіка толькі чуў або чытаў».

Эдвард Тарлецкі, Ліга сэксуальных меншасьцяў: «Пайду на дэманстрацыю, а потым пайду да сяброў піць гарэлку. Буду піць, колькі ўлезе, пакуль не паналюся. Першы тост, канечне, за БНР, а пасьля ўжо за каханьне, бо менавіта ў гэты дзень я некалі пазнаёміўся з адным вельмі прыгожым хлопцам».

Юры Хадыка, намесьнік старшыні БНФ: «На гэты дзень мы запланавалі шэсьце, мітынг. А потым дома з жонкай адзначым так, як прынята ў нармальных людзей. Дзень Волі мяне моцна натхняе, бо гэта была сапраўдная гістарычная вяха. Адначасова, гэта вельмі інтымнае для мяне сьвята, сьвята духоўнага вызваленьня. Супала, што на дзень абвешчаньня незалежнасьці прыпадае дзень Зьвеставаньня, калі, паводле традыцыі, з выраю прылятаюць птушкі і для беларусаў пачынаецца вясна, і ў гэтым супадзеньні — глыбокі духоўны сэнс».

Міхась Чарняўскі, гісторык: «Пойдзем усёй сям'ёй на мітынг, каб адзначыць гэты дзень узнаўленьня тысячагадовай дзяржаўнасьці. Гэта яшчэ і дзень успамінаў, вельмі балючы дзень. Але штодзённая праца ня менш важкая, чым самое сьвята. Трэба працаваць, каб яно зрабілася сьвятам для ўсіх, і тады, якою б ні была ўлада, яна будзе вымушаная зрабіць яго дзяржаўным».

Апытваў Анатоль Прасаловіч

БЕЛАРУСКАЯ НАРОДНАЯ РЭСПУБЛІКА:
ІСНАСЬЦЬ, СПАДЧЫНА, АКТУАЛЬНАСЬЦЬ

Дазволім сабе не запыняцца шмат на фактах, што тычацца БНР — канкрэтных зьвестак сабрана і апублікавана багата, а падумаем пра гістарычнае значэньне Акту 25 Сакавіка.

Першая чвэрць XX ст. у панятках ленінскай сацыялёгіі характарызуецца як час імпэрыялізму — найвышэйшай стадыі развою буйных капіталістычных дзяржаваў, якія ў барацьбе за рынкі збыту і рэсурсы непазьбежна сутыкаюцца ў жорсткай канфрантацыі. Тэзысна акрэсьлім галоўныя тэндэнцыі і зьявы дадзенага часу. Гістарычная эпоха Мадэрну характарызавалася навукова-тэхнічным прагрэсам, індустрыяльным пераваротам, урбанізацыяй, сацыяльнай дынамічнасьцю, пашырэньнем адукаванасці, выбуховай хваляй творчых асобаў, покрышам старых ідэалёгіяў (згадаем знакамітае «Бог памёр!» Ніцшэ) і ўздымам новых квазырэлігіяў (камунізм, расізм), геапалітычнымі, этнакультурнымі, сацыяльна-эканамічнымі, мэнтальнымі разломамі і сутыкненьнямі.

У такім, як бы далёкім ад тэмы БНР пачатку, ёсьць свая лёгіка. Бяз гэтага не раскрыць да канца пазначаны ў назьве артыкула пасыл. Існасьць БНР палягае ў слове «мадэрн». Асобна зацемім дзьве істотныя катэгорыі, якія неабходныя пры вызначэньні Мадэрну: гэта *імпэрыялізм* як тэндэнцыя захопніцка-ўпадабленчай экспансіі з мэтамі эксплюатацыі, дзяржаўнай і этнакультурнай уніфікацыі народаў і краінаў і *нацыяналізм* як тэндэнцыя культурнай і дзяржаўнай эмансыпацыі народаў, якія маюць волю да сьцьвярджэньня сябе, сваёй суб'ектнасьці. Такім чынам, БНР і вялікі Акт 25 Сакавіка 1918 г., абвешчаньне незалежнасьці і непадзельнасьці БНР у этнаграфічных межах беларускага народу, ёсьць галоўным палітычна-валявым дасягненьнем беларускага мадэрновага праекту, *здабыцьцё, спароджаньне гістарычнай субектнасьці Беларусі.* Відавочна, што БНР (як і БССР — геапалітычны адбітак БНР і антыпод па зьмесьце, але як бы беларуская дзяржава па форме) ня сталася паўнавартаснай рэалізацыяй гістарычнай суб'ектнасьці Беларусі — у выніку вядомых канкрэтна-гістарычных і геапалітычных абставінаў. Беларускі мадэрновы праект стаўся незавершаным, і надлом, несфармаванасьць – гэта словы, якія апісваюць цяпер беларускую сытуацыю. Для людзей дасьведчаных відавочна, што такі гістарычны лёс неўнікальны, але ў выпадку Беларусі ёсьць сур'ёзныя адметнасьці (да прыкладу, несфармаванасьць нацыянальнай буржуазіі, слабасьць нацыянальнай сьвядомасьці ў масах, рахманасьць, канфармізм).

Чым ёсьць сёньня спадчына БНР? Гэта ёсьць наш сапраўдны духоўна-гістарычны падмурак, гэта — паўстаньне Новай Беларусі, гэта — плённы зачын творчай сілы нашага этнасу. БССР перад БНР — толькі плён вымушанай калябарацыі, канфармізму дзеля фізычнага выжываньня. БССР — савецкая мутацыя БНР.

Актуальнасьць БНР зразумелая. Для Беларусі быцьцёвая неабходнасьць — завершыць свой Мадэрн, дафармаваць арганічную, жывую нацыю, усталяваць, укараніць сувэрэнную дзяржаўнасьць. У ідэйна-духоўным і сацыяльна-эканамічным аспэктах: перажыць савецкую спадчыну, пераадолець БССР як сымбаль прыгону і нігілізму.

БНР — гэта беларуская мара на годнае жыцьцё. Беларуская Народная Рэспубліка сёньня — гэта наша «новая зямля» XXI ст.

Аўген Касьцюшка, Гомель

Віктар Ганчар:
«Я АДЧУВАЮ АДКАЗНАСЬЦЬ ЗА КРАІНУ...»

Працяг са старонкі 1.

нальныя. Натуральна, што любы нармальны беларус стараецца навесьці парадак у сваім доме. А калі ўлічыць, што я вырас на Захадзе, дзе традыцыйная мэнтальнасьць беларуса выражаная найбольш яскрава, для мяне гэта рэчы арганічныя і зразумелыя. Калі ставіць пытаньне ў плоскасьці нейкіх саюзаў, дык, апроч усяго, гэта супярэчыць мэнтальнасьці беларуса, а Вы самі разумееце, што з пункту гледжаньня рэальных працэсаў — гэта ўсё павінна быць ацэнена і з псыхіятрычных парамэтраў.

«НН»: Некаторыя запланаваныя мной пытаньні ўсё ж былі неадназначнымі для мяне самой — напрыклад, пра беларускасьць Ганчара. Магчыма, гэты бок Вашай асобы малавядомы, тым ня менш, што для вас ёсьць сымбалем беларускасьці?

В.Г.: Сымбаль беларускасьці для мяне — гэта мая маці. Дастаткова яе ўбачыць, паслухаць. Мая маці — гэта ўвасабленьне ўсяго самага добрага, што ёсьць у кожным беларусе. Папершае, надзвычайная адкрытасьць, чысьціня і нават сьвятасьць. Даверлівасьць. Усё гэта адначасова спалучаецца з асаблівай манерай гаварыць, думаць, выказваць. Гэта для мяне сымбаль беларускасьці.

«НН»: А ці ёсьць у Вас любімая беларуская прымаўка?

В.Г.: Самая лепшая прымаўка, якую люблю паўтараць мой бацька: няма таго кепскага, што на добрае ня выйдзе.

«НН»: Чаму Вы вучыце свайго сына?

В.Г.: Рэч у тым, што я, нягледзячы на тое, што 5 гадоў выкладаў у ВНУ, ніколі не прэтэндаваў на высокае званьне пэдагога і стаўлюся да сваіх пэдагагічных здольнасьцяў скептычна. Галоўнае правіла, якога прытрымліваюся, і якое, мне здаецца, спрацоўвае, — служыць асабістым прыкладам для майго сына. І ў вялікім, і ў драбязе. Тое, што мой сын з двух гадоў для мяне зьяўляецца чалавекам, за якога я ніколі не чырванеў і не саромеўся, гэта, відаць, і ёсьць вынік майго пэдагагічнага рэцэпту. А калі гаварыць па-мужчынску, я вельмі задаволены, што цяпер, калі ў сына такі ж самы памер як у мяне, праўда, пасьля галадоўкі ўжо большы за мой, з маёй падачы сын можа прабіць любую сьцяну. Я маю на ўвазе чыста мужчынскія моманты. Гэта нягледзячы на тое, што яму 16 гадоў.

«НН»: На якіх прынцыпах вучыліся Вы?

В.Г.: Тое, што дадзенае ад Бога, тое, што ў характары — гэта не мае дасягненьні. У 10-й клясе, калі быў па ўсіх паказчыках выдатнікам, ішоў на «залаты мэдаль», напісаў сачыненьне на тэму «Герой нашага часу». Улічваючы, што тады быў канфлікт і палітычны скандал вакол Андрэя Сахарава, героем нашага часу стаў для мяне Сахараў. Паўгода тады мяне цягалі ў КГБ. Цяпер гэта гучыць анэкдатычна, сьмешна, але гэта так. І тут я б не хацеў пераводзіць усё ў сфэру патэтыкі. Хацеў апэраваць простымі паняцьцямі — я зь дзяцінства бараніў усё тое, што было зьвязана з маім разуменьнем годнасьці, бараніў гэта любымі спосабамі. Без перабольшаньня. Мяне нават ніколі ў жыцьці бацька не караў, бо ведаў, што гэта бяз сэнсу.

«НН»: Людзям, якія па-за вірам палітычных падзеяў, і людзям, якія ў іх, усё цяжэй псыхалягічна страваваць беларускую сытуацыю. Зьяжджаць? А навошта? Асоба найлепш можа рэалізавацца на радзіме... Як бы гэтую сытуацыю схарактарызвалі Вы?

В.Г.: Я, у першую чаргу, адчуваю адказнасьць за краіну. І гэта таксама ня фраза. На жаль, апошнім часам сапраўды кожны чалавек падзяляецца: з аднаго боку ён звычайны чалавек і ва ўмовах, калі ён элемэнтарна змагаецца за існаваньне, змушаны ўключаць нейкія абмежавальныя нават не бар'еры, а інстынкты. І ў сытуацыі, калі ўсё грамадзтва псыхалягічна і маральна задушана, а некаторыя проста ліквідаваныя, чакаць ад простых людзей высокіх праяваў самасьведамасьці — пры ўсёй павазе да майго народу — не выпадае. У сувязі з гэтым у мяне адзінае пачуцьцё — адказнасьці. Як інтэлігенту, як чалавеку, які, бязь лішняй сьціпласьці, адносіць сябе да эліты, — мне важна несьці адказнасьць за сваю краіну, каб для кожнага беларуса стварыць тую нармальную палітычную, сацыяльную, культурную й эканамічную атмасфэру, якая б была роднай і блізкай жаданьням і мэнтальнасьці. Тое, што робіцца з краінай цяпер, і гэта без усялякага перабольшаньня, — сапраўдная нацыянальная трагедыя.

«НН»: Сакавік багаты на сьвяты. Сёньня — Дзень Канстытуцыі, у імя якой і паводле якой мы ўсе жывем і дзейнічаем цяпер. 25-га — Дзень Волі. Да апошняга часу — элітарнае сьвята. Ці ёсьць 25-га сакавіка адметным днём для Вас, Віктар?

В.Г.: Маёй любімай дысцыплінай у школе была гісторыя. На жаль, да пэўнага часу я ня меў магчымасьці вывучаць гісторыю з рэальных першакрыніцаў, якія ствараюць аб'ектыўную карціну. Шмат якія рэчы я, натуральна, пераасэнсаваў. Для мяне 25-га сакавіка — гэта дзень, які, ня ў першую чаргу — я не магу так сказаць, бо шмат што зьвязана з выхаваньнем, традыцыяй, — але для мяне цяпер гэты дзень, які ў шэрагу іншых памятных, зьяўляецца сымбалем нашай дзяржаўнасьці, нашай нацыянальнай годнасьці.

«НН»: Што б Вы перадалі тым, хто змагаўся за Вас і тым, хто змагаецца супраць Вас?

В.Г.: Што да апошніх — гэта не ў маіх правілах, прынцыпах — асуджаць. Я ўдзячны перадусім жонцы і журналістам. Толькі яна і толькі яны забясьпечылі такі вынік супрацьстаяньня...

«НН»: Спадар Віктар, Вы думаеце, што гэта ўжо развязка?

В.Г.: Рэч у тым, што я чалавек вельмі прагматычны. Таму любы вынік я разглядаю як фундамэнт для новых дзеяньняў. Гэта ня толькі вынік. Гэта вялікая наша з Вамі і маральная, і палітычная перамога. У нас ёсьць грунт для ўратаваньня нашай краіны.

«НН»: Сваім прыкладам Вы адрадзілі надзею ў многіх людзей. А гэта вялікая адказнасьць, калі табе паверылі людзі. Ідзем да канца?

В.Г.: Безумоўна. Для мяне праблемы выбару тут не існуе. Якім бы чынам ні развіваліся падзеі, усё, што зьвязана з маёй чалавечай і службовай адказнасьцю за той працэс, да якога спрычыніліся лёс, народ, Вярхоўны Савет, я свой абавязак выканаю. Пры любых умовах і абставінах, сцэнарах, бо, на жаль, ня ўсё залежыць ад нас і нашых намаганьняў. Я ўпэўнены, што сёлета лёс Беларусі кардынальна зьменіцца: мы будзем з новым кіраўніцтвам і новым прэзыдэнтам.

Гутарыла Вольга Караткевіч

ЗНАКАМ ТЫМ

Працяг са старонкі 1.

валі сьцягі, малявалі выявы ППРБ, вялі маніторынгі парушэньняў правоў чалавека і законаў у РБ, спрабавалі вярнуць краіну ў канстытуцыйнае поле. Здавалася, апошні спадзеў быў пахаваны ў лістападзе 96-га. І вось, 1999-ты. На масавых акцыях я сустракаю людзей, якія з пару гадоў абмяркоўвалі брыдоту рэаліяў выключна на ўласных кухнях, у пярэрвах паміж творчай дзейнасьцяй, выкарыстоўваючы ўсё больш радыкальныя ацэнкі і эпітэты ў дачыненьні да патэнцыі беларускай апазыцыі. Цяпер усе мы-яны як адзін увязаліся ў Выбары-99. Сьвядома і рашуча. Недзе адчуваючы глыбінныя віры адбываных падзеяў, аднак разумеючы вызначальнасьць пэрыяду. Мы паверылі Віктару Ганчару, мы паверылі ў магчымасьці апазыцыі аб'яднацца, мы паверылі, што разам – пераможам. Мы ўпарта дэманструем, што паверылі.

25-га сьнежня 1998 году я перабывала ў Варшаве. Польскія мэдыі ў калядныя дні неахвотна гавораць пра палітыку. Усё сьвяточныя паведамленьні. Раптам на RTL7 навіна – беларусы й расейцы дамовіліся аб аб'яднаньні. Шокавы стан перапраўлялі тэлефанаваньні польскіх знаёмых журналістаў: ці варта сьпяшацца акрэдытавацца ў Беларусі, каб асьвятляць масавы супраціў? Дзівосы. Палякі думалі, што павінна была выйсьці палова Беларусі на вуліцы... Найцяжэй было тлумачыць, чаму толькі тысяча. Цяпер – тысячы бяруць удзел у арганізацыі выбараў прэзыдэнта Рэспублікі Беларусь у 1999 годзе. І гэта найлепшае тлумачэньне пазыцыі дэмакратычнай часткі насельніцтва: выпадковых людзей у гэтай кампаніі мала. І рызыка – сьвядомая. Страх цяперашніх уладаў рэалізоўваецца ў мэтадах брутальных рэпрэсіяў. Арыштоўваюць пачкамі. Найбольш моцных – чытай – небясьпечных - саджаюць. Самых нязломных – стараюцца зламаць. Мэханізм заведзены. Дзяржэпартамэнт Злучаных Штатаў Амэрыкі пратэстуе супраць арышту сябраў Цэнтравыбаркаму. Дзярждэпартамэнт патрабуе вызваліць Віктара Ганчара. Урадженец краіны, дзе выпускі навінаў пачынаюцца з культурніцкіх паведамленьняў, каб не нэрваваць народ, – нарвэжац, старшыня АБСЭ, ня моўчкі змаўчаць – фактычна артыкулюе ў звароце да «Праваахвярзіцельства Аляксандра Лукашэнкі» – «свабоду Ганчару»: далібог, група ў Менску з назіральна-кансультацыйным статусам ня мае права камэнтараваць адбываное ў Беларусі, аднак спраўна перадае кроніку падзеяў у «цэнтар». Не вытрымлівае адна з самых цывілізаваных партыяў Украіны – Народна-дэмакратычная. За подпісам старшыні А. Матвіенкі распаўсюджваецца зварот, у якім украінскім уладам нагадваецца, што на дакумэнтах подпісы Лукашэнкі легітымныя да 20 ліпеня 1999 году, а беларускім апазыцыянэрам прапануецца маральная падтрымка і рэальная - у якасьці назіральнікаў за ходам прэзыдэнцкіх выбараў 16-га траўня 1999 году. Чэхі, зрэалізаваўшы адну з задачаў-максымум – уступленьне ў НАТО, могуць цяпер нарэшце паглядзець углыбкі на Ўсход. У Празе адкрываецца прадстаўніцтва Хартыі-97, Каардынацыйная рада дэмакратычных сілаў Беларусі сустракаецца на высокім роўні ў Празе і атрымоўвае гарантыі падтрымкі дзеяньняў у рамках Канстытуцыі 1994 году. На жаль, гатовасьць міжнароднай грамадзкасці вэрбальна рэагаваць на дзікунскія праяўленьні ўладанеспатольнасьці беларускага рэжыму, не адбіваецца на лёсах людзей. Тых, хто павёў за сабой тысячы наважаных. Віктар Ганчар, які стаў прыкладам мужнай пасьлядоўнасьці ў мэтадах палітычнай барацьбы, зьнясілены галадоўкай, органамі выкінуты з машыны у адным пінжаку далёка ад месца пражываньня. Цяпер Ганчар пад пагрозай крымінальнага артыкулу за нібыта прысваеньне ўладных паўнамоцтваў. Міхаіл Чыгір, які стаў прыкладам цьвярозых і цывілізаваных мэтадаў палітычнага змаганьня, – пад пагрозай быць абвінавачаным у невяртаньні крэдытаў на вялікую суму грошай. Зянон Пазьняк, які стаў прыкладам упартасьці ў апэляцы да нацыянальнай сьведамасьці беларусаў і выкрыцьці чарговых праектаў расейскіх спэцслужбаў, – пад пагрозай неразуменьня бальшынёй самых радыкальных беларускіх дэмакратаў: многія зь іх зрабілі стаўку на выкрываньні Пазьняком Чыгіра. З розных прычынаў. Каб іх ведаць дакладна, трэба варыцца ў беларускім катле.

Улады малююць зборны вобраз ворага народу – нацыянальна сьведамы, мужны, дастойны, заможны. Толькі самымі моцнымі апазыцыянэрамі ППРБ апекуецца асабіста. І апазыцыянэрам ня сорамна прыходзіць увечары дадому. Яны – героі. Чаго ня скажаш пра каманду ППРБ, на якую, як клясны кіраўнік, ППРБ любіць пакрычаць, дазволіць мэтафару: «Вы, Пётр Петровіч, перад МВФ за 90 мільонов долларов по-пластунскі в грязі кувыркаетесь...» ці проста публічна выгнаць з паседжаньня, як старшыню Магілеўскага аблвыканкаму Кулічкова. Ды шчэ пратрансьляваць па родным БТ. Каб уся «рэспубліка» моцную руку адчувала. Як, цікава, чальцы «каманды» ППРБ могуць прыходзіць дадому, да сваіх жонак ці жанчынаў пасьля нарадаў, на якіх яны сядзяць нібы зь непадрыхтаваным хатнім заданьнем школяры? Што гэтыя джэнтэльмэны гавораць сваёй палове? Няўжо: «Ну, ты бачыла?»... Аказалася, што для ўсіх бакоў дагэтуль актуальныя камсамольскія прынцыпы Зоі Касмадзям'янскай: «Усіх не перавешаеце!»

Вольга Караткевіч

МОДА НА ЭКСТРЭМІЗМ

Працяг са старонкі 1.

Беларускі крайні нацыяналізм у сваіх ідэалах, сымбалях, рыторыцы й мэтадах падобны да свайго візаві – але ў магчымасьцях (бо яны змагаюцца на адным полі) і ў пэрспэктывах таксама. Юнацкі й нацыяналістычны экстрэмізм 90-х загіне, разыйдзецца пад сыціплым шармам буржуазнага дабрабыту, грамадзтва спажываньня, пагоні за грашыма. Пакінуўшы па сабе нешта ў грамадзкай сьвядомасьці... Хутчэй зьвярынае, чым культурнае, хутчэй варожасьць, чым салідарнасьць.

РНЕ – прыватны выпадак, малазначны ў параўнаньні з той падсподнай, фундамэнтальнай нянавісьцю да іншых (каўказцаў, пшэкаў, жыдоў, маскалёў, патлатых, підараў, буржуяў), расьцярушанай па беларускім грамадзтве, якая ёсьць адваротным бокам няўпэўненасьці ў сабе і нянавісьці да сябе і ўласных заганаў. Але РНЕ, раскручваны СМІ, як жупел, якім лёгка напалохаць, стаўся свайго роду сымбалем.

Севярынец спрабуе пераконваць нацыстаў, расплюшчваць ім вочы, рабіць зь іх прыхільнікаў беларускай ідэі. Славамір Адамовіч таксама піша, што «ў адрозьненьне ад лукашызму, расейскі фашызм мае досыць прывабны ідэалягічны рыштунак. Але яго можна і неабходна паставіць на службу беларускай нацыянальнай ідэі». Няясна толькі, чым яны саслужаць. Берасьцейскія скіны, якія аблілі фарбай помнік ахвярам гета, запісвалі ў сваіх дзёньніках «Беларусь па-над усё». Супраць каго яны змагаліся? Калі супраць «усебеларускіх жыдоў», якім казаў славу Купала, дык тых ужо няма. Нацызм і расейскі шавінізм сьцёр зь Беларусі дзясятую частку беларускага народу, самую дынамічную. Дзякуй Богу, ад жыдоў беларусам засталося ня толькі слова «цымус».

Ці маюць прадуктыўны патэнцыял ідэалёгіі нянавісьці і экстрэмізмы, ці гэта толькі ідэі-саркафагі, ідэі-рэакцыі адсталых слаёў на новую рэчаіснасьць? Аб'ектыўна, што беларушчына сёньня – там, дзе адукацыя і талеранцыя. Чым вышэйшы адукацыйны цэнз нейкай групы, тым больш выбарцаў дае яна беларускай патрыятычнай і праэўрапейскай правіцы.

Цяперашняя, быццам бы, беспакаранасьць РНЕ тлумачыцца відавочнай слабасьцю і крызысам БНФ-у, які ад 10 гадоў зусім не мяняецца. Прынамсі, 5 гадоў таму БНФ такога не дазваляў. Зь іншага боку, а што рабіць: выстаўляць патрулі на Варвашэні, на паверсе, дзе жывуць замежнікі? Бо сёньняшнія бравыя нацугі выбіраюць сабе цэлі, якіх няма – нэграў, жыдоў, панкаў. Гэта сьведчыць і пра іх слабасьць, і пра іх неаўтэнтычнасьць, і адсутнасьць мэты. Яны баяцца закранаць мацнейшых і проста капіююць сваіх нямецкіх і расейскіх сяброў, гуляюць у фашызм. У любым разе, змаганьне з фашыкамі не павінна ператварацца ў бойку Казіка і Юзіка на лузе.

Нацыстаў раздушыць дзяржава. Жорстка, за тыдзень. Пасьля траўня, скажам. Бо ідэалёгіі нянавісьці разьядаюць дзяржаву зьсярэдзіны, нацкоўваюць адных грамадзянаў на другіх і тояць пагрозу таго, што некаторыя грамадзяне перастануць лічыць дзяржаву сваёй.

Белмоўным аматарам Боба Фоса іншы раз здаецца, што мы жывем у такім сабе «Кабарэ «Беларусь», на якое вось-вось абрынецца бязьлітасная рэчаіснасьць, але гэта толькі страхі (і тактыка РНЕ – падтрыманьне гэтага страху: надрукаваў журналіст «Звязды» рашучы артыкул пра РНЕ пад псэўданімам, яны тут жа прыходзяць у рэдакцыю, выпытваюць, маўляў, «мы хацелі б пагаварыць, патлумачыць»). Аднак, як казаў мой дзед, «фашыстыя то былі фашыстыя , але прыбіральні ў іх былі чыстыя», а цяпер, дастаткова зайсьці ў прыбіральню ў «штабе» РНЕ...

Андрэй Дынько

У ЭЎРОПУ – НАПРАВА!

У савецкія часы Захад у нас уяўляўся гэткай «Грэцыяй, дзе ўсё ёсьць», а ў сфэры ідэалёгіі самым піскам былі тэхнакратычныя леваінтэлектуальныя сахараўскія ідэі. І дагэтуль нашай інтэлігенцыяй сьвет успрымаецца праз процiпастаўленьне камунізм—капіталізм, Захад—Усход.

Між тым, камуністычныя ідэі таксама прыйшлі з Захаду. І камунізм, і капіталізм грунтуюцца на ідэі бязьмежнага разьвіцьця прадукцыйных сілаў, заваёве сусьветнага рынку. А што будзе, калі скончацца рэсурсы, што, прадракаюць, будзе ўжо гадоў праз 30? Магчыма, у самым выйгрышным стане будуць тыя, хто якраз найдалейшыя ад лібэральна-рынкавага ладу?

У нас нават нацыяналісты — насамрэч не нацыяналісты, а арыентаваныя на Захад лібэралы. Але ж тая адзіная Эўропа бязь межаў, у якую яны хацелі б трапіць — толькі плавільны кацёл, у якім мусіць зьнікнуць усялякая адметнасьць. Дык якая розьніца, у якім цывілізацыйным катле расплавяцца беларусы — ва ўсходнім эўразійскім ці ў заходнім лібэральна-касмапалітычным? Наша інтэлігенцыя безумоўна арыентаваная на Захад — бо там вышэйшы ўзровень жыцьця (што паказвае яе кілбасную мэнтальнасьць).

Пры слабасьці нацыянальнай ідэалёгіі кідацца ў вір вольнага лібэралізму тым больш небясьпечна, што няясная нават далейшая эвалюцыя маральных асноваў цяперашняга заходняга грамадзтва. Можна чакаць, што гадоў праз 20 там будуць дазволеныя, напрыклад, шлюбы паміж чалавекам і жывёламі — з аднаго боку дарогу да гэтага пракладаюць абаронцы сэксменшасьцяў, з другога — абаронцы правоў жывёлаў.

Яшчэ адным аргумэнтам на карысьць лібэральнага рынкавага ладу зьяўляецца наступнае: хай сабе дрэнны гэты лад, але ж лепшага не прыдумалі.

Дык і праўда — ці ёсьць альтэрнатыва савецкаму інтэрнацыяналізму і лібэральнаму касмапа-

Працяг на старонцы 6.



Малюнак Віктара Аўтушкі

«НЕ АД ДОБРАГА ЖЫЦЬЦЯ...»

Выпускнік ПТВ-24 будаўнікоў, член менскага філіялу РНЕ, дваццацігадовы Васіль Сабалеўскі ўдзельнічаў у сутычцы з дэманстрантамі на Дзень Незалежнасьці. Калі маладзёны з РНЕ напалі на сяброў «Хартыі-97», стала вядома, што Вася Сабалеўскі пакінуў у роднай хабзе ўдзячнага вучня, Сяргея Зямцова, навучэнца другога курсу ПТВ-24, дырэктарам якой зьяўляецца дэпутат Менгарсавету Андрэй Саюк. «Вучань» разгарнуў у вучэльні настолькі актыўную дзейнасьць, што пэдагогам прыйшлося зьвярнуцца па дапамогу ў раённую інспэкцыю па справах непаўналетніх. У інспэкцыі з пэтэвэшнікам паразмаўлялі, папярэдзілі пра выключэньне з вучэльні.

Ад Ігара Ўсачова, начальніка ІСН Савецкага раёну, я даведаўся, што міліцыя ведае, дзе зьбіраюцца менскія «баркашоўцы», затрымлівае іх пры распаўсюджваньні прафашысцкай літаратуры. Начальнік ІСН лічыць, шо «РНЕ — гэта праблема, якую трэба ставіць, без пытаньняў», а ў арганізацыю расейскіх фашыкаў ідуць «пераважна хлапцы звычайныя, звычайная моладзь».

У «баркашоўца» Сяргея Зямцова, якому хутка споўніцца 18, ёсьць сям'я: маці Натальля, брат-сямікласьнік, матчыны бацькі ў вёсцы дзесьці пад Смалявічамі. Маці працуе ў мэтрапалітэне, дзьве ночы на рабоце, дзьве дома. Скончыла вучэльню чыгуначнікаў, муж пасьля заканчэньня тэхнікуму працаваў начальнікам цягніка, машыністам, дзяжурным у дэпо. Цяпер яго няма, намёр. Засталася кватэра-паўтарачка і пытаньне, як пракарміць двух сыноў.

Маці юнака просіць, каб далі яму давучыцца ў вучэльні. Пра РНЕ яна кажа, што «напэўна, штосьці там яму цікава, як і ўсім астатнім гэтым хлопчыкам», — і захапляецца: «Ведаеце, аднойчы я бачыла лістоўку з гэтым прыгажуном-мужчынам».

Маці лічыць, што мы не пражывём без Расеі, але вызначае сябе беларускай. Сяргей, дарэчы, таксама.

16 лютага спрабую зьвязацца з прэс-сакратаром МУС Натальляй Лапо і прэс-службай КГБ, каб здабыць зьвесткі пра дзейнасьць РНЕ. Колькі ні тэлефаную, усё просяць перазваніць праз гадзінку.

Вечар, сьнег, завіруха. На явачнай кватэры сустракаемся з шараговым РНЕшнікам, непаўналетнім Зямцовым. Ён згаджаецца на дыктафонны запіс, але й сам запісвае на аркушыку ў клетку (на зваротным баку якога — цытата з Дэклярацыі правоў чалавека) маё прозьвішча й тэлефон. Нас двое, пачынаецца размова, але ў першых жа нясьмела-змушаных фразах я адчуваю прысутнасьць нябачнага трэцяга. І гэта ён, нябачны трэці, адказвае на мае пытаньні і робіць добрую міну пры дрэннай гульні.

— Я нічога й не хаваю, — гаворыць Сяргей, — мне няма чаго хаваць, толькі вось гэтая штука [дыктафон] мяне бянтэжыць. У інспэкцыі па непаўналетніх са мною гаварыў нейкі Волкаў, паказваў мне кодэкс, артыкул 70 [намыляецца, 71-ы], распальваньне нацыянальнай варожасьці. Навошта ён паказваў мне кодэкс, я абсалютна не зразумеў. Папярэдзіў, што калі яшчэ яму паступіць інфармацыя, то да мяне прыменяць артыкул. Абсалютна ня бачу ніякага распальваньня нацыянальнай варожасьці.

Пытаюся, ці дапытвалі яго супрацоўнікі КГБ.

— Так, прыяжджаў нейкі дзядзька, калі мы ўтрох сядзелі ў Савецкім РАУСе, калі нас затрымалі за распаўсюджваньне нашай літаратуры, спытаў, ці стаю на ўліку ў РНЕ, а таксама, калі нарадзіўся.

Далей Сярожа тлумачыць, што асабіста ў яго літаратуру не забіралі, калі трэба, ён і сам аддасьць. Ды й навошта забіраць, калі ні арганізацыя, ні сымболіка, ні газэта «Русский порядок» не забароненыя. Мяркуе, што ўсё з-за дырэктара вучэльні, дэпутата: перажывае за сваю кар'еру і прыпісвае Зямцову расклейваньне лістовак РНЕ, і пагражае за гэта адлічэньнем. Але дасьведчаны малалетка зазначае, што:

— Паводле закону [sic!] мяне могуць выгнаць толькі за дрэнныя паводзіны альбо нізкую пасьпяховасьць, а з гэтым у мяне ўсё нармальна. А што дырэктар называе фашыстам, дык няхай дакажа. І ніякі я не фашыст, наша арганізацыя не забароненая. Калі спатрэбіцца, напішам скаргу у міністэрства.

Сяргей цытуе Дэклярацыю правоў чалавека, артыкул 19, пра свабоду перакананьняў.

— А міліцыя бывае розная, усе мы жывыя людзі, ва ўсіх бываюць праблемы, усе мы хварэем. Хтосьці ляяльна ставіцца, хтосьці супраць, хтосьці, можа, і «за», але мне такія не трапляліся.



Пытаюся, чаму ўлада так ня любіць нашыя нацыянальна-патрыятычныя арганізацыі, за якія злачынствы сядзелі Шыдлоўскі, Лабковіч, Севярынец, Скочка ды іншыя. Адказ:

— Ня ведаю нічога пра іх, канкрэтна не кантактаваў ні з кім, у іх няма галоўнага: хоць нейкай дысцыпліны, сабранасьці, ну, выйдуць, пагарланяць-пагарланяць, сьцягамі памахаюць, а толку? Так, яны даўно існуюць, але гэта ня робіць ім станоўчай рэклямы, усё, чаго яны дасягнулі за апошні час, гэта атрымалі пару разоў палкамі па галаве, наколькі я ведаю.

На пытаньне, ці праводзяцца ў менскай групе РНЕ палітінфармацыі, сьцьвярджае, што раз у месяц праходзяць заняткі, на якіх абмяркоўваецца бягучая палітычная сытуацыя, аналізуецца прэса.

Што ж да нацыянальнасьці, то Сярожа – беларус (але адразу ж дадае вядомую ідэалягічна-расавую падводку пра «трыадзіны рускі народ»).

Пра якія яшчэ беларускія нацыянальныя арганізацыі чуў?

— Ёсьць нейкі «Белы легіён», у іх сымболіка — якіясь кручкі. Бачыў на слупах іхныя лістоўкі, нейкае «безобразие» і «няма адрасу». Сёньня бачыў лістоўку з выявай ільва на шчыце, гэта, здаецца, «Партыя свабоды».

Сярожа запэўнівае, што яны ніколі першыя ня лезуць у бойку. Ён увогуле да ўсіх партыяў ставіцца ляяльна: у іх свае перакананьні, у яго — свае.

— Мардабой, — кажа Сяргей, — апошняя справа. Гэта да дабра не давядзе, адзін аднаго перабіць можам, гэта ўжо грамадзянская вайна. Нас і так, беларусаў, мала засталося...

Хлопец ня супраць беларускай мовы, гатовы ісьці служыць у беларускае войска, ён паліць цыгарэты гарадзенскай тытунёвай фабрыкі і... «каб жыў лепш, то, можа, і не ўступаў бы ні ў якія арганізацыі».

Славамір Адамовіч

У ЭЎРОПУ — НАПРАВА!

Працяг са старонкі 5.

лiтызму? Як заўсёды, альтэрнатывай хаосу ёсьць парадак, гэтак жа i для лiбэралiзму альтэрнатыва — кансэрватызм. Што мы можам убачыць у гэтым кшталце ў сябе ў Эўропе?

Эўрапейскiя «новыя правыя» ў савецкiя часы, ды й цяпер звычайна падаюцца савецкай i заходняй прапагандай як нэафашысты, хаця наступнiкамi Мусалiнi i Гiтлера яны не зьяўляюцца. Iхная iдэалёгiя даволi простая i натуральная — «суцэльны сьвет, складзены з разнастайных народаў» (Eine geterogener Welt gomogener Völker). Эўропа тутэйшых нацыяў. Неад'емная частка гэтай iдэалёгii — расiзм. Другiмi словамi, нэгр можа быць маiм лепшым сябрам, калi ён жыве ў сябе ў Афрыцы, а я — ў сябе тут, мы можам езьдзiць адзiн да аднога ў госьцi, i цiкавыя адзiн аднаму якраз сваёй непадобнасьцю. Мы мусiм культываваць i берагчы сваю адрознасьць — кожны ў сябе дома, што дазволiць пазьбегнуць непатрэбных узаемаўплываў, якiя i выклiкаюць звычайна канфлiкты памiж людзьмi. А iначай — ня будзе нi чорных, нi белых, а будуць адны толькi шэрыя...

Наступствы экспансiяў мы можам бачыць на прыкладзе былых каляніяльных iмпэрыяў — напрыклад, сёньня ў некаторых мясцовасьцях на поўднi Францыi большасьць насельнiцтва складаюць арабы, выхадцы з былых калёнiяў у Паўночнай Афрыцы.

Урэшце, любы вясковы дзядзька — кансэрватар, расiст i нацыяналiст, бо ён хоча спакойнага жыцьця, а не рэформаў, i ён — заўсёды за «нашых». Толькi трэба яму ў час растлумачыць, хто — нашы. Калi ты ня ўмееш растлумачыць, дык гэта зробiць хто iншы, напрыклад, чарговы Лукашэнка.

Колер скуры i раса — толькi адно адрозьненьне памiж людзьмi. Часам важнейшым бывае адрозьненьне ў мэнталiтэце. З маiх назiраньняў, у Беларусi большасьць кiраўнiкоў i працаўнiкоў сярэдняга зьвяна бiзнэс-структураў — расейцы, даволi часта — дзецi расейскiх вайскоўцаў. Лягiчна зрабiць выснову, што яны хутчэй рэагуюць на зьмены i прыстасоўваюцца да абставiнаў.

Але тут нашым нацыянал-мазахiстам трэба ня плакаць пра ўяўную недалужнасьць беларусаў, а абараняць iх саматоеснасьць. Вось у Латвii падобныя праблемы — увесь бiзнэс абселi «русскоязычные», але ж латышы не скуголяць ад таго, што чужакi больш разваротлiвыя, а абараняюць сябе на дзяржаўным узроўнi. Што датычыць нашай цяперашняй дзяржавы, дык яна зацiкаўленая, гледзячы па ўсiм, у адваротным. У Беларусi за постсавецкi пэрыяд асела каля мiльёну нелегальных мiгрантаў з Усходу, яны тут жывуць, займаюцца камэрцыяй, трымаюць пад кантролем ценявы бiзнэс, адным словам, што хочуць, тое й робяць. Прыгадваецца, як недзе ў 90-м годзе менскiя хлопцы з калкамi разагналi каўказцаў на Камароўцы. Калi б iм хто сказаў, што яны нацыяналiсты, дык яны б толькi насьмяялiся. Цяпер, канечне, з аднымi калкамi рады не дасi, ды й схоплена, вiдаць, усё на больш высокiм узроўнi... Дык вось, патрэбная сапраўдная нацыянальная дзяржава, якая б законным чынам баранiла сваiх грамадзянаў — такiх, якiмi яны ёсьць. Але хто ж яе нам створыць, як ня мы самi? Для гэтага трэба кiнуць паўтараць з чужога голасу спрошчаныя iдэi пра дэмакратыю, рынак i лiбэралiзм.

У Расеi iдэi эўрапейскiх «новых правых» iнтэрпрэтуюць па-свойму «эўразiйцы» i савецкiя нацыяналiсты, альбо нацыянал-бальшавiкi. Канечне, тут не абышлося без тыповай для Расеi хiмэрнасьцi.

Нацыянал-бальшавiкi лiчаць, што расейскай нацыянальнай iдэi цалкам адпавядаў бы СССР, толькi пазбаўлены марксiзму-ленiнiзму. «Эўразiйцы», зыходзячы з роднасьцi паходжаньня цюркаў i славянаў, бачаць у антызаходняй Расейскай iмпэрыi (Савецкай Эўразii) жаданую цывiлiзацыю будучынi. Як i эўрапейскiя «новыя правыя», расейцы найперш працуюць на iдэалягiчным фронце, а на нiжэйшым, практычным узроўнi дзейнiчаюць iншыя групоўкi, кшталту РНЕ. Усё ж расейцы маглi б зьяўляцца для эўрапейскiх «новых правых» стратэгiчным саюзьнiкам, як своеасаблiвая затычка для Азii. Што датычыць Беларусi, дык тут выяўляецца закон «прырода ня церпiць пустэчы»: дзе няма Беларускага Нацыянальнага Адзiнства, дык там месца займае РНЕ. Вiдавочна, што нi эпатажны Правы Рэванш, нi дахадзяжная Партыя Свабоды гэтую праблему ня вырашаць, таксама ж не запоўнiць гэтую пустку шоў беларушчыны ў стылi Маладога Фронту. Трэба ўлiчыць, што любыя сапраўды раўнапраўныя кантакты з маскоўскiмi «эўразiйцамi» маглi б быць толькi пасьля таго, як будуць паадбiваныя галовы iхным прыхiльнiкам у Беларусi. Гэта можа не падабацца хiба толькi нашым «русскоязычным», для якiх «русскоязычное» РНЕ было б блiжэй, чым нешта такое тутэйшага паходжаньня. Як паказчык: iнтэрвiю з прыхiльнiкам менскага РНЕ ў «Белорусской деловой газете» выглядае няйначай рэкляма.

Але ж думаецца, што адбiваць галовы надта многiм не давядзецца, бо не выглядае, каб гэтая арганiзацыя магла б пусьцiць глыбокiя каранi ў Беларусi. Характэрна, што ўзначальваў менскую арганiзацыю чалавек з татарскiм прозьвiшчам Валiулiн. Калi ў Расеi РНЕ спрабуе выкарыстаць элемэнты расейскай нацыянальнай культуры, дык iх мясцовыя прыхiльнiкi ведаюць яе хiба што з кнiжак, а беларускай традыцыяй яны, канечне, не цiкавяцца.

Магчыма, неўзабаве чарговыя адраджэнцы будуць плакаць, што беларусаў зноў абакралi. У Расеi геамэтрычны арнамэнт са свастычнымi элемэнтамi сустракаецца хiба ў заходнiх рэгiёнах, прылеглых да Беларусi, трохi на Поўначы i ў Сiбiры, куды ў пачатку гэтага стагодзьдзя беларусы перасялялiся цэлымi вёскамi. (У 1924—27 гг. у Сiбiры быў 71 беларускi нацыянальны сельсавет.) А ў беларускiм традыцыйным арнамэнце свастыка розных выглядаў была звычайным узорам. «Свастыка» на санскрыце азначае «дабрабыт», альбо, даслоўна, «добра-ёсьць», цi, калi хочаце, «усё ёсьцека». Вядома, што наяўнасць свастыкi ў традыцыйным арнамэнце зьяўляецца своеасаблiвым iндыкатарам iндаэўрапейскiх народаў (хаця свастыка дагэтуль ёсьць i сярод дзяржаўных сымбаляў Фiнляндыi, прынятых у 1919 г. калi нi пра якiх фашыстаў нiхто яшчэ й ня чуў). А той скалечаны гiбрыд, якi выкарыстоўваецца як эмблема РНЕ, добра адлюстроўвае рэальны стан справаў у Расеi, калi нават Баркашоў выглядае эўрапеоiдам хiба што на фоне астатнiх расейцаў.

Тут таксама мы мусiм па-iншаму глянуць на гiсторыю Беларусi. Наша гiсторыя пачалася ня 10 стагодзьдзяў таму, са згвалтаваньня Рагнеды Ўладзiмерам (нiчога сабе пачатак!). Мы зьяўляемся нашчадкамi ўсяго гiстарычна-культурнага працэсу на гэтай зямлi. Вядома, што славянскiя ўплывы на поўнач ад Прыпяцi зафiксаваныя не раней за сярэдзiну I тысячагодзьдзя н.э., прычым яны збольшага мелi моўна-культурны характар. А вынiкi антрапагенэтычных дасьледаваньняў вясковага насельнiцтва Беларусi паказваюць, што на працягу апошнiх 2500—3000 гадоў насельнiцтва бiялягiчна не зьмянялася, а розныя чужыя ўплывы вырашальных зьменаў не зрабiлi. Гэта значыць, што сёньняшнiя беларусы ў асноўным — нашчадкi даславянскага балцкага насельнiцтва. (Цяперашнiя працэсы русiфiкацыi i палянiзацыi можна разглядаць як працяг той даўняй славянiзацыi).

Часам эўрапейскiя культурныя традыцыi адназначна выводзяць з хрысьцiянства. Але вось Этыёпiя хрысьцiлася цi не раней за Эўропу, але ад гэтага эўрапейскай ня стала. Розныя канфэсii ў Беларусi, бясспрэчна, мусяць быць беларускiмi, але ж даволi наiўнымi у наш час выглядаюць спробы пакласьцi ў падмурак нацыянальнай iдэi хоць якую плынь хрысьцiянства. Падмурак гэты быў бы ненадзейным з-за супярэчнасьцяў з тэалягiчным хрысьцiянскiм унiвэрсалiзмам, якi носiць касмапалiтычны характар. Вiдавочна, што хрысьцiянства адлюстроўвае ў гэтым сэнсе сьветагляд вандроўных народаў, сярод якiх яно ўзьнiкла, а пасьля набрала моц, быўшы ўспрынятым рымскiм плебсам (першыя гадоў 100 хрысьцiяне малiлiся разам зь iншымi юдэямi). Нездарма сярод «новых правых» у Эўропе назiраецца зварот да паганства, якое адпавядае сьветагляду аселых народаў, бо вызнае прывязанасьць да свайго месца, забясьпечвае непарыўную сувязь з роднай зямлёй, калi эмiграцыя магчымая хiба што ў выпадку непасрэднай пагрозы жыцьцю. Паганства не патрабуе наварочваць чужакоў у сваю веру цi навязваць свае парадкi.

Мы павiнны добра разумець, што змаганьне за новую Эўропу нiколi ня скончыцца, i не павiнны наракаць, што нам нехта не падрыхтаваў добрага жыцьця. Трэба толькi ведаць, што Эўропа — тут, i з-за мяжы яе ў кiшэнi не прывязеш. Трэба навесьцi парадак вакол сябе.

Вiнцэсь Лiпскi

ПРЭЦЭДЭНТЫ

23 сьнежня 1991 г. У менскiм Палацы спорту павiнна была адбыцца сустрэча з Жырыноўскiм. Тады ён балятаваўся на прэзыдэнта Расеi, заехаў i ў Беларусь. Напярэдаднi па БТ прайшла перадача зь ягоным удзелам, пасьля чаго дазвол на сустрэчу быў адменены, i Жырыноўскаму давялося сустракацца з прыхiльнiкамi на вулiцы. Абураныя ягонымi выказваньнямi людзi (як пiсалi ў газэтах, «деклассированные хулиганствующие элементы») трохi пабiлi Жырыноўскага i адабралi шапку. У наступныя прыезды ў Менск яго суправаджала ахова, а публiчных выступаў ужо не было.

25 сьнежня 1994 г. у Палацы культуры тонкасуконнага аб'яднаньня на вул. Матусевiча была абвешчана сустрэча зь лiдэрамi расейскiх нацыянал-бальшавiкоў Э.Лiмонавым i А.Дугiным. Пасьля сустрэчы меў адбыцца канцэрт групы «Красные звёзды». Якраз у гэты час каля Опэрнага тэатру скончыўся мiтынг БНФ, i адтуль пад'ехала каля 200 чалавек, каб перашкодзiць гэтаму мерапрыемству. Дарогу ў залю перагарадзiлi зь дзясятак прыхiльнiкаў менскага аддзяленьня РНЕ. Пасьля жорсткай бойкi з прымяненьнем усiх падручных сродкаў частка баркашоўцаў уцякла праз чорны ход, частку адбаранiла мiлiцыя. Дугiн i Лiмонаў уцяклi праз вакно грымёркi. Кiраўнiк групы «Красные звёзды» тады заявiў, што цяпер група будзе называцца «Пагром». Праўда, назву i дагэтуль не зьмянiлi. РНЕ ў Менску нейкi час пасьля таго не было чуваць.

Вiнцэсь Лiпскi

ФАШЫЗМ ЯК НЕПАЗЬБЕЖНАСЬЦЬ

Калi я разважаю пра фашызм, дык лаўлю сябе на тым, што ня маю добрага ўяўленьня, што такое фашызм. Нацыянал-сацыялiзм Гiтлера, анархiчны фашызм Марынэцi, каталiцкi — Франка, творчы — Яновiча, праваслаўны — Баркашова, арабскi – якога Кадафi, ваенны — грэцкiх «чорных палкоўнiкаў» iстотна розьняцца ў праявах i ў першаiдэях.

Фашызм як крызыс хрысьцiянства i вяртаньне да дахрысьцiянскiх традыцыяў i каштоўнасьцяў? Фашызм як нэапаганства, для якога хрысьцiянства — толькi эпiзод? Фашызм як культ дысцыплiны, здаровага цела, моцнага лiдэра i групавой iдэi, як пагарда слабасьцю i разбэшчанасьцю? Часам мяне пранiзвае думка: калi б не паталягiчная нянавiсьць германскага нацызму да жыдоў, калi б не гета, калi б не галакост, цi быў бы Нюрнбэрг? Цi была б такой магутнай антыгiтлераўская каалiцыя i цi iснавала б яна ўвогуле? А калi б Гiтлер адмовiўся ад паходу на Маскву i пайшоў на заключэньне мiру да Сталiнграду? Цi бывае фашызм без антысэмiтызму i няўмераных тэрытарыяльных заваёваў?

Фашызм у Беларусi разьвiваецца па гiшпанскiм варыянце, без тэрытарыяльных прэтэнзiяў i юдафобii? Фашызм у Беларусi мог бы трыюмфаваць ужо сёньня, каб не такiя гнiлыя каштоўнасьцi знаходзiлiся ў iдэйным падмурку цяперашняй улады. Улада ня здольная зрабiць сьвятынi зь «вяночка» i чужога для беларусаў «славянства». Прычыны ж таго, што ў РНЕ ў Беларусi знаходзяцца прыхiльнiкi — зусiм не ў папулярнасьцi iдэi, а ў папулярнасьцi мэтадаў. Калi «баркашоўцы» таўкуць антыфашыста i мiнака-афiцэра, якi за таго заступiўся, а сябры антыфашыста замест абароны свайго, проста зьбягаюць (хай па дапамогу – удваёх!), а пасьля гэтыя сябры iдуць на чале антыфашысцкай дэманстрацыi – цi могуць такiх «антыфашыкаў» (а празь iх i iдэю) паважаць нармальныя маладыя хлопцы, якiя шукаюць надзейнай кампанii? Моц i абарона (у адных — фiзычная, у другiх — эканамiчная) ў выглядзе РНЕ, БПСМ — перамагаюць iдэйную i маральную моц «адраджэньня».

Годнай альтэрнатывай небеларускага фашызму можа стаць у пэрспэктыве фашызм беларускi. Зьвязаны зь беларускiм крымiналам. Калi дзяржава «апякуецца» тым бокам, цалкам лягiчна, калi на гэтым баку яднаюцца i знаходзяць агульныя iнтарэсы тыя, з кiм яна змагаецца.

На жаль, не атрымалася ў мяне антыфашысцкага артыкулу. Не магу выступаць супраць усяго, што поўнiць гэтае паняцьце. А поўняць яго i такiя рэчы, як узаемадапамога i адказнасьць. Тое, чаго бракуе многiм «анты...». У сучасным сьвеце iдэя фашызму неператожная. На жаль.

Андрыян Мелешк

«РУССКИЙ ПРОРЫК»,

або каго ў Менску толькі няма

Маларослы маладзён зь яўным напалеонаўскім комплексам выходзіць на сцэну і сьпявае пра «славный 37-ой», «жидов», «красное колесо» і «русский прорыв», а некалькі тысячаў юнакоў з паголенымі галовамі ў а-ля вайсковым адзеньні або зь бела-сінімі шалікамі дынамаўскіх фанатаў зачынаюць свой зьдзічэлы пога і пярэдняя дзясяткі ўскідваюць у фашыстоўскім прывітаньні рукі. Гэта канцэрт «Красных Звёзд» (або скарочана, «КЗ»). «Russland über alles!» – равуць яны...

«КЗ» – менская група, але карані яе сьлед шукаць ня ў Менску, а ў далёкім сыбірскім Омску, дзе ад сярэдзіны 80-х існуе «Гражданская Оборона» і Ягорушка Летаў па мянушцы «Дохлы». Ён і ягоны «Гр.Об.» стварылі саўковую панк-культуру, і менавіта іхная манера выкананьня паўплывалі на музыку драбнейшых гуртоў на постсавецкай прасторы. Дзесь пры канцы 80-х песьні «Гр.Обов» лабалі ў кожным двары, але тады яны былі скіраваныя супраць саўка, сыстэмы, камунізму (узгадайма самае вядомае - «Всё идёт по плану»). Калі разваліўся СССР, Ягору было не да палітыкі, бо яго, як кажуць, больш непакоілі «грыбкі» [галюцынагены]. Але ў 93-м ён ізноў прарываецца да мікрафону і абвяшчае сябе «советским националистом».

У тым самым 93-м два пацаны з Купцаўшчыны, Уладзімір Селіванаў і Жэня Бялоў, стварылі праект «Нарцисс» (па мянушцы першага), які пазьней быў перайменаваны ў «Красные Звёзды». Праўда, Селіванавым Уладзімір стаўся толькі ў 1994, а да гэтага ён быў Аўраменкам. Ходзяць легенды, быццам прычынай зьмены прозьвішча была гісторыя палкага каханьня, а тое, што ў тым самым 94-м павесіўся адзін з музыкаў «Гражданской Обороны», ізноў-ткі Селіванаў, - простае супадзеньне. Аднак дадаюць: не малую ролю адыграла і тое, што «Селиванов не любит ни хохлов (-ЕНКО), ни жидов (Аврам-)». Як той казаў: імя - нішто, імідж - усё. (Дарэчы, рытм-гітарыст «КЗ» Дзяніс Савік - грамадзянін Ізраілю, які жыве паміж Менскам і Сьвятой Зямлёй, адкуль імпартуе розныя «цялегі», кшталту таго, што, «зубр» на іўрыце значыць «х...й». Нацыянальнасьць Дзяніса, аднак, не замінае яму быць падпявалам галоўнага антысэміцкага хору РБ).

Апроч самога Селіванава, палітыкай у групе асабліва ніхто не цікавіцца, хутчэй нават сьцябуцца зь яе. Яны проста п'юць гарэлку ды граюць музыку, пагарджаючы, аднак, усім беларускім, г. зн., «местечковым». Уласны комплекс «местечковости», а таксама адсутнасьць належнай цікавасьці да іх творчасьці гоніць іх, як «Ляпісаў», у Маскву, дзе іх ведаюць лепш, чым у нас, і дзе іх касэты разыходзяцца накладамі да 10 тысячаў.

Летась яны сышліся зь вядомай савецкай паэткай Аляксандрай Пахмутавай ды еяным мужам Дабранрававым, якія былі ў захапленьні ад «талантливых ребят из Белоруссии». Пахмутава перадала ім правы на выкарыстаньне сваіх песень (плёткараць, нібы кампазытарка, у свае семдзесят з гакам, часта наведвае розныя савэтафільскія сэйшны, як некалі вэтэраны — піянэрскія зборы).

Падтрымліваюцца цесныя кантакты і з Дохлым. Той два гады таму прыяжджаў па «КЗ»-шным запрашэньні ў Менск, быў сустрэты хлебам-сольлю ды чырвона-зяленым сьцяжкам, адмовіўся сьпяваць у «РИФ-клубе» з-за таго, што там праводзіўся «Рок супраць фашызму», лаяўся матам, піў гарэлку, а потым валяўся п'яны на неабсяжных берагох Камсы. Сёньняшні Летаў зарабляе грошы: ён ужо дакладна ведае, што казаць у інтэрвію і што сьпяваць на канцэртах. Увесну ён ізноў прыедзе ў Менск, а потым адразу пашыбуе ў турнэ па ЗША, «ад Вашынгтону да Арэгону», дзе, паводле неўдакладненых зьвестак, мае грэбці па 4000 баксаў за выступ.

А дзе ж бяруць грошы «Зоркі»? Канцэрты ў Менску - рэч малапрыбытковая, дый за канцэрт «КЗ» могуць атрымаць больш штрафаў, чымся грошай. Тут варта згадаць пра адну немузычную постаць - выканаўчага дырэктара «КЗ» Міхаіла Рэзьніка, якога самыя члены групы клічуць за сьпінай «шклоўскім калхозьнікам» (хоць ён і з Чавусаў!), і які сапраўды ніяк ня можа пазбыцца беларускага акцэнту, што так не пасуе іміджу гурта. Раней Рэзьнік быў звычайным «спэкулём», матаўся ў Маскву, і яго часта можна было пабачыць на «Дынаме», дзе ён пад сьцягам Чэ Гевары гандляваў псэўдаандэграўдавымі прыбамбасамі. Цяпер ён ачольвае «студию революционного творчества «ГУЛАГ-Records» ды «контору «Боты, Резник и Сыновья». Асноўны прыбытак, аднак, дае продаж касэтаў (не «КЗ»-шных), якія Рэзьнік буйнымі партыямі цягае з Расеі і прадае на «Трубе» (пераход на станцыі «Кастрычніцкая»). Тамсама можна сустрэць і іншых музыкаў групы ў атачэньні сьвінгедаў, маралетніх панікоўскіх панкоў ды РНЕ-шнікаў.

Менавіта апошнія пастаўляюць найбольшую колькасьць фэнаў «Красным Звёздам». Увогуле ж, за час сваёй дзейнасьці Селіванаў & Co былі заўважаныя ў сувязях з «Национальным Движением Белоруссии», сьпявалі на гайдукевіцкім юбілеі ЛДПБ, знаёміліся з Замяталіным у СС «Белая Русь» і выбівалі грошы ў «Прямого Действия» на колішні візыт «Гр.Обов». У «ПД» Селіванаў стаўся вялікім актывістам і пайшоў бы вышэй, каб у «патронаў» не адбыўся раскол — «КЗ» ж паставілі на Саевіча, а не на Севу Янчэўскага. Нягледзячы ні на што, беларускага прэзыдэнта Нарцыс працягвае любіць усёй душою, называе мэсіяй і бачыць яго, як і Летаў, на чале Савецкай імпэрыі. Селіванаў нясьцерпна чакае вяртаньня сьветлага мінулага, кажучы, што камунізм, — гэта, у першую чаргу, «творчая свобода», што сам ён грае «рускі рэвалюцыйны рок», і што «музыцы, у якой няма ідэалёгіі, забясьпечанае забыцьцё». Нават «Вечерний звон» і «Шумел камыш» «нясуць найглыбейшую ідэю - славянскую, рускую, у якой нашыя карані, зараджэньне ўсяго». (А якую ідэалёгію тады нясе ў масы «Цячэ вада ў ярок» або «Касіў Ясь канюшыну»?)

«Бярэ» Нарцыс голасам і тэкстамі. Голас у яго і сапраўды глыбокі ды ў нечым ідэалягічны. А тэксты... Проста прывяду назовы некаторых песень з 30 (!) іхных альбомаў: «Шагает Гулаг», «Империя», «Русский Порядок» і г. д. І словы з гэных песьняў ня выкінеш: «Светит свастика золотая», «Моя борьба, Mein Kampf», «Русский Порядок набирает силу», «Вперёд шагает смело Русский Прорыв!»... Часам здаецца, што Селіванаў - найвялікшы антыфашыст сучаснасьці і сьпявае ён усё гэта, каб распавесьці пра жахі сыстэмы, спыніць наступ чырвона-карычневае чумы. На жаль, насамрэч усё трохі інакш...

Музыкі з «Красных Звёзд» цьвердзяць, нібыта ў іхнай творчасьці назіраецца адыход ад палітыкі, ад «русскопорядочности», што акрамя Пахмутавай, яны наладжваюць дачыненьні з маладой маскоўскай паэткай Вітухноўскай (якую праваабаронцы нядаўна дружна выцягвалі з турмы, куды яе пасадзілі за ўжываньне наркотыкаў). Мауляў, пераходзяць да лірыкі... Але я ў гэта ня веру: Аўраменку на лірыцы, хоць і грамадзянскай, доўга ня вытрываць, бо ў свой час ён нават выключна сэнтымэнтальную кампазыцыю «П.Л.Д.» яшчэ аднаго менскага «савецкага нацыяналіста» Арахоўскага зь «Северного Сияния» (экс-«Нюрнбэрг» – крамоўная назва, шкада, што памянялі; таксама менская андэграўндавая група, толькі менш раскручаная, менш радыкальная і не так пранацысцкая, як прасавецкая) умудрыўся аздобіць словамі «Наши автоматы разъяснят, кто за кем!» Лірыка...

Навасьпечаны дзядуля беларускага народу абяцаў павыдзіраць расейскім фашыкам ногі, але ўбачыць хоць аднаго РНЕ-шніка-інваліда (галава ня ў лік) у Менску пакуль не пашэнціла. ПТВэшнікі з дынамаўскімі шалікамі ўсё гэтак жа ашалела скачуць на канцэртах «Красных Звёзд (белорусской эстрады)» з правай рукой наўскід і, прарэзьліва вішчаць сваю ўлюбёную «речёвку»: «Sagen zusammen noch einmal: Sieg Heil! Sieg Heil!» Менск, 1999-ы на дворы і «Зік гайль!...» Такое ўражаньне, што Менск кратны Мюнхену, як '99-ты год – '33-му.

Васіль Чурыла

Міраслаў Чантарыцкі

БІБЛІЯТЭКА N

Артэга-І-Гасэт Хасэ. Эстэтыка. Філязофія культуры.

Дзеючы сама па сабе, маса зьвяртаецца да адзінага спосабу, паколькі іншых ня ведае, — да расправы. (...) Няма чаго дзівіцца, што сёньня, калі масы сьвяткуюць, сьвяткуе і гвалт, які робіцца адзіным аргумэнтам і адзінай дактрынай.

Батай Жорж. Літаратура і Зло.

Паэзія можа на словах папіхаць усталяваны парадак, але яна ня можа заняць ягонае месца. Калі жах бясьсільнай свабоды ўцягвае паэта ў палітыку, ён пакідае паэзію. Але з гэтага моманту ён бярэ на сябе адказнасьць за будучы парадак, ён прэтэндуе на ***кіраваньне*** дзейнасьцю, на ***статус бацькоўства***...

Вагнэр Рыхард. Выбраныя працы.

Толькі ***моцныя*** людзі ведаюць ***каханьне***, толькі каханьне дазваляе адчуць прыгожае, толькі прыгожае стварае мастацтва.

... яна набліжаецца на крылах віхураў, з высока ўзьнятай галавою, асьветленай маланкамі, з халоднымі вачыма помсты, і ўсё ж які агонь чыстай любові, якая поўніца шчасьця сьвеціцца ў іх для таго, хто адважваецца сьмелым позіркам паглядзець у гэтыя цёмныя вочы!

Прыкладна так сказаў некалі аўтар «Тангейзэра» пра Рэвалюцыю.

Габсбаўм Г.Э. Нацыі і нацыяналізм пасьля 1780 году.

Калі становішча валійскай мовы заставалася дастаткова ўстойлівым, Эмрыс ап Іван ужо разумеў: раз мы хочам, каб яна выжыла, яе трэба ізноў рабіць афіцыйнай мовай і мовай адукацыі.

Вам не здаецца, што ў 1999 годзе беларуская мова патрабуе абароны ня толькі ад русіфікатараў, але й ад найноўшых лінгвістычных адраджэнцаў?

Бібліятэкар.

Галамшток І. Таталітарнае мастацтва.

Бітва не на жыцьцё, а на сьмерць адбываецца зараз як у мастацтве, так і ў палітыцы. І гэтую бітву за мастацтва мы павінны весьці гэтак жа сур'ёзна і рашуча, як і бітву за палітычную ўладу (Шульцэ-Наўмбург, 1932).

Інфармацыйнае агенцтва Гаспадара Бібліятэкі паведамляе, што 1 сакавіка 1999 году міліцыя зрабіла разбойны напад на старшыню Цэнтральнай выбарчай камісіі па выбарах прэзыдэнта Краіны, які знаходзіўся ў салёне ўласнага аўтамабіля. Пазьней былі арыштаваныя астатнія 15 сяброў Камісіі. У Лёндане і Вашынгтоне гэтым фактам моцна абурыліся. Агенцтва Ройтэр перадае даволі дзёрзкія паведамленьні.

Гітлер Адольф. Мая барацьба.

Як лічынка хрушча ў пэўны момант ня можа неператварыцца ў самога жука, так і гэтыя парлямэнцкія вусені цяпер ня могуць уседзець на месцы. Цяпер яны пакідаюць падмосткі лялечнага тэатру і ўсе, як на крылах, ляцяць у розныя канцы краіны — ізноў да «любімага народу».

Ёрш Сяргей. Вяртаньне БНП.

Прысягаю на Бога, што буду верным да сьмерці свайму Народу і Бацькаўшчыне, буду аддана і самаахвярна змагацца за незалежнасьць Беларусі і за шчасьце і волю Беларускага Народу. Уступаючы ў рады БНП, прысягаю ня здрадзіць яе справу і тайнаў ані словам, ані чынам, хоць бы мяне чакалі найбольшыя спакусы і мукі. За справу БНП прысягаю аддаць у кожную хвіліну жыцьцё, бо ведаю, што яе справа — гэта справа волі і шчасьця Беларускага Народу і Бацькаўшчыны і што сёньня толькі ў шчыльных радох БНП мы здабудзем незалежнасьць Беларусі і дамо адпор нашым ворагам. Ведаю, што за здраду спраў і тайнаў партыі кожны яе сябра караецца сьмерцю. Ад сёньняшняга дня — я актыўны змагар і працаўнік БНП.

Жэрсон В. Нацызм — сакрэтнае таварыства.

... Мілаш (яго поўнае імя Оскар-Вацлаў Лабуноў-Мілаш, уладальнік Любіча) быў нашчадкам аднаго са старажытных родаў Літвы. Ягоныя уладаньні былі па тэрыторыі роўныя французскаму дэпартамэнту. ... Ён паведаміў, што ягоны бацька, Уладыслаў Любіч-Мілаш, месяцамі знаходзіўся ў стане мэдытацыі, застыўшы ў позе лётасу. Здаралася, што ў ягонай раскудлачанай шавялюры прарастала насеньне сланэчніку.

Клемпэрэр В. LTI. Мова Трэцяга Рэйху. Нататнік філёляга.

Характэрная прывязанасьць да таго ці іншага знаку прыпынку ўласьцівая і асобным людзям, і групам. Вучоныя любяць кропку з коскай, імкнучыся да лягічнай пабудовы фразы, яны патрабуюць разьдзяляльнага знаку як больш рашучага, чым коска, але які ня быў бы і абсалютнай граніцай, як кропка.

Зьвярніце ўвагу на зьмест і якасьць газэт, якія пасьля прозьвішча аўтара звыклі ставіць кропку, і якія падобную практыку не культывуюць, заклікае Гаспадар Бібліятэкаў. І прызнаецца: я люблю кропку як знак стабілізацыі, чыннасьці, завяршэньня працэсуальнай валтузьні і сацыяльнай анархіі; я толькі ненавіджу, калі кропку ставяць пасьля апошняй літары майго прозьвішча — быццам аддаюць загад расстрэльнай камандзе за маёю сьпіною.

Кніга Самурая: ***Юдзан Дайдодзі*** Будосёсінсю. ***Ямамота Цунэтомо*** Хагакурэ. ***Юкіо Місіма*** Хагакурэ Нюмон.

Нават паміраючы ад голаду, шуляк не дакранецца да зерня.

Увогуле, дастаткова быць апантаным і гатовым у любы момант разьвітацца з жыцьцём. Калі ж заўсёды думаць толькі пра тое, як зрабіць правільна, у хвіліну рашучых дзеяньняў ты замітусісься, і мэта ня будзе дасягнута.

Ніколі ня думаў, што нешта немагчымае.

Для чалавека, які мае рашучасьць, не існуе такіх паняцьцяў як правільнасьць альбо слушнасьць.

Маладзёны, фільтруйце базар, абураецца Бібліятэкар, не кажыце больш: «на Беларусі»! Усё, што тут адбываецца, адбываецца «ў Беларусі».

Лякёр У. Чорная сотня. Паходжаньне расейскага фашызму.

У посткамуністычнай Расеі рост фашысцкіх і фашызоідных настрояў падмацоўваецца моцным савецкім (камуністычным) складнікам і жаданьнем аднавіць імпэрыю. Гісторык не прарок, будучыня не прадвызначана, але няма сумневу, што ў наступныя гады правая сіла будзе ажыцьцяўляць у Расеі важную палітычную ролю.

Лукашук Аляксандар. Філістовіч. Вяртаньне нацыяналіста.

Няхай не забываюцца, што ёсьць яшчэ моладзь, у грудзёх якой гарыць агонь шчырага каханьня

Працяг на старонцы 8.

НАЦЫСЦКАЯ КОНТРАКУЛЬТУРА

Расейскі чорнакашульнік Ягор Летаў зь ягонай «Гражданской обороной» і «Красные звёзды» абслугоўваюць славянскую расісцкую моладзь. Аналагічныя ім культурныя зьявы вынiклі ва ўсіх краінах, дзе існуюць моцныя ідэалёгіі нацыянальнай, рэлігійнай, расавай варожасьці. Скін-рокеры, пісьменьнікі, мастакі нацыяндэграўнду пераймаюць досьвед дэмакратычнай лібэртарысцкай контракультуры 70-х — 90-х.

Да пачатку 80-х адносіцца ўзьнікненьне руху «Рок супраць камунізму» — яго стварылі скінгеды — фанаты групы «Skrewdriver» і сёйнага лідэра Яна Ст'юарта. На скінаў-экстрэмістаў была разьлічаная й музыка групаў «Legion 88» і «Bunker 84». У Францыі ідэалы Нацыянальнага фронту апявае група «Vae victis». У Нарвэгіі група «Burzum» у стылі «блэк-мэтал» просіць у абагоўленага Гітлера, якога яны разглядаюць як мэсію сатаны, каб ён адпусьціў ім грахі. У Амэрыцы іграе цэлая сьціжма музыкантаў-расістаў: у Дэтройце вядомыя гэві-мэталюгі «Rahowa», у Калярада — авангардысты з «Blood Axis», якія натхняюцца ў нечым грэгарыянскім сьпевам, а ў нечым Фрэнкам Запам і «Joy Division». Самы вядомы з фольк-экстрэмістаў — Эрык Оўэнз, што аздабляе свае дыскі свастыкай і не хавае захапленьня Гітлерам. Збліжаецца з усёй гэтай тусоўкай і шэраг нэапаганскіх групаў, якіх шмат у розных эўрапейскіх краінах.

Экстрэмісцкая культурная апазыцыя стварае свае асяродкі, сваю падземную супольнасьць, зьвязаную таксама з крайнімі правымі партыямі і напаўваеннымі арганізацыямі. Ворагі — бяз ворагаў такі рух не існуе — у кожнай краіне свае. У вялікіх гарадох Нямеччыны — панкі, гіпі, лявацкая моладзь, эмігранты. У Францыі — арабы й нэгры. У Амэрыцы — чорныя. У Ольстэры — каталікі. У Польшчы — жыды, цыганы. Гэты андэграўнд мае свае клюбы, кнігарні, кавярні, часопісы. У апошнія гады камунікацыя ідзе таксама праз Інтэрнэт, дзе ніхто й ня думае пра цэнзуру расізму (бо нават парнаграфіі ня могуць даць рады). І калі расісцкія культура і мастацтва прысутныя ў сэтцы менш, чым «левая альтэрнатыва», дык толькі таму, што расізм (здаецца, гэта асноўная сёньня ідэалёгія нянавісьці) — ідэалёгія самых цёмных слаёў грамадзтва, якія марудна звыкаюцца з тэхнічнаю навіною.

Сярод выданьняў гэтага кірунку вылучаецца ілюстраваны дэтройцкі «Resistance» (ён таксама ёсьць у Інтэрнэце). На яговых старонках можна знайсьці вядомыя назвы: «Swastika», «Aryan», «Brutal Attack», Брыжыт Бардо, а таксама здымкі бляндынак плэйбоеўскага кшталту, якія распавядаюць пра тое, як яны ганарацца тым, што яны белыя, і як яны даражаць «сапраўднымі вартасьцямі». Цікава, што на антыфашыстоўскім шэсьці 27 лютага ў Менску адзін з транспарантаў нёс хлопец у шапцы з надпісам «Resistance» — для большасьці беларусаў гэты лягатып нічога ня кажа.

У нацысцкай інды-музыкі ёсьць свае выдаўцы: «Storm Front», «Funk Brothers», «Viking Sounds», «Hate Society Records», «Victory Records» ды іншыя. Паколькі прыстойныя крамы прадаваць такое дабро не наважваюцца, распаўсюджаньне адбываецца пераважна праз сыстэмы «Касэты — поштай» і Інтэрнэт. У многіх гарадох у крайняй правіцы ёсьць свае радыёстанцыі — прыкладам, у Парыжы гэта Radio Courtoisie, — і сеткі продажу відэакасэтаў.

Сярод мастакоў таксама ёсьць расісты-нонканфармісты. Яны звычайна самарэалізоўваюцца ў часопісах-коміксах і малююць афішы. Творчасьць такіх мастакоў як Алікс, Од, Катрына, Баркэ, Аксэль Фор збліжаецца з эстэтыкай таталітарнага мастацтва 20-х — 50-х гадоў.

Што датычыць слова, дык тут ёсьць каго чытаць і з даўніх аўтараў: ад Ніцшэ да Пікуля, ад Вайнінгера да Сэліна, ад Хамякова да д'Анунцыо і Барэса. Сярод сучасных найбольшую папулярнасьць здабылі тыя, хто піша палітычную фантастыку. Эўрапейскія спэцыялізуюцца на апісаньні наступстваў напливу эмігрантаў у Эўропу (Філіп Ранда, аўтар раманаў «Заўтра Пуат'с» і «Апакаліпсіс янкі»). Па той бок Атлянтыкі найбольш вядомы стары нэанацысцкі лідэр Уільям Пірс, які выдаў пад псэўданімам Эндру Макдональд раман «Дзёньнікі Тэрнэра». У ім апісваецца, як уладу ў Амэрыцы шляхам перавароту бяруць нацысты: Ізраіль за пяць сэкундаў ядзерным ударам сьціраюць з карты сьвету (пры гэтым удаецца не зрабіць шкоды палястынцам), а белых жанчынаў, што кахаліся з нэграмі, вешаюць на ліхтарах над аўтастрадамі. Кніга вытрымала 20 перавыданьняў. Цяпер яна таксама ёсьць у Інтэрнэце.

Некаторыя артысты сталі ідэаламі крайняй правіцы міжволі, хоць яны і не належаць да нацыяндэграўнду. Сярод іх — героі «Х-файлаў» Джыльян Андэрсан і Дэвід Духоўны — мабыць, таму, што яны з сэрый ў сэрыю змагаюцца зь нейкімі змовамі, і таму зь імі лёгка атаясамліваюць сябе экстрэмісты, і Мэл Гібсан пасьля фільму «Адважнае сэрца». Група ж «Cranberries» палюбілася ім з той прычыны, што іх салістка ўзяла актыўны ўдзел у барацьбе за захаваньне сьмяротнага пакараньня і супраць абортаў.

Усю контракультуру, грунтаваную на ідэалёгіях нянавісьці, лучаць культ сілы, агрэсіўнасьць, антысэмітызм, непрыманьне глябалізацыі, антыазіяцкі і антыафрыканскі расізм, адданасьць паганству або найбольш паганскім элемэнтам хрысьціянства і нацыянальны шавінізм.

А.В.

ТУГА ПА ВОСЕНІ

У Эўропе восень. Думкі растварaюцца ў нечым пустым і бясконцым. Крыштальна яснае ўсьведамленьне адзіноты сьведчыць аб наяўнасьці свабоды.

Вуліцы Варшавы й Прагі бязгучна шапочуць аб заняпадзе. Але заняпад Эўропы мае дзіўны смак; напэўна, філёзаф адчувае яго як чалавек, што стаіць на вяршыні высокае гары, а вакол на многія кілямэтры толькі пустата ды вецер.

А недзе на ўсходзе знаходзіцца далёкая краіна, якая нават не заўважае пераменаў у сьвеце. Бо «дрыгва застаецца дрыгвой». Сьвет уваходзіць у новае стагодзьдзе. А ў Беларусі нясьпешна перажывасабліецца 1933-ці год. У цэнтры Эўропы разваляецца насіць нашыўкі са свастыкай. Альбо біць «жыдоў», «нігераў» і «патлатых». І ўжо пачынае рабіцца нормай існаваньне ўплывовых груповак фашыстоўскага кшталту.

У адказ на расейскі фашызм радыкальныя белнацгрупоўкі ціха, але ўпэўнена імкнуцца да канфрантацыі. А некаторыя грамадзкія аб'ёднаньні заклікаюць ствараць атрады народнае самапомачы.

Улады ж ні ў чым не пярэчаць фашыстоўскаму руху і толькі робяць рэкляму асобным незарэгістраваным арганізацыям, затрымліваючы іх сяброў нібыта для «высьвятленьня абставінаў». Тым часам на вуліцах зьбіваюць журналістаў, грамадзкіх дзеячоў, простых людзей — арганізавана або неарганізавана. Дух нянавісьці пранізвае дачыненьні паміж людзьмі.

Нехта прапануе адказаць на сілу сілай, але лякалны мардабой, які гэтак любіць наш народ, ня вырашыць праблемы фашызму. Фашыстоўскія тэндэнцыі ў грамадзтве былі прадказальнымі яшчэ пару гадоў таму, калі адкрытых прыхільнікаў фашызму ў Менску амаль не было, але правы рух да гэтага часу ня зьдзейсьніў аніводнае антыфашыстоўскае ініцыятывы. Як заўсёды, меліся справы больш важкія й неадкладныя. Зараз жа любая ініцыятыва здаецца толькі «хапаньнем за саломінку» — механізм канфрантацыі ўжо дзейнічае.

Кажуць, што пацукі ў дзяцінстве былі цам надта мілыя... Кажуць, што Internet пачынаўся калісьці з трох злучаных між сабою кампутараў... А што будуць казаць у сьвеце пра Беларусь праз які-небудзь дзясятак гадоў?

У Эўропе — восень... Прыемна ісьці па скошаным полі насустрач заходу сонца; прыемна сьпяшацца ўвечары пад дажджом да ўтульнага й цёплага дому; прыемна ведаць, што сёньня ніяк не пашкодзіць таму, што адбудзецца заўтра. І што гэтак будзе заўсёды.

Антон Тарас

БІБЛІЯТЭКА N

Працяг са старонкі 7

Бога, Праўды і Роднага Краю, моладзь, якая сурова асудзіць тых, хто, зышоўшы ў бездарожжа, усякімі спосабамі старaецца сьцягнуць іншых.

Незалежнасьць свайго народу нельга выпрасіць, ня вытаргуюць яе і дыпляматы, яе можна здабыць толькі збройна.

Пад попелам гараць вугалькі, іх разьдзьмухае вецер, і яны запаляць штучны дом, пабудаваны ворагам замест сапраўднага.

Маркузэ Гербэрт. Эрас і цывілізацыя.

Сёньня барацьба за жыцьцё, барацьба за Эрас — гэта ***палітычная*** барацьба.

Ніцшэ Ф. Творы.

Калі ты перш за ўсё і пры любых абставінах не наганяеш страху, то ніхто не падумае пра цябе настолькі сур'ёзна, каб урэшце палюбіць цябе.

Хто хоча стаць праваднікам для людзей, павінен на працягу добрага кавалку часу лічыцца сярод іх самым небясьпечным ворагам.

Ёсьць ступень заядлай ілжывасьці, якую называюць «чыстым сумленьнем».

Падазраючы, што нехта ілжэ, прыкінемся, быццам мы верым яму; тады ён робіцца нахабным, ілжэ яшчэ больш, і маска спадае.

Ёсьць пільная патрэба вярнуць у беларускае жыцьцё стыль; гэта і будзе цэнтар сілы, кажа Гаспадар Бібліятэкі.

Ніцшэ Ф. Творы.

Будзьце такімі, чый позірк заўсёды шукае ворага — ***свайго*** ворага. І ў некаторых з вас іскрыцца нянавісьць ужо зь першага позірку.

Што добра? — пытаецеся вы. Добра быць сьмелым.

Бібліятэкар сьцьвярджае: Беларусь уратуе кароткая стрыжка!

Найдзюк Я., Касяк І. Беларусь учора і сяньня.

Мноства расейцаў, прысыланых у БССР на працу і пастаяннае жыцьцё, прыдавалі ўсяму краю расейскі характар. Яны займалі кіруючыя становішчы, арганізоўвалі ўсюды гурткі расейскай фальклёрнай самадзейнасьці і рэпрэзэнтавалі насельніцтва Беларусі перад наведваючымі чужынцамі як расейскае. Цяпер пануючы грамадзкі стан у Беларусі ачольваюць расейцы, якія зьяўляюцца прывілеяванай кіруючай элітай краю. Працоўны беларускі народ зьяўляецца падпарадкаванай і прыгнечанай часткай насельніцтва Беларусі.

Пляцкоў А. Міты нацыі супраць мітаў дэмакратыі: нямецкая палітычная традыцыя і нацызм.

Важнейшым за ўсялякія вівісэкцыі інтэлектуалізму зьяўляецца рост нацыянальнага міту, міту, ня вымучанага нэрвамі, а таго, які вырастае з крыві. Не рацыяналізм, а міт нараджае жыцьцё. Міт — гэта сэнс і зьмест нашага часу. Таму і мае месца варожасьць паміж інтэлектуалізмам і панацыцём народнасьці. Народнасьць — гэта вера і развіцьцё, а інтэлектуалізм — гэта скептыцызм і бясплоднасьць (Хусонг, ням. публіцыст).

Сёньня мала сказаць «я сьвядомы беларус», кажа Гаспадар Бібкалектару, сёньня актуальным зьяўляецца «сапраўдны беларус», г.зн. той, які, пракладаючы шлях аднакрэўным, гатовы пайсьці на сьмерць.

Райх В. Псыхалёгія масаў і фашызм.

З другога боку, у часе знаходжаньня ва ўладзе лідэры фармальнай дэмакратыі зрабілі памылку, палічыўшы, што народныя масы здольныя аўтаматычна стаць свабоднымі, і тым самым нэўтралізавалі ўсялякую магчымасьць усталяваньня свабоды і адказнасьці народных мас. Яны ніколі не зьявяцца, бо іх паглынула катастрофа.

Розэнбэрг А. Міт ХХ стагодзьдзя. Ацэнка духоўна-інтэлектуальнай барацьбы постацяў нашага часу.

З квітнеючага ізноў нацыяналістычнага сьвету духоўныя сілы растуць ва ўсіх напрамках. Кожным з гэтых напрамкаў можа кіраваць толькі вялікая асоба, і магчыма, што адна зь іх увасабляе шмат сабраных у адно валявых чысьцінак. Але заявіць на гэта прэтэнзію можа толькі сапраўды вялікі чалавек без адзінай хібы ў характары і душы. Так мы чакаем паэта сусьветнай вайны, вялікага драматурга нашага жыцьця, вялікага архітэктара і скульптара.

Шапэнгаўэр А. Свабода волі і маральнасьць.

Людзі прыпадабняюцца да дзяцей у тым сэнсе, што, калі ім даравaць, яны робяцца непаслухмянымі, таму нікому ня трэба асабліва саступаць, тым больш падлашчвацца. Падобна да таго, як мы звычайна не губляем сябра, калі адмаўляемся даць яму ў доўг, але вельмі лёгка страчваем яго, калі даём, — гэтаксама мы рэдка губляем сяброў з-за нашага гордага і ў нейкай ступені нехаяйнага да іх стаўленьня, але гэта часта бывае пры празьмернай да іх пяшчотнасьці і запабежлівасьці, што робіць сяброў нахабнымі і невыноснымі, пасьля чаго і надыходзіць разрыў.

Даравaць і забывацца — значыць кідаць за вакно набыты каштоўны досьвед.

Шульгін В. «Што нам у іх не падабаецца...»: Аб антысэмітызме ў Расеі.

Гэтак: што нам у іх не падабаецца? Шчыра кажучы, больш за ўсё нам у іх не падабалася тое, як яны да гэтага ставіліся, г.зн. да таго, што яны нам не падабаліся. Яны, можна сказаць, абсалютна ў гэтым пытаньні былі шалёнцамі. І вось чаму было абсалютна немагчыма ***зь імі пра гэта*** размаўляць...

Кожная нацыя, раса, народ мае права на месца пад сонцам. Добрая яна альбо дрэнная, але тым фактам, што яна існуе, яна мае ярлык на працяг свайго існаваньня. Занадта ветлівыя ангельцы ў тых выпадках, калі чалавека вельмі доўга і за ўсё да рэшты напракаюць, кажуць: «Даруйце мне, калі ласка, што я нарадзіўся на сьвет». У гэтай тонкай насьмешцы ўся сутнасьць нацыяналізму. Народ нарадзіўся на сьвет Божы, ён існуе, ён хоча жыць і далей. І хоча быць такім, якім ён ёсьць. Гэта не азначае, што ён не павінен удасканальвацца; але гэта азначае, што ўдасканальваючыся, ён усё ж ня хоча губляць сваёй індывідуальнасьці, свайго «я», сваіх асаблівасьцяў, якія адрозьніваюць яго ад іншых народаў, нацыяў, рас. Натуральна, калі штосьці альбо хтосьці тым ці іншым спосабам гэтую народную ці расавую індывідуальнасьць зьнішчае, сьціpae, падмяняе, то народ, які не завяршыў сваёй «нацыянальнай стадыі» развіцьця, можа і павінен абараняцца ад «набрыдзі».

Гаспадар Бібліятэкі раіў бы і нашым азнаёміцца з работай Шульгіна, прачытаць яе крытычна, але — прачытаць.

Шпэнглер О. Занепад Эўропы.

У кожнай культуры свае новыя магчымасьці выказваньня, якія зьяўляюцца, высьпяваюць, вянуць і ніколі не паўтараюцца.

Гаспадар Бібліятэкі ўдакладняе: магчыма, што і не кароткая стрыжка ўратуе Беларусь, але ўжо дакладна, што ня патлы.

На пытаньне «Што рабіць?» адказ дае пазытыўны: праявіць волю, выхаваць нянавісьць, палюбіць зброю, даць дарогу нацыянальнай сіле.

ПЕРШАЕ ЯЙКА АБСУРДУ

Часта ўсё, што мае сэнс, называецца ў нас авангардам. Яшчэ – экзотыкай. Калінікалі – абсурдам. Таму мы ўжо прызвычаіліся да таго, што жывем у вельмі авангардна-экзатычна-абсурдным асяродзьдзі. (Спадзяюся, гэта камплімэнт.) Любы культурны гэпэнінг альбо творчая асоба ўспрымаюцца як непадуладная разуменьню зьява заўтрашняга дня. А ў нас, пагадзіцеся, што ні чалавек, то творчая асоба, і што ні асоба, то гэпэнінг. Мы добра памятаем, што культура ствараецца ў нас на Ўсходзе й нідзе больш (нягледзячы на высілкі часопісу "Фрагмэнты"), бо ўвесь астатні сьвет – кляака спажывецкага грамадзтва. Вядома, у Эўропу мы хочам, строі ад Макс Мары й Джорджа Армані нам таксама не зашкодзяць, але толькі ў межах разумнага. Мы ведаем, калі спыніцца, бо мы – творцы, фарпост авангарду, гнілая й паўп'яная праслойка, якая стала ўгнойвае ніву культурнага авангарду ў горадзе-героі Менску. Але, як высьветлілася, сапраўдны абсурд зьявіўся ў нашым горадзе ня так даўно.

А дакладна – у выглядзе спэктаклю "Вольнай сцэны" "Бот і яго шкарпэтка". Крыху кічавым (рэжысэрка – Таццяна Сулімава), выключна прафэсійным (актор Анатоль Кот) відовішчам, якое разбурае ўяўленьне пра тое, якой мусіць быць актрыса й як яна павінна граць (Людміла Сідаркевіч). На мой погляд, зусім ня дзіўна, што бомба разарвалася на "Вольнай сцэне," а ня дзе-небудзь яшчэ. На сёньня менавіта праект гэтага тэатру "Віта Брэвіс, або Нагавіцы сьвятога Георгія" (дарэчы, зьняты з рэпэртуару) змог вырваць асобу Францішка Скарыны з пыльных падручнікаў, акадэмічных манаграфіяў і тэатральных пастановак і ўвесьці яе ў рэальнае жыцьцё, у трамвайную гутарку. Дзякаваць "Вольнай сцэне" й аўтарам п'есы М.Клімковічу і М.Шайбаку, Скарына пераўтварыўся ў сапраўднага народнага героя. Прынамсі, я асабіста не магу ўявіць, што звычайныя падлеткі зь мікрараёну будуць апантана абмяркоўваць учынкі Францішка Скарыны пасьля прачытаньня "Сонца маладзіковага" Алега Лойкі, якой бы добрай ні была гэтая кніга.

На спэктаклі "Бот і яго шкарпэтка" (аўтар п'есы — Генрых Ахтэрнбуш) падлеткаў, канечне, не было, бо гэта ня казка пра д'Артаньяна ў нагавіцах сьвятога Георгія – гэта фарс-абсурд. Пабытовыя размовы прыкутага да інвалідзкага крэсла мюнхенскага паэта зь ягонай жонкай-мэдсястрой, якая быццам бы кахаецца з пацыентам-рымлянінам і праз рэўнасьць спальвае адзіна каханую жанчыну паэта – актрысу з гамбурскага драмтэатру (за дакладнасьць сюжэту не адказваю: абсурд усё-такі).

Гэта спэктакаль пра прыхаваную страсьць і ейную адсутнасьць у рэчаіснасьці. Каханьне, пакуты не атрымліваюць вонкавай праявы – яны жывуць у душах герояў, якія вывbooарочваюцца насподніцу ў пабытовых размовах. Якія асацыяцыі паўстаюць пры слове "пабытовы"? – будзённы, штодзённы, руцінны, просты, прымітыўны. Сапраўды: просты сынтаксыс, няпоўныя сказы, нейкія "працоўныя выкрыкі" – усё тое, што мы чуем ад сваіх кожны дзень. З адным толькі адрозьненьнем: сваіх мы ведаем, а таму разумеем. Тутака ж пабытовая размова, як і мае быць у законах лінгвістыкі, робіцца амаль неўспрымальнай для староньняга назіральніка. Слухач ня ведае падтэксту, ня можа заўважыць зацененых сэнсаў у дыялёгу двух блізкіх людзей, не валодае нават кантэкстам гаворкі, тым больш, што на сцэне не адбываецца дзеяньня, якім мы прызвычаіліся яго бачыць. Гэта – плястыка,,жэсты, міміка, няспыннае пераўвасабленьне, фантасмагорыя руху. Тое, як Людміла Сідаркевіч паказвае сваім целам спачатку ўдаваны ідыятызм, а потым вытанчаную жаноцкасьць, заслугоўвае асаблівай увагі й, відаць, узнагароды. Да пары акторцы й ейны партнэр, Анатоль Кот, які амаль увесь час сядзіць у крэсьле, але мы, здаецца, бачым рух думак ягонага героя.

Але асноўная нагрузка, канечне ж, на словах. На стылістыцы пабытовай размовы, дзе, калі Вы паназіраеце за сабой і Вашымі сваякамі, каспаязыкасьць проста прэ з суразмоўцаў, як у рамане Коба Абэ "Таемнае спатканьне" вата – з жанчыны, якая ўрэшце ператвараецца ў ватовую коўдру. І тым ня менш, праз гэтую каспаязыкасьць (чалавек думае згорнутымі фразамі, амаль безь дзеясловаў) мы спасьцігаем сваё атачэньне, прыходзім да ўласнага, а не прыдбанага, сьветапогляду. Блізкія людзі якраз і атрымліваюць інфармацыю пра гэты індывідуальны сусьвет, пра нас без прыўкрас, так бы мовіць. Пры пэўным досьведзе, менавіта ў пабытовай размове можна разгадаць чалавека, адкрыць найглыбейшыя пласты чалавечай псыхікі й сьвядомасьці. За павярхоўнасьцю й, часам, несур'ёзнасьцю тэмы пабачыць паэтычныя абшары альбо страшэннае калецтва душы. Нездарма ж людзі сыходзяцца ў залежнасьці ад таго, наколькі пасьпяхова яны могуць камунікаваць на пабытовым узроўні. Пры гэтым двое людзей могуць дасягнуць той ступені еднасьці, калі тое, што падаецца ім сьмешным, паўстае перад слухачом увасабленьнем абсурду. Але надзіва на спэктаклі можна было пачуць цалкам асэнсаваны, а не бездапаможна-гістэрычны сьмех гледачоў. Відаць, ізноў-такі дзякаваць майстэрству актораў і рэжысэркі.

Скончаецца ж спэктакаль зусім не вясёла: забойствам на пабытовай глебе. І аголеныя душы герояў цягнуць з сабой у нябёсы даволі недарэчны прадмет, які стаўся пэўнай адмецінай, каштоўнасьцю іхнай будзёншчыны, а менавіта белы мэталёвы імбрычак. Белыя душы сыходзяць, а белы імбрычак завісае ў прасторы на чорным тле задніку. Няма ўзвышаных пачуцьцяў, няма патасу, няма подзьвігу, а ёсьць жанчыны, якія нясуцца альбо яйкамі, альбо кавунамі. І кожны пражыты дзень патрабуе гераічных высілкаў.

"Складаны спэктакаль, няпросты. Не ўсялякі глядач можа яго зразумець, таму й ня ходзяць," – меркаваньне білетніцы. Але ўсё ж такі спэктакаль, відавочна, знайшоў свайго гледача, хаця, калі гаварыць словамі з п'есы: "Так, першае яйка йшло нялёгка".

Марыя Роўда

ПАЎСЯДЗЁННАЕ ЖЫЦЬЦЁ Ў БЕЛАРУСІ. 1945-1965

«Паўсядзённае жыцьцё ў Беларусі. 1945-1965» – так называўся конкурс для школьнікаў, які быў абвешчаны на пачатку траўня 1998 году Архівам Найноўшае Гісторыі (створаным Беларускім Гуманітарным Фондам «Наша Ніва»). 8 студзеня 1999 году былі абвешчаныя вынікі конкурсу, а 20 лютага ў клюбе «Акварыюм» адбылося ганараваньне пераможцаў. Стваральнікі праекту, у якім, акрамя ўласна АНГ, удзельнічалі Таварыства Беларускай Мовы, Фундацыя Сьцяпана Батуры і варшаўскі цэнтар KARTA, паставілі перад беларускімі падлеткамі нетрадыцыйную задачу. На падставе ўспамінаў, дакумэнтаў, фотаздымкаў трэба было стварыць жыцьцяпіс асяродку, у якім жывуць удзельнікі конкурсу, распавесьці гісторыю сваімі словамі са словаў сваіх крэўных. Формы, у якіх увасобілася гэтая ідэя, былі розныя. Апроч тэкстаў, напрыклад, дадаваліся аўдыёкасэты ці ўнікальныя альбомы здымкаў і аўтэнтычных дакумэнтаў.

Па выніках трох этапаў конкурсу журы вызначыла сваіх ляўрэатаў.

Вышэйшымі ўзнагародамі, мультымэдыйнымі кампутарамі, былі адзначаныя працы Ганны Рудкінай, Вольгі Вялікай, Анатоля Паўлоўскага, а таксама калектыўная праца Юрыя Кізюка, Андрэя Лізуна, Вячаслава Рудага, Руслана Плавікава, Івана Мякекі, Кацярыны Шыдлоўскай, Валянціны Аношкі, Паўла Чугая і Аляксея Сівухі.

Другую ўзнагароду, фотаапараты і дыктафоны, атрымалі Анатоль Саракавік, Сяргей Булавацкі, Андрэй Кавалёў, Яўген Бельскі, Юлія Захаранка, Аляксандар Зайцаў, а таксама калектыўныя работы: гуртка «Спадчына» – Сьвятланы Баршчэўскай, Ганны Яцэвіч, Паўліны Прохаравай, Аляксандра Локтыша; спэцыяльны нумар газэты «Зялёны дуб», падрыхтаваны Яўгенам Мядзейкам, Ірэнаю Паламарчук, Сяргеем Мядзерам, Кірылам Гурыновічам і Вэранікаю Лаўровай; а таксама калектыўная праца Ігара Пахіркі, Вольгі Скавародка, Аляксандра Протаса і Аляксандра Вішнеўскага.

Трэція ўзнагароды, дыктафоны, атрымалі: Алена Кіёнак, Ірэна Космыкава, Яўген Тарашкевіч, Аляксей Цімошын, Наста Ліцьвінава, Натальля Пахамовіч, Вольга Тэборка, Хведар Сазанавец, Таццяна Конан, Алена Лютко, Сьвятлана Сэндзер, Юрась Наваграй, Мікалай Драбкоў, Аляксандар Бабеня, Алег Шкнай, Андрэй Дэц, Уладзімер Малахеня, Ірына Дубейка, а таксама Павал Цітавец і Кірыла Цітко.

Асаблівыя ўхвалы і ўзнагароды атрымалі ўсе, хто дапамагаў юным дасьледнікам у іх працы, бацькі і настаўнікі. Частка гэтага ўнікальнага збору будзе апублікаваная на старонках нашай газэты. У красавіку яны выйдуць і асобнай кнігаю.

РЭПЭРТУАР
на сакавік 1999 году
Рэспубліканскага тэатру беларускай драматургіі

16 аўторак «Узьлёт Артура Ўі, які можна было спыніць» Трагіфарс Б.Брэхт

Прэм'ера:

17 серада 25 чацьвер «Бот і яго шкарпэтка» Фарс-абсурд Г.Ахтэрнбуш

20 субота «Паваліўся нехта» Фольк-жарт У.Галубок, Л.Родзевіч

21 нядзеля «Барбара Радзівіл» Паэтычная драма Р.Баравікова

23 аўторак «Рычард» Трагедыя У.Шэксьпір

26 пятніца 30 аўторак «Апошняя пастараль» Фантастычны трылер-кліп па матывах аповесьці А.Адамовіча М.Дзінаў

27 субота «Разьвітаньне з Радзімай» Драма А.Папова

28 нядзеля «Лекар паняволі» Эклектычная камэдыя Ж.-Б.Мальер

31 серада «Містэр Розыгрыш» Гульні дарослых С.Кандрашоў

Мастацкі кіраўнік тэатра — заслужаны дзеяч мастацтваў РБ, ляўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі Валеры Мазынскі

Пачатак спэктакляў а 19 гадзіне

БЕЛАРУСКІЯ МУЗЫЧНЫЯ НАВІНКІ

1. Крыві. За туманам... Ковчег, 1999.
2. Žygimont VAZA. Der Dritte Krieg. 1996. Беларуская музычная альтэрнатыва.
3. Тэатар-студыя «Зьніч». Востраў душы. Навапалацак. БМА, 1998.
4. Пошук. Падвойны альбом. Наш абавязак застацца жыць! Першы крок, 1987.

Для атрыманьня касэты трэба пералічыць 260 000 + 30 000 руб. (за перасылку) на адрас: 220085, Менск, а/с 5. Супрановіч Віталь. Пазначце, калі ласка, свой тэлефон.

Беларускія касэты ў Менску: Галерэя мастацтва (каля пл. Якуба Коласа), Камароўка (адкрыты рынак, стэнд ля пераходу на крыты), шапік «Карона» (скрыжаваньне Сурганава — Коласа, ля інтэрнату), ст. м. «Інстытут Культуры» (стэнд ля ўваходу да чыгункі), БНФ (Варвашэні, 8).

Анатоль Балуценка

ЛЮДЗКАЯ ГОДНАСЬЦЬ

Радзіма! Як здарылася з табой,
Што дзеці адцураліся ад маткі?
Вялі за волю продкі цяжкі бой,
Ды славы іх ня годныя нашчадкі.

Нацыянальнай годнасьці няма,
Сваю культуру мы не паважаем,
Бо рускі вірус горай, чым чума,
Нас нішчыць, быць народам не жадаем.

Бо мовы мы саромемся сваёй,
Вялікай, некранутай і магутнай.
У сэрцах, як на могілках, спакой,
Радзімы мову лічым вельмі бруднай.

Радзіму любім, але мала нас,
А большасьць ёй зрабіць гатовы шкоду.
Бяз годнасьці людзкой празь нейкі час
Ня будзе ні Радзімы, ні народу.

Ярына Берасьцейская

***

Там лістапад на двары –
Марай наступнага дня...
Не здагадаліся Вы:
Тая, што з Вамі – ня я.
Тая, што з Вамі – спакой
П'е зь бяздонных вачэй
І занямелай рукой
Самоту здымае з плячэй.

Там, за вакном, толькі дождж –
Гэта яшчэ не зіма.
Позьняя восень, і ўсё ж
Тая, што з Вамі – ня я.
Тая, што з Вамі пайшла,
Зоркай згарыць уначы.
Моўчкі замкнецца душа,
А я загубіла ключы.

Зноў лістапад на двары –
Згадкай мінулага дня.
Не здагадаліся Вы:
Тая, што з Вамі – ня я.

***

Ты, браце-беларус, скажы,
Чый лёс яшчэ мы знойдзем горшы.
Яе расьпялі на крыжы
Паміж Расеяю ды Польшчай.

Цярновы квет на галаве,
У вачах нямая адзінота.
Яна шапнула горда: «Не!»
І людзі верылі ўпотай.

Адны да роднае зямлі
Шукалі сьветлы шлях у брудзе,
Другія – мыліся ў крыві
Ды цалавалі твар Іюдзе.

Страшэнны цар сьляпых падзяк.
А памятаеш, браце, песьню,
Яны ж ня верылі ніяк,
Што тая недзе уваскрэсьне.

У іншы дзень, у іншы час
Апошні подых цёмнай ночы.
Я тройчы заклікаю вас,
Каб не адмовіліся тройчы!

Сымон Вернік

ДУМА

Не зламіў нас Батый!
Азіяцкай крыві пад ардою
Не ўлівалі ў балта-славянскія
гены свае мы,
Мо таму і нязвыкла
кранаць нам зацята душою
І свабоды, і волі
да болю гарачыя тэмы.
Не пад жорсткай ардой,
а пад іншым уціскам стагодзьдзі,
Як нявольнікаў звыклых,
трымала народ ліхалецьце.
Каранёў не згубілі ў пакутах,
і вось аб сабе як народзе,
Мовы маючы гук,
абвясьцілі натхнёна мы ў сьвеце!
Вы ня чулі пра нас?!
Гэта ж мы – дзеці роду Міндоўга,
Прысьвятой Еўфрасіньні сыны,
Гедымінавы ўнукі.
Пад прыгнётам свабоду і волю
шукалі мы доўга,
Вырваць каб з кайданоў назаўжды
працавітыя рукі!
Нашы продкі здаўна
гуртаваліся на паўзьбярэжжы
Вусьця Нёману
і ўздоўж дняпроўскіх мурожных вытокаў,
Каб акрэсьліць зямлі свае Белай
нязломныя межы,
Каб ня чуць ваяўнічых ніколі
з Усходу і Захаду крокаў.
Вынішчалі наш род
і зямлю падзялялі на часткі
Чужакі іншаземцы,
але ж ажывалі руіны.
Гэта тут крыжакам
рыхтавалі сьмяротныя пасткі
Вітаўт-князь і Ягайла-кароль,
абаронцы Айчыны.
Гэта тут Каліноўскі Кастусь
супраць царскага гнёту
Заклікаў да паўстаньня і
збройнага чыну сялянаў.
Гэта тут, за свабоду краіны
і волю народу,
Лютых катаў зьнішчалі
атрады стральцоў-партызанаў.
Ад узрэчча Дзьвіны і да Буга
Радзіма-матуля
Крылаў моцных размах
распрастала, як вольная птушка.
Пад сьцягамі свабоды
ішоў на штыхі і пад кулі
Тут калісьці зь сябрамі
Вялікі Тадэвуш Касьцюшка!
Гэта мы – той закляты народ,
які грэбуе марай
Адрадзіць на вякі гістарычна
свой род старажытны,
Той народ, які ўбілі
наймоцным падмуркам-ахвярай
Пад Вялізны Жахлівы Статуй –
габарытна-гранітны!
Гэта – тая зямля,
дзе сьмяротнага атаму хмары
Атруцілі лясы, сенажаці,
азёры і рэкі,
Гэта – тая зямля,
дзе нашэсьце мангола-татараў,
Як нястрымна-зьнішчальную плынь,
супынілі на векі!
А зьнішчэньне сябе
ці ж спынілі да гэтай хвіліны?!
У сталіцы, і той,
анідзе не чуваць роднай мовы.
У краіне мы ўласнай жывем,
а нібы без краіны!
Адраджэньне народу, –
няўжо гэта шлях выпадковы?!
Не зламіў нас Батый!
Азіяцкай крыві пад ардою
Не ўлівалі у балта-славянскія
гены свае мы,
Мо таму і нязвыкла
кранаць нам зацята душою
І свабоды і волі
да болю гарачыя тэмы?..

Марта Гамановіч

***

Сказалі, што цябе няма,
І расплялі па нітцы.
Вісіць зялёная турма,
Ды бель ня дасьць забыцца.

А, помніцца, было, было,
Мой дрыгавіч прыгожы.
Ды тую, што ўваткала зло,
Сам чорт спыніць ня можа.

Хто на магілах кросны тчэ –
Любові не заслужыць.
Вяртайся, пажывем яшчэ
Дзеля пунсовай ружы.

А залатыя паясы
Ў надзейным месцы ткуцца.
Чые ўваткуць там валасы –
Той і ўпадзеш на грудцы.

Мікола Канановіч

***

Гляджу на горад: мой ён і ня мой.
Паэт сказаў, што горад безь цябе,
Мо нас працяжнік злучыць на адной
Крывой жыцьця, але хутчэй што – не.

З усіх гісторый, дзе каханьня жарсьць,
Ня горад – сьвет гатова спапяліць,
Мо, наша не пісалася для нас,
І вось таму мы засталіся жыць.

Табою слова не прамоўлена: «Чужы».
Я толькі госьць, які зайшоў на аганёк.
Ды вось на стол зьбіраць ты не сьпяшы,
Каб потым справадзіць мяне ў змрок.

Лепш запытай банальна пра жыцьцё.
Ды я па гэта толькі і зайшоў
Па шляху доўгім на сваё сяло
З гораду, дзе лёс з табой разьвёў.

Дзед Карней

ПАЎЛУ СЕВЯРЫНЦУ

«Какой те кубочек? Горбатый?» –
Сказала хлопчыку кабета.
Ён стаў зусім ніякаваты:
Што адказаць ён мог на гэта?!

Але да гэткіх абаротаў
Наш сябра ўвогуле ня звык
І паказаў на разьвітаньне
Ёй беларускі свой язык.

НАЗЕ ВОЛЬГІ КАРАТКЕВІЧ

Нагу такую адкапаць –
То справа нерэальная:
Для вэртыкальшчыкаў яна
Заўсёды вэртыкальная,
Гарызантальнай можа стаць
Для дэмакрата толькі –
ARCHE-лягічная нага
У Караткевіч Вольгі.

Станіслаў Карпаў

НЕШТА

Па-за гульнёй заставаліся людзі,
Мала хто зь іх кране боль у сваіх душах,
Што, часам, сьлязамі рэзаў грудзі,
Зьнікае, а зараз Чорнае душыць,
Укладвае Шэрае ў сэрца праз вушы,
Недзе зацята вышэйшага судзіць...
Ім не дажыць, не дабрацца да сушы,
Усе патанаюць у восеньскім брудзе...

БПСМ-АВЕЦ

А да потных пальцаў грошы наліпаюць.
Нада мною – лямпа, пада мной – падлога.
Зь любага партрэту вочы паглядаюць,
Позірк іх вясковы «па-бацькоўску» строгі.
Там, дзе нашы людзі давяцца крывёю,
Выйду й засьпяваю пра «Расею сыту»,
Будзем ў вечным шлюбе з роднаю сястрою,
А на Захад плюнем, там усе бандыты.
Абавязак мужа, чысты і здаровы,
Выканаем дружна, калі ёсьць патрэба,
Калі не; дык з жонкай, ціхенька, як дровы,
Ляжам мы, бы століь, разглядваючы неба.
Будуць у нас «дзеці», будзе і «каханка».
Сала мы «каханцы» пакажам ў «Калыханцы»...

СВАБОДА

У чым свабода?
Ў разьбітым твары
Дзяржавы ботам,
Ці ў сьціплай мары,
Ў цяжкіх дэбатах
На вуснах зь пенай,
Ці ў шэрых кратах
І голых сьценах.
Мо' ў захапленьні
Ўсім шэрым сьветам?
А, у імгненьні?
Што, ў сьмерці, ў гэтым?

Алесь Кветка

***

Мова паранена... Мова?!
Непадуладнае існаму Слова?
Хворае нішчаць сумленьне,
Здані гайдаюць збавеньне.

Мова паранена... Мова!
Вечнасьці сьветач-аснова!
Гукі атручаны пылам,
Падаюць мёртвыя з крыкам.

Мова паранена... Мова...
Лёс Беларусі народу...
Крэсьлі жыцьцёвую праўду,
Сіла Сьвітальнага Ранку!

РОЗДУМ

«Мая Крывія» Эдуард Акулін

Дзе Радзіма мая?
Вочы цемра зрабіла сьляпымі.
Дзе Радзіма мая?
Сэрцы б'юцца глухія.
Дзе Народ мой?
Постаць нізка схіляецца долу.
Дзе Народ мой?
Там душа паміраe ў пагоні.
А дзе Памяць мая?
Сьпіць сьляза, што прыйшла пакараць.
А дзе ж Праўда мая?
Вусны скутыя цяжка маўчаць...

Можна сьмерці скарыцца,
Толькі нельга цябе, Беларусь, пазбыцца.

Марыля Лагодзіч

***

Знайсьці на літоўскім асфальце
вочы і пазнаць цябе,
а потым схамянуцца –
твае ж карыя, а гэтыя –
празрыста-шэрыя...

***

Падае сьнег
на дахах гараць сьвечкі
толькі сьнег працягвае падаць
ён Амур
прыдуманы сьвечкамі.

Вера Ліпская

БОЛЬ

Прадалі ўсё, апаганілі,
Забылі песьні пяшчотныя
І мову топчуць нагамі –
Цураюцца маці роднае.

І душы зельлем залітыя –
У іх месца няма любові.
За грошы можна, нібыта,
Набыць барахло любое...

На сэрцы – муры каменныя,
На тварах – зьвярыны выскал...
Калі ж мы ўжо зразумеем,
Што нам да бездані блізка?

ДЗЯДЫ

Памыюць хату, прыадчыняць дзьверы,
Накрыюць стол сьвяточны ля вакна.
Дзядоў чакаюць сёньня на вячэру:
«Дзяды Сьвятыя, прыхадзіце к нам!»
Спраўляюць годна рытуал адвечны
І, крыжам асяняючы чало,
На ўспамін Дзядам паставяць сьвечку –
Няхай прыходзяць на яе сьвятло.
Ад кожнай стравы лыжку адкладаюць
І келіх застаўляюць не пусты.
І ловяць кожны гук – Дзядоў чакаюць.
... Да раньня сёньня будуць тут Дзяды.
Усёй сям'ёй, урачыста і нясьпешна
Малітву ўчыняць каля абразоў...
Дай, Божа, нам у гэтым сьвеце грэшным
Да скону шанаваць сваіх Дзядоў!

А.І.Ляскоў

***

Быў народ, які звыкся ды зжыўся ўжо з рабствам,
З беззаконьнем, бяздушшам, нахабствам,
Ды ўсё трызьніў па больш яшчэ моцнай руцэ.
Жыў народ, бы тапелец у чорнай рацэ.

Уладыка Ўсявышні – нябесны наш Бог
На такія вось жахі ўзірацца ня мог.
І рашыў шматпакутнаму гора-народу
Дараваць Незалежнасьць усё ж ды Свабоду.

Дараваў у прыдатак яшчэ й талісман,
Каб нікому ніколі ня здаўся на зман
(Гэта значыць, пры гэтым паслаў атамана,
Зьберагаў бы каторы народ ад дурману).

Не хапіла, аднак жа, народу развагі
Ды да Божае ласкі належнай павагі.
Усур'ёз ап'янеўшаму рабствам народу
Не дано асядлаць Чараўніцу-Свабоду.

Браніслаў Пяткевіч

КАНТРЫБУЦЫЯ

І ўпоперак, і ўздоўж
Габарытны для аршына
Наш вясковец Косьця Смоўж,
Нам вядомы ўсім мужчына.
Не турбуюць мазалі,
Поту поўныя залозы,
А на твары крамзалі
Ад запіткаў моцнай дозы.
Быў за крадзеж у турме
І адведаў смак баланды,
У сярэдзіне турмэ
Вывучаў ладунак банды.
Тут штодзённы трапны скрад,
Можа нават і ня куцы,
Пад крылом сваіх улад
Зьберажэ ад экзэкуцый.
А калі ж папаўся пан,
Прадавай сваю жаробку,
Ды скідай з плячэй жупан,
Каб пацець у лік адробку.

Валянціна Рашэтнік

ВЕЧНЫ ШЛЯХ

Маленькі сын, пытаўся ты:
«Дзе быў я, калі не было яшчэ мяне з табою?»
Цікавіўся, хто збудаваў масты,
Па якіх крочыў ты з сусьветнага спакою.

Якімі словамі табе мне расказаць
Пра вечнасьць, пра жыцьцё бязь межаў,
Душы тваёй дзе чыстае сьвятло шукаць,
Пра твой бясконцы шлях, якому ты належыш і належаў?

Дарослых мала тых, чый добры сэрца зрок.
Ня ўсё спасьцігнуць могуць, што было, чаму й што будзе.
А тут дзіця сьцяжынкаю душы ступае першы крок,
Ідзе шукаць сябе. Хай нітачку ня згубіць.

І я кажу: «На зорачцы ты быў».
«На зорачцы?» – зірнуў мой сын уважліва ў неба.
«Сядзеў я так ці што рабіў?
Напэўна думаў, што хутчэй дамоў, да мамы трэба.

«А зорачка ж, бы кропка. Ці не зваліўся я адтуль?» –
Занепакоілася раптам хлапчанё малое. –
«Відаць, ляцеў я, мамачка, як куль,
А ты пабачыла, бягом лавіць – і я з табою».

Гісторыі сваёй шчасьлівы склаў канец.
Заплюшчыў вочкі: «З мамай я. Палётаў годзе».
Заснуў. І зноў душою паімчаў у сусьвет –
Да зорачкі на госьці завітаў мой сын Валодзя.

Віктар Чарняўскі

ЖЫВЕ БЕЛАРУСЬ!

Няхай нам гавораць, што бедны
Наш край, ну і што нам з таго.
На ўсё гэта дружна мы плюнем
І скажам: «Жыве Беларусь!»

Хай кажуць, што край наш падобны
Да сьметніцы вялікай. Няхай.
На ўсё гэта дружна мы плюнем
І скажам: «Жыве Беларусь!»

Хай кажуць, што ў лапці абуты.
Хай кажуць, што век у гразі.
На гэта плявалі мы дружна
Жывем мы. Жыве Беларусь!

Народ беларускі цярплівы
Але паспрабуй, зачапі –
Зь зямлёю зраўняем, хай знаюць,
Што наша Жыве Беларусь!

Няхай нам раней было цяжка
Няхай і цяпер цяжкі час
Мы верым – ты ўстанеш, краіна.
Мы верым – Жыве Беларусь.

Шатэ

***

Прысьвячаецца маладафронтаўскім хлопцам.

Я, дзевятнаццацігадовы юнак,
Ведаю сэнс жыцьця:
Бараніць ад фашысцкіх сабак
Край мой і ўзьнімаць зь небыцьця.

Спрадвечную веліч мінулых гадоў,
Спадчыну маіх нескароных дзядоў.

Я не адзін. Са мной
Праўда мая і мільён сяброў.
Нам не зьмірыцца ніколі з хлусьнёй.

Сам па сабе не сканае рэжым,
Ты ж убаку пазіраеш за ім.
Стань побач з намі сказаць сваё «не»
Хамскай уладзе і подлай мане.

Сымон Шаўцоў

ПЕРАД АТАКАЙ

Скончыліся страхі,
Сьмерць нібы адпала...
Наша артылерыя
Фрыцаў абстраляла.
А цяпер ў атаку
Кінулі пяхоту.
Біць фашыстаў злосна
Была ў нас ахвота.
Ды іх аўтаматы
Па нас застрачылі,
Нашае атакі
Фрыцы не зьлюбілі.
У нашым батальёне
Многа мёртвых пала,
Але і ў фашыстаў
Забітых нямала.
Толькі ў другі раз
Залп нашай «Кацюшы»
«Харобрых» фрыцаў
Уцякаць прымусіў.
За імі гналася
Нашая пяхота,
На штыкі падняць
Ў нас была ахвота.
Фрыцы не пасьпелі
Ўзяць сваіх забітых,
Селі на машыны,
З вачэй нашых зьніклі.
У многіх атаках
Была нам падмогай,
Любілі мы «Кацюшу»
На франтавых дарогах.

ПАЭТА ЯК КАБЕТА

Леанід Пранчак. Біблія для каханай: Кн. паэзіі \ Афармл. Дз.Мілаванава. – Менск: Полымя, 1998. — 303 с. – Наклад 1500 ас. ISBN 985-07-0281-8

Тоўсты том паэзіі ў цьвёрдай вокладцы — незвычайная зьява па нашых часах, калі словы «новая кніга паэта» асацыююцца з худой да непрыстойнасьці брашуркай, абы як зьлепленай пры дапамозе дзьвюх аграфак. Саліднасьць тому будзіць найлепшыя спадзяваньні, якія, аднак, прыгасаюць пры больш пільным позірку на вокладку. «Біблія для каханай»? Што гэта значыць? У якім сэнсе біблія? Паэт пераклаў гэтую, як многія лічаць, наймудрэйшую кнігу ўсіх часоў на белмову ў вершаванай форме? Або выклаў свае выпакутаваныя жыцьцём прынцыпы, якія аказаліся настолькі значнымі, што могуць стаць у адзін рад зь Бібліяй і быць настольнай кнігай, параднікам на ўсе выпадкі жыцьця, прычым толькі для яго каханай? Або для любой жанчыны, якую нехта кахае? А для чытача-мужчыны — ужо не? Бянтэжыць малюнак на вокладцы, які ня мае нічога агульнага з назвай — на балотна-зялёным тле нешта сярэдняе паміж сэрцам і чырвонай чарніліцай, і з гэтага нечага вытыркаецца белае пяро...

Пры праглядзе кнігі спадзяваньні, што былі спалахнулі, затухаюць амаль ушчэнт: аказваецца, салідная таўшчыня кнігі — вынік нічога іншага, як вельмі багатай вёрсткі — на кожнай старонцы разьмяшчаецца асобны верш, звычайна гэта 8-12 радкоў, а дзе і 10-20 словаў... Калі адкінуць «паветра», то і выйдзе якраз брашурка. Несучаснае і неэканомнае афармленьне падкрэсліваецца застаўкамі, якія мастацкі рэдактар палічыў за лепшае разьмясьціць перад пачаткам кожнага верша: стылізаваны месячык, стылізаваная хмарка, стылізаваныя птушачкі — і гэтак на кожнай старонцы на працягу першай часткі.

Кніга складаецца з трох частак: вершы пра каханьне, тэксты папулярных эстрадных песень, вершыкі для дзяцей. Найбольш моцная частка — другая. Леанід Пранчак — вядомы паэт-песеньнік, і многія яго песьні ассацыююцца зь лепшымі эстраднымі галасамі Беларусі. Яны сталі, як цяпер модна казаць, знакавымі, іх з задавальненьнем слухалі і слухаюць («Сумны саксафон», «Тэлефон даверу», «Мая непакаханая», «Даставай, Язэп, гармонік», «Каля Чырвонага касьцёла», «Кітайская сьцяна», «Жоўтыя вяргіні», «Пад зоркаю Пагоні» — апошняя, дарэчы, у тэксьце фігуруе пад цнатлівай запазычанай назвай «На ростанях», хаця ў біяграфічнай даведцы стаіць пад сваёй уласнай). Трапна заўважыў паэт, што музыка ажыўляе ягоныя радкі. Бяз гэтай рэанімацыі, на жаль, яны выклікаюць не зусім тое ўражаньне, на якое спадзяваўся аўтар. Такі лёс многіх песенных тэкстаў — шлягеры, быўшы надрукаванымі на паперы, часьцяком выяўляюць сваю бессэнсоўнасьць або другаснасьць. Таму, можа, лепшым варыянтам было выданьне песеньніка Леаніда Пранчака, які уключаў бы ня толькі словы, але й ноты. Такое выданьне, здаецца, магло б разысьціся ўдвая большым накладам, прынесла б карысьць ня толькі рэпутацыі паэта, але й тым усё яшчэ шматлікім прыхільнікам беларускай эстраднай песьні, што былі б скарысталіся ім у рабоце і для адпачынку (варта заўважыць, што наклад «Бібліі...» немалы па нашых часах — 1500 асобнікаў).

Першая частка кнігі, якая называецца «Любові божы дар», не паддаецца камэнтарам. Няма сэнсу папракаць або ухваляць паэта за тое, што ён бачыць сьвет (любоў) так, а не іначай. Мне ягонае бачаньне, прыкладам, падаецца нецікавым, а нехта, можа, будзе рыдаць над яго вершамі сьлязьмі шчасьця... Радкі «Твой позірк хмеліць, як пяршак,» «Каханьня салодкая бражка», як для мяне, ня могуць выклікаць нічога, акрамя іроніі, але прыхільнікам тэорыі чаркі ды скваркі пададуцца сьвежымі і вельмі беларускімі. Паэту, як кабеце, дазваляецца ўсё — гавораць старыя карэктары, і маюць рацыю.

«Дзіцячая» частка троху «не стыкуецца» з рэштай — можа, больш апраўдана было б выдаць яе зноўтакі асобна. Вершыкі для лягапэдычных заняткаў, лічылкі і нескладушкі, канечне, патрэбныя каханай штодня, калі яна выхоўвае дзяцей, але для лепшага ўспрыманьня патрабуюць каляровых малюнкаў, а то дзе-хто з малых можа не зразумець фразаў кшталту «А за мною ходзіць фрак»...

Героі «Брэхкукоцкага летапісу» усё паўтаралі: «У музыцы існуе толькі адзін тон — чысты». Як заўсёды ў Лакснэса, неадназначна і дакладна. Справядліва і для паэзіі.

Наталка Бабіна

РАЗБУРАЛЬНІК СТЭРЭАТЫПАЎ

Беларускі Гістарычны Агляд. Навуковы часопіс. 1998. Том 5. Сшытак 1 (8). — 288 с. — Наклад 299 ас.

Навукова-папулярныя выданьні ствараюць стэрэатыпы, навуковыя іх разбураюць. Часопіс БГА вядомы як зьнішчальнік стэрэатыпаў у гістарычнай навуцы. Апошні нумар выданьня яшчэ больш мацуе такое рэнамэ.

Праца Генадзя Сагановіча абвяргае стэрэатып, што славяне і немцы — ворагі спакон. Дэталёва разглядаюцца адносіны Полацка і немцаў Падзьвіньня ў першай палове XIII ст. Выснова: паміж бакамі пераважалі мірныя дачыненьні, немцы ў тры першыя дзесяцігодзьдзі не парушалі «добрыя старыя правы» полацкіх князёў, а Полацак адпаведна талераваў чужаземцаў. Выснова аўтара добра стасуецца са словамі польскага храніста XIII ст.: маўляў, тэўтоны і славяне добра жывуць супольна, і няма іншых народаў у сьвеце такіх блізкіх і прыязных, як яны. Вынікі дасьледаваньня стасуюцца і з шчырым жаданьнем большасьці сучасных беларусаў жыць зь немцамі ў сяброўстве. Хто яшчэ з гісторыкаў паспрабуе знайсьці гістарычныя падмуркі для гэтага?

Васіль Варонін рэвізуе старую тэзу пра выключнае становішча Полацкага ваяводзтва ў Вялікім Княстве Літоўскім. На яго думку, становішча Полаччыны было не такім ужо асаблівым, каб казаць пра нейкую мясцовую «канстытуцыю» ў выглядзе вялікакняскіх прывілеяў XVI ст. Аднак скрупулёзны аналіз дазволіў выявіць унікальныя архаічныя рысы палітычнага жыцьця ваяводзтва — існаваньне мясцовага «старшыні» — старэйшага з баяраў, дзейнасьць некаторых старажытных прававых нормаў. Усё ж Полаччына ўсё больш уцягвалася ў агульнадзяржаўную сыстэму і хутка страчвала рысы былой незалежнасьці часоў Полацкага княства. Полаччыны робіцца нават шкада, калі прыгадаеш, як у XVII ст. магнаты проста прадавалі адзін аднаму пасаду ваяводы полацкага.

А вось нямецкаму дасьледчыку Гартмуту Русу не ўдалося разьвеяць стэрэатып, які пусьціў глыбокія карані на беларускай зямлі, а менавіта пра незвычайную дакладнасьць, стараннасьць, руплівасьць, дбайнасьць, уважлівасьць, пільнасьць, акуратнасьць і ўедлівасьць нямецкага навукоўца. Менавіта такімі рысамі вызначаецца артыкул пра баранавіцкую СД у 1941—1943 г. Ніякага апраўданьня дзейнасьці гэтай установы ня знойдзена. Зьдзівімся ўсьлед за аўтарам артыкула, як значна абмежаваны колькасна нямецкі акупацыйны пэрсанал у горадзе мог праводзіць сваю палітыку, выкарыстоўваючы у некалькі разоў большыя сілы ўсходніх (беларускіх, літоўскіх, латыскіх) добраахвотнікаў.

Вядомы гісторык мастацтва Васіль Пуцко прыгарчыў беларусам радасьць ад існаваньня цудоўнага помніка мясцовага пісьменства XI ст. — знакамітага Тураўскага эвангельля. На думку дасьледніка, кніга створаная майстрам, так ці інакш зьвязаным з кіеўскім княскім скрыпторыем. Але ў бочку дзёгця дакладзеная й лыжка мёду: «Факт стварэньня кнігі як твору каліграфічнага мастацтва ў самім Тураве калі нельга даказаць, то немагчыма і абвергнуць».

Алесь Смалянчук працягвае знаёміць грамадзтва зь велізарным і найкаштоўнейшым дзёньнікам ліцьвіна Міхала Ромэра за 1911—1945 г. На гэты раз асьветленая не масонская тэматыка, а некаторыя асаблівасьці «нашаніўскага» жыцьця ў Вільні. Друкуецца і сканчэньне ўспамінаў Францішка Кушаля «Спробы арганізацыі Беларускага Войска». Вайсковым справам прысьвечаны артыкул Алеся Сімакова пра «індзейскую вайну» Тадэвуша Касьцюшкі. Пэўна, далёка ня ўсе ведаюць, што славутаму герою прыйшлося ў сваім жыцьці выступаць ня толькі супраць ангельцаў і расейцаў, але й супраць індзейцаў, праўда, апасродкавана.

Генадзь Ластоўскі са Смаленску разглядае расейскія навучальныя праграмы і школьныя падручнікі — як там асьвятляецца гісторыя Беларусі. Звычайна — ніяк, а калі й згадваецца, то па-савецку, калі не сказаць горш. Ціхіх беларусаў расейскія падручнікі не заўважаюць. Гэта, вядома, лепш, чым тое, што пішуць пра ўкраінцаў («добраахвотнае ўзьяднаньне» і г.д.). Артыкул Г.Ластоўскага — спроба разбурыць даўнія стэрэатыпы расейскай гістарыяграфіі. Застаецца пажадаць, каб нехта ў Расеі прачытаў гэты матэрыял.

Адна са сталых тэмаў БГА — навядзеньне мастоў з заходнімі гісторыкамі. Зьмешчанае інтэрвію з швэйцарскім дасьледнікам Штэфанам Родэвальдам, які цікавіцца сярэднявечным Полацкам (даецца тлумачэньне, чаму), і пераклады працаў нямецкага гісторыка Тэадора Шнайдэра «Роля гістарычнай сьвядомасьці ў палітыцы» і «Сіла гісторыі» Джойс Эплбай (ЗША). Гэтак часопіс спадзяецца ўзбагаціць мэтадалёгію беларускай гістарычнай навукі — ведаем, што такія высілкі ня гінуць.

Валеры Пазьнякоў

НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

Агледзіны: Вершы / Уклад. і прадмова А.Бакача; Маст. Ю.Хілько. — Менск: Беларускі кнігазбор, 1998. — 224 с.: іл. — Наклад 1400 ас. ISBN 985-6318-29-7

Агляд (Правы чалавека ў Беларусі, 1998 г.). — Менск: Праваабарончы Цэнтар «Вясна-96», 1999. — 47 с.

Адамчык В. Разьвітальная аповесьць: Аповесьць, апавяданьні, дзёньнікі. — Менск: Мастацкая літаратура, 1999. — 448 с. — Наклад 1500 ас. ISBN 985-02-0231-9

Арфаграфічны слоўнік: Для пачатк. кл. / Уклад. К.Кабызева, М.Казьбярук, Т.Саўрыцкая і інш. — 6-е выд. — Менск: Народная асьвета, 1999. — 160 с. — Наклад 5000 ас. ISBN 985-03-0917-2

Беларуская камэдыя XX ст.: Для сярэд. і ст. шк. узросту / Маст. А.Жакевіч. — Менск: Вышэйшая школа, 1998. — 384 с.: іл. — (Школьная бібліятэка). — Наклад 27300 ас. ISBN 985-06-0403-4

Бічэль Д. Снапок: Выбраныя вершы. — Менск: Мастацкая ліатаратура, 1999. — 446 с. — Наклад 1500 ас. ISBN 985-02-0239-4

Веткаўскі музэй народнай творчасьці / На бел., рас., ангельск. мовах. 2-е выд.. — Менск: Беларусь, 1999. — 119 с.: іл. — Наклад 5000 ас. ISBN 985-01-0218-7

Гаўраш Н. Слоўнік эпітэтаў беларускай мовы. — Менск: Вышэйшая школа, 1998. — 603 с. — Наклад 5000 ас. ISBN 985-06-0374-7

Гісторыя беларускай літаратуры: XIX — пач. XX ст.: Падручнік для філял. фак. пэд. ВНУ / І.Багдановіч, У.Гніламёдаў, Л.Голубева і інш.; Пад агульн. рэд. М.Лазарука, А.Семяновіча. — 2-е выд., дапрац. — Менск: Вышэйшая школа, 1998. — 560 с. — Наклад 7000 ас. ISBN 985-06-0304-6

Грым Браты. Брэмэнскія музыкі: Казкі: Для малод. шк. веку / Пер. на бел. мову; Маст. Ю.Цярэшчанка. — Менск: Юнацтва, 1999. — 302 с.: іл. — (Б-ка замежнай дзіцячай літаратуры). — Наклад 3000 ас. ISBN 985-05-0108-1

Жывіца: Вершы, апавяданьні, казкі пра дзяцей і для дзяцей / Уклад. І.Імпель; Маст. В.Сакалоў. — Менск: Юнацтва, 1999. — 351 с. — (Школьная бібліятэка) — Наклад 34700 ас. ISBN 985-05-0268-1

Кантакты і дыялёгі. Інфармацыйна-аналітычны і культуралягічны бюлетэнь Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў і Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі. № 1 (37). Студзень, 1999. — 55 с.: іл. — Наклад 299 ас.

Карызна У. Іграй, жалейка, не змаўкай: Вершы, казкі, паэмы, загадкі, небыліцы: Для дашк. і мал. шк. веку / Маст. Т.Беразенская. — Менск: Юнацтва, 1998. — 267 с.: іл. — Наклад 5000 ас. ISBN 985-05-0144-8

Кулiковiч У. Беларускі правапіс: правілы, заданьні, кантрольныя работы. — Менск: «Завігар», 1998. — 280 с. — Наклад 11000 ас. ISBN 985-6187-05-3

Крыніца. № 12 (49), 1998. — 112 с.: іл. — Наклад 1300 ас. ISSN 0234—1387

Левановіч Л. Ларыса, альбо прыгоды аўтамабіліста: Аповесьць, п'есы. — Менск: Мастацкая літаратура, 1998. — 256 с. — Наклад 1400 ас. ISBN 985-02-0341-2

Лук'янаў М. І цемра адступіла...: Аповесьці, апавяданьне. — Менск: Мастацкая літаратура, 1999. — 254 с. — Наклад 1000 ас. ISBN 985-02-0336-6

Мазго У. Сьмехапад: Вершы, песьні, казкі, загадкі: Для мал. шк. веку / Маст. Т.Беразенская. — Менск: Юнацтва, 1999. — 127 с.: іл. — Наклад 3000 ас. ISBN 985-05-0193-6

Навуменка І. Хатняе зайчанё: Апавяданьні: Для малодш. шк. веку / Маст. Т.Сянькоўскі. — Менск: Юнацтва, 1998. — 175 с.: іл. — Наклад 3000 ас. ISBN 985-05-0227-4

Права на волю. Бюлетэнь Праваабарончага Цэнтру «Вясна-96». № 1 (25), № 2 (26), 1999. — Наклад 299 ас.

Пракаповіч І. Шляхі наканаванага бязьмежжа: Вершы / Прадм. К.Камейшы. — Менск: Мастацкая літаратура, 1999. — 111 с. — (Першая кніга паэта). — Наклад 1000 ас. ISBN 985-02-0246-7

Сіманёнак Л. Разгорнуты сусьвет: Вершы. — Менск: Мастацкая літаратура, 1999. — 95 с. — (Дэбют). — Наклад 1000 ас. ISBN 985-02-0238-6

Старычонак В. Беларуская літаратура: ад А да Я. У дапамогу абітурыентам, школьнікам. — Менск: Вышэйшая школа, 1998. — 524 с. — Наклад 1000 ас. ISBN 985-06-0454-9

Хрэстаматыя па гісторыі беларускага тэатру і драматургіі: У 3 т. Т. 2: 20-50-я гады XX ст. / Беларускі ўнівэрсытэт культуры; Уклад., рэд. тэкстаў, уступ. арт. і камэнт. А.Сабалеўскага. — 2-е выд., пашыр. і ўдаклад. — Менск: Беларуская навука, 1998. — 574 с. — Наклад 700 ас. ISBN 985-08-0265-0

Шарэцкі С. Трагедыя Беларусі, або што такое сапраўдны лукашызм. — Менск, 1998. — 96 с.

Юхо Я. Гісторыяграфія гісторыі дзяржавы і права фэадальнай Беларусі. (Сэрыя: «Гісторыя Бацькаўшчыны», дадатак да часопіса «Права і эканоміка»). — Менск, 1999. — 104 с. — Наклад 250 ас. ISBN 985-442-028-2

Artymowicz N. Łagodny czas / Уклад. і апрацоўка Т.Карабовіча. — Люблін, 1998. — 113 с. ISBN 83-86620-28-5

Czasopis. Białystok — Krynki, 3/1999. ISSN 1230-1876

Книжное дело, пресса Беларуси: Адрасна-тэлеф. даведнік (зьвесткі на 1.12.98 г.) / Нац. кніжная палата Беларусі. — Менск: НКП Беларусі: ПКООО «Макбел», 19987 — 736 с. ISBN 985-6020-17-4 ISBN 985-6347-68-8

КАЗКІ ЖЫЦЬЦЯ

СЛОЎНІК ПАНЯЦЬЦЯЎ

§1. ПРА ЗЕМЛЯНЫЯ РАБОТЫ.

Мая жонка, калі нешта здараецца ў кватэры – няма гарачаі вады, прапала сьвятло, ня грэюць батарэі – часта звоніць у службы, якія адказваюць за падтрыманьне жыцьцядзейнасьці нашага гораду. Там ёй даюць адказы, якія часам ня могуць не прыцягваць увагі. Калі ў доме ізноў прапала цяпло, ёй адказалі так: «Вы знаеце, трубы намоклі, бо яны ляжаць у халоднай вадзе».

Пасьля вяртаньня з-за мяжы Менск сустракае цябе пэўнымі канстантамі. Ня тое, каб ты меў пачуцьцё, што праваліўся ў глыбокую яму, проста галаву пачынае сьвідраваць думка – нешта тут ня так, нешта тут уладкавана іначай. І гэтая інакшасьць на зямлі, відаць, — працяг інакшасьці ў тым, што ў кнігах называюць мысьленьнем. Выходзячы зь цягніка ці аўтобуса, крочачы па трапе самалёту, ты становісься сьведкам земляных работаў.

Нельга сказаць, што я жыву ці калі-небудзь жыў у цэнтры. Таму дарога ў цэнтар, падарожжа ў цэнтар заўсёды для мяне акт надзвычайнага значаньня. Так праходзіць маё жыцьцё – у перамяшчэньні зь месца на месца. Колькі я сябе помню, яно ніколі не было такім ужо бясхмарным – дзе-нідзе ўзьнікалі перашкоды: транспартны сродак, у чэраве якога знаходзіўся я, запавольваўся, кіроўца пахмурнеў, яму даводзілася схаць у аб'езд, ціснуць на тармазы, калі наперадзе была выбоіна, а то й проста заяўляць, што, напрыклад, «аўтобус далей ня пойдзе».

Варта задумацца, адкуль зьяўляюцца прычыны земляных работаў – усе гэтыя канавы, выбоіны, калдобіны, аб'езды і г.д. Кім яны праводзяцца? Што кіруе імі? Наступствам чаго яны ёсьць? Ці ня сьледзтвам тупікоў і ўхабаў нашай сьвядомасьці, яе несупынных скрыўленьняў аж да страты элемэнтарнай жыцьцёвай лёгікі? Замоўца земляных работаў невядомы: іх ініцыююць не камунальныя службы, адказныя за добраўладкаваньне гораду, а ананімны геній дэструкцыі.

З надыходам цёмнай пары сутак сытуацыя на дарогах кардынальна зьмяняецца: любы нявыверааны рух можа быць небясьпечным для жыцьця. Школьнікі й рыбакі падаюць у адкрытыя каналізацыйныя люкі, бабулькі, ідучы з харчовых рынкаў, зьбіваюцца з курсу, аўтамабілі заносіць у кювэт з прычыны недастатковага дагляду дарожнага палатна, цягнікі зьніжаюць хуткасьць у выніку тэрміновых рамонтных работаў. І ніяк не дайсьці да Беларусі.

Я ня надта разьбіраюся ў дакладных навуках, але выходзіць такая вось геамэтрыя: каб з пункту А трапіць у пункт В, трэба перасячы пункт С. Або яшчэ горш: кіруючыся з пункту А ў пункт В, я неўспадзеўкі для сябе трапляю ў пункт С. Замест таго каб хадзіць па зямлі, мы коўзаемся па паверхні Палацаў лёднага спорту.

І што асабліва характэрна: нашы людзі прывыклі да гэтакага асяродзьдзя пражываньня. Ці, можа, гэта асяродзьдзе пражываньня прызвычаіла іх да сябе?

Валерка Булгакаў

ГОМЕЛЬСКІЯ ФРАГМЭНТЫ

13.12, ндз. Учора выпадкова натрапіў на цікавую перадачу расейскай тэлевізіі — гэткую гульню са словамі. Сутнасьць яе была такою: да назоўніка, які абвяшчаўся вядучым, трэ' было прыбавіць прыметнік, які прыйдзе на памяць, і пры гэтым пастарацца назваць такі, які найбольш часта прысутнічаў сярод адказаў выпадковых мінакоў, якіх карэспандэнт гэнай перадачы адмыслова распытваў перад тым у расейскай сталіцы.

Адным са словаў, да якога патрэбна было назваць прыметнік, было слова «дзеці». «Дзеці Чарнобылю» — гэта ж першае, другое, трэцяе і ўсякае, калі заходзіць аб дзецях, — падумаў я, — навошта было й задаваць такое няшматварыянтнае пытаньне?.. Адказы ж маскоўцаў былі наступнымі. На першым месцы — «Дзеці капітана Гранта» — 19 адказаў са ста. Другое месца — 18 адказаў — «Дзеці лейтэнанта Шміта». Былі таксама «Дзеці Арбату» — 10 адказаў, пятае месца. Дзяцей Чарнобылю не было зусім.

20.12, ндз. Чым больш у нас разводзіцца «боговерующих», тым гучнейшымі робяцца ўдары па палавіках, выбіваных у нядзелі.

1.2, пн. Адзін чалавек, якога я лічыў некалі за цалкам прыстойнага, сказаў неяк у кампаніі абыякавым тонам: «Скарэй за ўсё ў этым гаду аб'едзіняцца»... Магчыма, каб яму сказалі, што ў «этым гаду» яму выдаляць печань, ён бы занэрваваўся больш. Але ж у гэтым выпадку было б простае фізычнае вынішчэньне.

9.2, аўт. Калі аншлюс усё ж станецца непазьбежным, я лічу, што сьведамыя беларусы — а іх ня менш за мільён толькі дарослых — маюць права патрабаваць ад Расеі кавалак тэрыторыі, па плошчы адпаведнай такой частцы ад Беларусі, якую яны складаюць ад усяго насельніцтва краіны. Гэта ніяк ня менш за тэрыторыю, якую займае цяпер, напрыклад, Калінінградзкая вобласьць (ці губэрня?). На такой тэрыторыі беларусы змаглі б захаваць сваю дзяржаўнасьць, разьвіваць сваю культуру, мець свой Герб, свой Сьцяг і Гімн. Урэшце, такое вырашэньне праблемы змагло б захаваць названых людзей ад простага фізычнага вынішчэньня, непазьбежнага ў расейскім вар'яцтве.

Беларуская дзяржава, упэўнены, страціўшы ўсю сваю цяперашнюю тэрыторыю, дасягнула б вялікага эканамічнага росту, бо мела б дасьведчанае кіраўніцтва і працавітых малапітушчых высокаінтэлекуальных грамадзянаў. У эканаміцы гэта быў бы эўрапейскі Тайвань. Разбагацеўшы, выкупілі б у Расеі сваю спрадвечную тэрыторыю.

***

...Калінінградзкую вобласьць, былы Каралявец, затым Кёнігзбэрг, у час вайны адбіваў у немцаў мой бацька. Яны ішлі ў дзень па 2 кілямэтры, і кожныя два тыдні станавіліся на перафармаваньне — а гэта азначала, што іхная частка страціла палову асабовага складу. За тры месяцы баёў вераемнасьць загінуць складала 63/64. Загінуў і іхны камандзір, генэрал арміі Чарняхоўскі, — рэдкі выпадак для вайны, калі камандуючы фронтам гіне на полі бою, а не ў сутарэньнях НКВД. У гэтым фронце было шмат беларусаў.

... Цікава, дзе быў і чым займаўся ў часе вайны бацька цяперашняга «беларуса нумар адзін»?

16.2, аўт. Неяк падзяліўся я з адным чалавекам думкай, вычытанай у Стэфана Вэйса — аўтара, лепшага за Карнэгі, але чамусьці шырока ня знанага. Дык вось, гэты мудры аўтар піша, што трэба траціць на свае патрэбы ня ўсе свае даходы за нейкі пэрыяд, а толькі 2/3 ад гэнай сумы. Я й пераказаў гэную думку аднаму свайму знаёмцу. А той ажно скрывіўся. Яму ўсяго ягонага заробку нестае, ня тое што нейкай яго часткі... Але ж няма такой малой велічыні, ад якое немагчыма было б узяць 2/3...

18.2, чц. Жыве чалавек, і здаецца яму, што навучаецца ён у сваім жыцьці то аднаму, то другому. А па сутнасьці, з гадамі набывае толькі адно ўменьне — уменьне цярпець.

Аляксандар Урбановіч

ГОМЕЛЬСКІ ДЗЁНЬНІК

Тым днём я, як добрасумленны студыёз, крыпацеў над бясконцымі альбомамі эўрапейскага жывапісу, а мае alter eg-і бунтавалі кроў і, што называецца, ад'ядалі душу. За вакном усчалася сьнежная кудаса, нібыта старажытная Сарматыя вянулася ў наш край. Колькі разоў бліснула белая маланка, падкрэсьліваючы неардынарнасьць сытуацыі. Тым днём я дазнаўся, што над родным Гомлем кружлялі НЛА. Як казалі людзі, НЛА бачылі над Сяльмашам, Прудком і 17-м мікрараёнам. Нехта бажыўся, што «талеркі» праляталі ў яго над саменькім дахам, мала не пазрываўшы шыфэр. Яшчэ нехта наагул ледзьве не ў кантакт зь іншаплянэтнікамі ўваходзіў. Некаторыя ж людзі палічылі гэтую нябесную праяву за знак перад новым выбухам на Чарнобылі. Я ж сам так нічога й не пабачыў, а пішу з пагалосак.

***

Стоячы ў чарзе да вакна № 6 пашпартнага стала, я пачуў наперадзе небеларускую вымову. Перада мной стаяла сярэдняга веку пара – мужчына і жанчына. Ён, зьехаўшы ў 80-х гадох у Расею і праслужыўшы тамака 12 гадоў на флёце, па вяртаньні ў Беларусь займеў пэўныя праблемы з атрыманьнем грамадзянства. З гэтае нагоды ён абураецца і лаецца сваім картаватым, але «чекающим» голасам. Расчараваньне. Ён жа лічыў, абпіўшыся прапагандысцкім кісялём, што ППРБ навёў у Беларусі капітальны «вельмі жалезны» парадак, што ніякіх завадаў з грамадзянства ў «союзной» дзяржаве паўстаць проста ня можа. Першая ж цяжкасьць дала яму дзярнова-падзолістую глебу для расейскага мату.

***

Даўна не даводзілася спазіраць новых палітычных графіці, пагатоў амаль у цэнтры гораду. Але вось нехта хупавы расстараўся. Праўда, хто? Можна яшчэ зразумець надпіс «Лукавого под суд» на плоце слодычавай фабрыкі «Спартак». А вось выбрык «Лукавый – жид» на адным з дамоў на вуліцы Савецкай кідае ў цянёты непрыемных асацыяцыяў. На што разьлічваў аўтар? Няхай глумацкі каўпак юдафобіі носіць той расейскі генэрал Макашоў, а не беларускае падпольле. Зрэшты й надпісы маглі б быць больш канкрэтнымі і без мэтафар кшталту «лукавого».

«Я – беларус», – быў вывеў нехта нітрафарбай гады два таму на той самай вуліцы. Ці за два гады мы зьмяніліся?

***

Провады зімы. Кожнае агульнагарадзкое сьвятаператвараецца мала не ў вакханалію. «Нудна ў горадзе. Не цікава, а млосна. Адна п'янота навокал», – скардзілася знаёмая дзевяціклясьніца, хаця й сама была пад малюсенькай чарачкай. На плошчах для «масавых гуляньняў» зьбіраецца столькі народу... Сэнс старажытнага сьвята прафануецца. Дзея нагадвае вялізную карчму-манапольку. «Тут п'юць і гуляюць, і паляць цыгаркі», – гаварыў пра карчму Ул. Сыракомля. Карчма ж у мінулым стагодзьдзі служыла расейскаму ўраду сродкам занядбаньня духовасьці беларусаў. Праз палітыку спойваньня імпэрскія ўлады адвучалі нашых продкаў думаць аб сэнсе зямнога быцьця, аб якіх-хаця памкненьнях да свабоды. Вось жа, канец XX ст., а радасьцяй для многіх беларусаў стаецца калектыўнае спажываньне водачкі і бліноў на цэнтральных вуліцах з санкцыі ўладаў. Я не магу зразумець сваіх суайчыньнікаў, якія дзень выяжджалі з сваіх «спальных мікрараёнаў» у цэнтар адно дзеля таго, каб пакаштаваць той гарэлкі і тых яўна ня хатніх бліноў. Што гэта за сіла іх цягне зьбірацца, салідарызавацца? Але сьвята мінае, застаецца сьмецьце, балесныя галовы і жаданьне схавацца ад згадак пра ўчора. А ў панядзелак беларусам ужо не да салідарнасьці.

***

Дні Мовы прамінаюць па-рознаму. Нешта атрымліваецца, нешта не атрымліваецца. За тое, што не атрымліваецца, бяру рэванш у звычайныя дні. Сапраўды, вельмі многа залежыць ад нутранога настрою. Іншы раз наагул ні з кім ня хочацца размаўляць. Ні па-беларуску, ні па-расейску, ні па-нямецку. Проста хочацца маўчаць. Іншым разам ахінае такі гарэзьлівы настрой, што шчабечаш толькі па-беларуску. Ня стану хаваць, што хацеў бы размаўляць па-беларуску заўжды, але чамусьці ніяк гэта зрабіць не магу. Адна мая сяброўка, ня вельмі блізкая да беларушчыны, нават ушчувала мяне з гэтай нагоды. Калі б жа ўсе гэтак ушчувалі!

Сяргей Балаханаў, 4.3.1999



Генрых Бёль

Сем гадоў таму я наведаў выдаўца аднаго вядомага часопіса, каб прапанаваць яму свой рукапіс; калі мяне запрасілі, я падаў яму рукапіс — гэта было апавяданьне — але ён нават не зірнуў на яго, паклаў яго на адзін са стосаў, якімі быў завалены ягоны пісьмовы стол, загадаў сакратарцы падаць мне філіжанку кавы, сам выпіў шклянку вады і сказаў: «Я прачытаю ваш рукапіс, але пазьней, можа, праз пару месяцаў — бачыце, колькі тут усяго ляжыць. Але адкажыце мне на адно пытаньне, на якое ніхто з вашых папярэднікаў — сёньня раніцай у мяне перабывала ўжо сямёра — ня здолеў даць здавальняльнага адказу: чаму так шмат геніяў і толькі так мала мэнэджэраў майго ўзроўню. Я люблю часопіс, які раблю, але я б не памёр, калі б мне прывялося вярнуцца да майго былога занятку: я быў кіраўніком рэклямнага аддзелу на фабрыцы лёзаў да галеньня і адначасова пісаў тэатральную крытыку, бо гэта мне падабалася. Вы таксама недзе стала працуеце?»

На гэты момант я супрацоўнік адной статыстычнай установы.

І вы ненавідзіце гэты занятак, лічыце, што ён зьневажае вас?

Не, сказаў я, я не ненавіджу і ні ў якім разе не

Адам Глёбус

КУРОРТНІКІ Й КАРЛАВАРЦЫ

Падарожнае апавяданьне

Хто толькі ні наведваўся ў Карлавы Вары! У маленькім даведніку сьпіс самых знакамітых гасьцей займае тры старонкі дробным шрыфтам. Ёсьць у тым пераліку й Адольф Гітлер, пазначаны як нямецкі дзяржаўны дзяяч. З таго ж «путеводителя» можна даведацца: «4 октября 1938 г. с балкона театра к сфанатизированному немецкому населению, говорил государственный лидер Адольф Гитлер. Карловарские жители не предпологали, что за не целый год Гитлер развернет вторую мировую войну, которая принесет людям мучения». Што вайна прыносіць пакуты, дык гэта вельмі дакладна заўважана. Карацей, фашыст Гітлер выступіў перад сфанатызаваным натоўпам і зьехаў, а пазьней... «В октябре 1938 года, после посещения государственного лидера Адольфа Гитлера Карловых Вар, город был захвачен немецкими войсками, и как неотделимая часть, так называемой Судетской жупы, присоединен к так называемой «Третьей империи». Незадолго перед тем покинули город последние чехи». Вось табе й асоба ў гісторыі аднаго асобна пазначанага курорту. Толькі для таварыша й сацыяліста Гітлера паход на Карлавы Вары скончыўся наступным чынам... «В 1945—1946 г.г. немецкое население Карловых Вар на основании Поступимского договора было выселено из своих домов. (...) Чехи здесь постепенно находили свой новый дом». І знайшлі, і ня толькі чэхі. На карлаварскіх вуліцах шмат такіх любімых Гітлерам цыганскіх дзяцей, чый спакой ахоўваюць чэшскія паліцыянты.

Ня веру ў статыстыку — можа падмануць, як і тэорыя верагоднасьці, згодна якой ты ня можаш сустрэць мужчынаў у сто разоў часьцей, чым жанчынаў, а трапляеш у войска і сустракаеш. Ня ведаю й не хачу ведаць, што кажа статыстыка, а я заўважыў, як паболела ва ўсім сьвеце жанчынаў у вайсковай ды паліцыянцкай форме. А таму нічога адметнага, на першы погляд, у карлаварскай паліцыянтцы не было. Ну, маленькая, круглая, у акулярах на чырвоным швейкаўскім носе. А вось павярнулася яна да мяне задам і зьдзівіла: з-пад фуражкі да самае дупы вісела тоўстая, сьветлая, сапраўды арыйская каса. Бачыў розных паліцыянтаў: з устаўнымі зубамі, з бакенбардамі, з устойлівам пахам самагоннага перагару, а з шыкоўнай касой да шырокіх клубоў сустрэў упершыню. Таму вырашыў пасачыць за паліцыянткай, паглядзець, як яна нясе службу на берагах неспакойнай рэчкі Teply. Праз некалькі хвілінаў я даведаўся, адкуль бярэцца такі прывабны памер клубоў. Паліцыянтка зайшла ў крамку Delicates, дзе з апэтытам схрумала рагалік з каваю. Пасьля харчоўкі карлаварка стала на ганку й агледзела навакольле. Парушальнікі парадку, як ні дзіўна, знайшліся. Статак зялёнагаловых качараў выйшаў на праезную частку вуліцы Stara Louka. Паліцыянтка замахала на пташак дручком і словамі «kyš-kyš-kyš» загнала пярнатых у рэчку. Зрабілася нецікава, і я сышоў шукаць іншыя аб'екты для назіраньня. Аб'ектаў хапае, узяць хоць бы курортнікаў.

Гасьцей-курортнікаў у Карлавых Варах процьма... Казахі на кожным кроку. Немцаў, як восаў над кавуном. Расейцамі пазабіваныя ўсе крамы, крамкі, шопы й шопікі. Астатніх менш, але, пашукаўшы, папрыглядаўшыся, знойдзеш каго заўгодна. Большасьць дамкоў пазавешаны шыльдамі. Тут жыў... Тут быў... Тут працаваў... Каб каго зь вялікіх і знакамітых, кшталту Гітлера, не прапусьціць, давядзецца зьвярнуцца ў «путеводитель». У мяне закралася думка: гэты танны даведнік пісаў Карэл Чапек. Ну хто, акрамя яго, мог скласьці наступны радок: «1995 — Г.Доллобриджид — актриса фильма». А наступнае: «1974 — Д.Албридге — английский писатель». Не, усё ж Чапек свайго калегу Джэймса Олдрыджа так бы, не да спазнаньня, не перакручваў. Чапек быў гуманістам, жартаваў, але ня зьдзекваўся зь людзей. А «путеводитель» зьдзекуецца. Д.Ф.Ойстрах у ім — «гуслист». Цікава, ці ўмеў Ойстрах граць на гусьлях-самагудах, можа й граў, хто яго ведае. Можа й «Хачатуриан — арменский композитор» таксама мог па-сапраўднаму сыграць партыйную музыку ў стылі сацыялістычнага рэалізму на тых жа самагудах. А вось у якіх норах жыў «норский композитор Э.Григ», мне цяжка адказаць. Але самае цяжкае, як заўсёды, напрадзе. Хто такая «Г.Касанова — литературовед»? Даю падказку: «И искатель приключений». Цяжка? Даю другую падказку: наведала Карлавы Вары ў 1785 годзе. Правільна. Гэта ён — вялікі й непараўнальны сэкс-сымбаль усіх часоў і народаў — Казанова. Мяркую, трэба спыніцца, бо ў Карлавых Варах былі ці пабудуць усе, хто здатны яшчэ трымаць у руках кубак зь мінэральнай вадой. Нават жыхары заакіянскай Амэрыкі.

Пайшоў я ў саўну й нарваўся на амэрыканку. Яна важыла цэнтнэры паўтара. Ёсьцека такія амэрыканкі, што ходзяць выключна ў спартовых строях — іншыя апранахі ім нязручныя. Вядома, у лазьні ніякіх апранах, акрамя бікіні, на целясах не вісела. Сала, скура, складкі – сапраўдная прынцэса з таўстуной. Тоўстая жанчына з табою ў лазьні ці неверагодна таўсьцізная, а ўсё адно пачуваесься няёмка. А калі яна маладая, сарамлівая й безнадзейна зарослая тлушчам... Ніякавата, скажу табе, робіцца. Самым нечаканым выйсьцем зь няёмкасьці было тое, што яна разгарнула ручнік і дастала зь яго маленечкі касэтны магнітафон, запхала ў вушы дынамікі й запусьціла мутарна-салодкі шлягерок. Нічога не заставалася, як сабраць у кулак усю мужчынскую волю й перасядзець таўстуную ў гарачым паветры. Ад беспамернай амэрыканкі я пачуў толькі адно кароценькае «бай», калі яна выходзіла за шкляныя дзьверы. А яна ад мяне нічога не пачула. Што можна расказаць дзяўчыне, якая слухае магнітафон у лазьні праз слухаўкі? Ні-чо-га. Лепш я раскажу табе пра тыповага курортніка.

У Карлавых Варах курортнік – стары, хворы, спакойны, заможны й флегматычны. Колькасьць выпітай мінэральнай вады прымушае

Працяг на старонцы 14.

РЫЗЫКА ПІСЬМЕНСТВА

лічу, што ён мяне зьневажае; праз гэты занятак я зарабляю на пражыцьцё — хоць і хутчэй мала, чымся шмат — для жонкі і дзяцей.

Але вы адчуваеце патрэбу ехаць кудысьці з гэтымі пакамечанымі, кепска надрукаванымі рукапісамі ці дасылаць іх поштаю, і, нават калі ўсе яны вяртаюцца, несупынна пісаць новыя?

Так, сказаў я.

А чаму вы гэта робіце? Добра разважце ваш адказ, бо ён заразом будзе адказам на маё першае пытаньне.

Мне яшчэ ніколі не задавалі такога пытаньня, і я разважаў; рэдактар жа ўчытаўся ў маё апавяданьне.

Я ня маю, сказаў я нарэшце, ня маю іншага выбару. Рэдактар узьняў вочы ад рукапісу, падняў бровы і сказаў: гэта гучныя словы, тое самае я аднойчы пачуў ад чалавека, які абрабаваў банк; судзьдзя спытаўся ў яго, чаму ён сплянаваў ды зьдзейсьніў рабунак. У мяне не было іншага выбару, сказаў ён.

Мусіць, ён меў рацыю, сказаў я, і гэта не выключае, што я таксама маю рацыю.

Рэдактар змоўчаў і вярнуўся да майго апавяданьня; яно складалася з чатырох друкаваных на машынцы старонак, і тыя дзесяць хвілінаў, якія спатрэбіліся яму для чытаньня, я думаў, ці не было ў мяне лепшага адказу на ягонае пытаньне, але не знаходзіў нічога іншага; я піў тую каву, паліў цыгарэту. Хай бы ён лепш чытаў апавяданьне не ў маёй прысутнасьці! Нарэшце ён скончыў, а я якраз запаліў быў другую цыгарэту.

Ваш адказ на маё пытаньне мне спадабаўся, але вашае апавяданьне мне не падабаецца. У вас ёсьць яшчэ?

Так, сказаў я, і зь пяці рукапісаў, якія яшчэ былі ў маёй сумцы, выбраў адзін кароткі й сунуў яму.

Я мо' лепей пакуль выйду, сказаў я.

Не, сказаў ён, лепей, калі вы застанецеся.

Другое апавяданьне было карацейшае, толькі тры друкаваныя старонкі – я пасьпеў адно дапаліць цыгарэту. «Гэтае апавяданьне добрае, — сказаў рэдактар, — яно настолькі добрае, што я не магу даць веры, што абодва напісаныя адной і той жа рукой». Але гэта так, сказаў я, яны абодва напісаныя мной. Гэтага я не магу зразумець, сказаў рэдактар, гэта проста не да веры: першае — прэтэнцыйны і таму асабліва заганны ўзор рэлігійнага кічу, а другое — у мяне няма ніякай падставы лісьлівіць – другое, па-мойму, бліскучае. Растлумачце мне гэта!

Я ня мог яму гэта растлумачыць, і я да сёньня не знайшоў тлумачэньня гэтаму. Насамрэч, мне падаецца, што пісьменьніка цалкам можна параўнаць з рабаўнікам банку, які прыкладае невымоўныя намаганьні, каб сплянаваць рабунак, які ў сьмяротнай самоце, уначы, высаджвае сэйф, ня ведаючы, колькі грошай, колькі золата й каштоўных камянёў ён там знойдзе: ён ставіць на карту дваццаць гадоў турмы, высылку, зону, ня ведаючы, які куш сарве. Пісьменьнікі й паэты, на маю думку, пачынаючы новую працу, кожны раз ставяць на карту ўсё, што яны напісалі дагэтуль; рызыка, што сэйф акажацца пустым, што цябе схопяць і пазбавяць плёну ўсіх папярэдніх узломаў. Вядома, аўтара вызначае тое, што ён — адзіны: са сваім стылем, з вадзяным знакам, які розьніць яго ад усіх іншых: са сваёй пячаткай майстра; але як толькі іншыя, ягоныя чытачы, ягоныя крытыкі, выдаюць яму гэты сыгнэт, пачынаецца сапраўднае выпрабаваньне, бо тады пісаць не заўсёды значыць «ня мець іншага выбару», пісьменства можа ператварыцца ў голую руціну. Праўда, руціну зь пячаткай майстра. Як для місьцюка ці баксэра, што дасягнулі ўжо пэўнага посьпеху на сваёй ніве, кожны новы рабунак, кожны новы бой стасцца больш зацятым, больш небясьпечным за папярэдні — бо нявіннасьць ужо страчаная, і яе заступіла веданьне, — так мусіла б быць і для пісьменьніка, і я ўпэўнены: шмат для каго так і ёсьць, дарма што пасьведчаньне майстра зь пячаткай гільдыі вісіць у іхных бібліятэках. У мастака багата магчымасьцяў, толькі адной няма: адпачынку. Выразу «вольны ад працы час» — вялікаму й чалавечнаму выразу – ён можа толькі зайздросьціць. Такі час яму невядомы; хіба што калі «ён вычарпае свой дар», назаўсёды ці на пэўны час, і вырашыць заакцэптаваць гэты факт; але тады ён перастане быць мастаком. Праўда, уявіць сабе гэтага я не магу; неяк у адной літаратурнай рэцэнзіі, аўтара якой, я, на жаль, забыўся, я прачытаў: нельга быць трохі цяжарнай – і, мне здаецца, нельга быць трохі мастаком.

«Ня маю іншага выбару» — гэта гучныя словы, але на пытаньне, чаму я пішу, я дагэтуль не знайшоў лепшага адказу: мастацтва — для таго, хто яго стварае, і для таго, хто яго ўспрымае, — адна зь нешматлікіх магчымасьцяў жыць, адчуваць жыцьцё. Гэтаксама як нараджэньне, сьмерць і ўсё, што палягае паміж імі, ня можа зрабіцца руцінай, так і мастацтва ня можа. Праўда, ёсьць людзі, што робяць са свайго жыцьця руціну ды жывуць ёй; толькі: яны ўжо не жывуць. Ёсьць мастакі, майстры, што сталіся папросту руцінэрамі, але яны – не прызнаючыся ў гэтым сабе й іншым – перасталі быць мастакамі. Не тады перастаеш быць мастаком, калі робіш штосьці кепскае, а ў той момант, калі пачынаеш лякацца ўсякае рызыкі.

1956

Пераклаў зь нямецкай Алесь Пяткевіч

Восіп Мандэльштам

***

Маё жыцьцё сухое
Агонь амаль даеў,
Ня каменю затое,
А дрэву ўзношу сьпеў.

І лёгка ўсё і груба.
І з аднаго бруска
І сарцавіна дуба,
І вёслы рыбака.

Мясіце палям плечы,
Крычыце, малаткі,
Пра рай драўляны – рэчы
Там лёгкія такі.

***

Ні пра што ня трэба гаварыць,
І ня варта хоць чаму вучыць,

І самоце верыць, як сьпярша,
Цёмная зьвярыная душа:

Хоць чаму ня хоча навучыць,
І зусім ня ўмее гаварыць.

Маладым дэльфінам па вірах
У Сусьвеце сівым гоніць страх.

***

У імжы гукам гулкі прытулак.
Лес прагнаў вечны страх за красу.
Лёгкі крыж свой самотных прагулак
Я пакорліва зноў панясу.

Зноўку да раўнадушнай айчыны
Узьляціць дзікай качкай папрок, –
І да змроку жыцьця я прычынны,
Дзе самотнае ўсё як знарок!

Грымнуў стрэл. Над азёрцам спакойным
Крылы качак цяжэй ад смалы,
І быцьцём зьлюстраваным падвойным
Адурманены соснаў ствалы.

Неба дзіўнае з водсьветам цьмяным –
Боль, сусьвету стуманены боль –
О, дазволь быць таксама туманным
І цябе не кахаць мне дазволь!

***

О неба, ты мне будзеш сьніцца звонка!
Ня можа быць, каб ты асьлепла зблізку,
І дзень згарэў, як белая старонка:
Панюшка дыму і панюшка прыску!

***

Няхай імёны пышных гарадоў
Слых лашчаць значнасьцю ў зьнікомай мэце.

Ня горад Рым жыве сярод вякоў,
А месца чалавекава ў сусьвеце.

Ім авалодаць тужацца цары,
Апраўдваць войны сьвятары гатовы,
А безь яго, як тыя сьмецьця сховы,
Нікчэмныя палацы й алтары.

***

Сёстры – грузь і пяшчота, аднальковыя вашы прыкметы.
Медуніцы і восы прагна ружу сьцяжэлую ссуць.
Чалавек памірае. Пясок астывае нагрэты,
І ўчарашняе сонца на чорных насілках нясуць.

КУРОРТНІКІ Й КАРЛАВАРЦЫ

Працяг са старонкі 13.

яго ведаць усе ватэрклязеты, а колькасьць прынятых ваннаў, душаў-шарко, масажоў робіць яго ружовым, усьмешлівым і вялым, як дзіцячы мядзьведзік, зь якога вытрыбушылі пілавіньне. Курортніку нічога ня трэба, усё ёсьць. Курортнік амаль ня паліць тытуню, амаль не ўжывае алькаголю, солі, смажанай бульбы, кансэрваванай садавіны й гародніны, пончыкаў, какосаў, кавы, маянэзу, масла, сала, лою, ікры, качкі, гусака, вантробаў вялікіх і малых жывёлаў і пінцакаў, вяндліны, згушчанага малака й тлустых ёгуртаў. Жыве ціха. Шмат прагульваецца ў лесе, па горных сьцежках. Выглядае на поўнага ідыёта. Толькі гэта падман. Ёсьць занятак, які захапляе курортніка цалкам: любоў да самога сябе. Ён шануе свае органы: страўнік, кішэчнік, сэрца, ныркі, язык, горла, падстраўнікавую залозу, сьпіну, жывот, чэлес і ўсе астатнія складнікі немаладога арганізму, без выняткаў. Душа курортніка сыпіць. Што можа быць лепш? Нірвана, адным словам. І адзін з асноўных удзельнікаў гэтых курортных кайфаў – афіцыянт.



Тыповы карлаварскі афіцыянт носіць шаўковую камізэльку з хлясьцікам на таліі. Ён вышкалены, крышку санлівы, гаворыць па-расейску, нямецку, ангельску й зусім ня радуецца чэскім словам, пачутым з вуснаў замежніка. На піва бярэ з робленай абыякавасьцю. А можа, гэта я не даваў столькі, каб зьдзівіць ці ўзрадаваць? Але на што мне зьдзіўляць карлаварскага афіцыянта? Не пэрсона, не асоба, форма жывой рэстарацыйнай мэблі, дадатак да відэльца з нажом. Толькі найпрыгажэйшы карлаварскі заваконны краявід страчвае палову чароўнасьці, калі на пярэднім пляне адсутнічае гнуткая постаць афіцыянта.

Што падманваць, выдатныя ў Карлавых Варах горы і без афіцыянтаў з паліцыянткамі. Адно задавальненьне шпацыраваць па схілах і захапляцца рамантычнай архітэктураю эўрапейскага гарадка. Як для паэта, дык лепей і не бывае, асабліва для сэнтымэнталіста, аматара чароўных казак і гатычных гісторыяў. Але з усіх тамтэйшых гор мяне ўразіла не каменная грамада, а гурба з костак, тлушчу й скуры. Ізраільцянін – чалавек-гара, чалавек-слон, чалавек неверагоднай шырыні, вагі й масы. Цыгарэта ў ягонай руцэ выглядала, што запалка. Канапа, як толькі ён прысядаў на яе, ператваралася ў фатэль. Людзі, рэчы, расьліны мізарнелі побач з чалавекам-гарой. З раніцы й да позьняга вечара ён упрыгожваў сабою гатэльны хол. Ён прыехаў з мэтаю пахуднець, але на сьняданак зьядаў пяць яек з блінамі. А таму да скону ён застанецца чалавекам-гарою. Канечне, можа, хто й навучыць яго нюхаць какаін, які імгненна згоніць тлушчы. Можа, хто іншы, толькі ня я, бо мне вельмі падабаецца чалавек-гара зь Ізраілю за выключнасьць, адметнасьць і непаўторнасьць. А вось музыка ў гатэлях і рэстарацыях не лягла на душу. І ўсё з-за музыканта.

Рэстарацыйны музыка ў Карлавых Варах – сыты, як кот самотнай немаладой кабеты. І найгрышы ён любіць салодкія, поўныя ўспамінаў пра вялікія імпэрыі: Аўстра-Вугорскую й СССР. Таму сьпявае пра падмаскоўныя вечары й пра Yesterday, пра былую Чэхаславаччыну, дзе чэхі хадзілі ў панах, а славакі ў работніках. Грае карлаварац для немцаў з расейцамі, якія пампуюцца півам і шчодра пляскаюць пасьля кожнага шлягера. Мне ад такой музыкі робіцца млосна, таму й пазьбягаю рэстарацыяў з жывым карлаварскім голасам. А ёсьць жа такія, што любяць гукавую патаку, як мой сусед у гатэльным калідоры, мардаты азэрбайджанец.

Аднаго разу ён выйшаў з прыбіральні й зашпіліў гульфік. Як у паказцы пра расейскага шпіёна, якога выкрылі ў Амэрыцы за зашпільваньне нагавіцаў пасьля выхаду з прыбіральні. Толькі гэта не анэкдот, а самая натуралістычная рэальнасьць. Нафтабарон выкаціўся з ватэрклязэту ў хол нашага гатэлю «Калянада», зашпіліў дарагія нагавіцы, вывудзіў з кішэні «сотавік» і пачаў весьці перамовы з расейскім банкам пра набыцьцё гатэлю Залата Карона за сорак мільёнаў чэскіх каронаў. Ён так упэўнена гаварыў пра выгоды моманту, пра рэальнасьць цаны ў мільён амэрыканскіх даляраў, пра магчымасьць скідак, што я ўпэўніўся ў хуткім пераходзе Залатой Кароны ў маёмасьць азэрбайджанскіх нафтабосаў. І можа, там, у Залатой Кароне, яму ціхенька падкажуць пра неабходнасьць зашпільвацца яшчэ да выхаду з прыбіральні. Ці, маючы грошы, чорны барон найме чалавека, які будзе яму рабіць няхітрую працэдуру.

Дзякуй па-чэску «diki!». І чэхі дзякуюць адзін аднаму бясконца. І лётаюць дзікі па ўсёй Чэхіі, і спасу ад іх няма. Глядзіш, і сам дзікнуў раз, дзікнуў два і паціху прывык. Але ўкладаць хоць бы кроплю ўдзячнасьці ў diki! я так і не навучыўся. Хоць варта шчыра падзякаваць чэхам за наш беларускі сьцяг.

Якіх толькі сьцягоў не вісіць на гатэлях у Карлавых Варах! Усялякіх і розных. Але мне хочацца пабачыць наш. І я хаджу ад гатэлю да гатэлю й выглядаю беларускі сьцяг. Нацыяналіст ён і на адпачынку нацыяналіст. І што ты думаеш, знайшоў. Над ганкам гатэлю Imperial побач зь фінскім лунаў наш бел-чырвона-белы. Старэю, і як папулярызатар бел-чарвона-белай гісторыі Вова Арлоў, шукаю на чужыне беларушчыну. Зрэшты, Чэхія не чужына, а нашая родная славянская зямля і трава.

Ніводзін з чэхаў на тую траву ўвагі не зьвярнуў. Трава як трава. А я вачэй адвесьці ня мог. Сярэдзіна лютага, як у Беларусі, дык самыя

Ах, пяшчотныя сеткі і важкія соты!
Камень зрушыць лягчэй, чым імя тваё паўтарыць.
Анічога ў мяне акрамя аднае турботы, –
Залатое турботы, як часу паклажу збыць.

П'ю паветра змутнелае, як цёмныя воды нядужы.
Плугам час узараны, і ружа зямлёю была.
У марудным вадазвароце цяжкія, пяшчотныя ружы,
Ружу грузь і пяшчоту ў двайныя вянкі запляла.

***

Праз ноч шахраяў грэла сварка –
Ў шынку гулялі ў даміно.
Прыйшла зь яечняю шынкарка;
Манахі выпілі віно.

На вежы ўзьеліся пачвары,
Чый вышчарам страшнейшы рот?
А ўраньні казанік паджары
Ў палаткі заклікаў народ.

На рынку звадзяцца сабакі,
Мянялы ляскае замок.
У вечнасьці крадзе ўсялякі,
А вечнасьць – як марскі пясок.

Яго губляюць панарады –
Ён не трымаецца ў мяхах.
І пра начлег, яму ня рады,
Адну лухту нясе манах.

***

Забыўся слова зноў, што я хацеў сказаць.
Сьляпая ластаўка пад ценяў столь прыб'ецца,
На крылах зрэзаных, з празрыстымі гуляць.
Узрушанасьцю сьлеў начны пяецца.

Ня чутна птушак. Цьмян як сам ня свой.
Табун сьвітае грывамі шаўкова.
Пусты чаўнок плыве ў траве сухой.
Між конікаў прытомнасьць траціць слова.

І ледзь расьце, як храм, на злосьць бядзе,
То раптам здасца звар'яцелай Антыгонай,
То ў ногі мёртвай ластаўкай падзе,
З стыгійскай ласкай і галінкаю зялёнай.

Відушчых пальцаў сорам ня вярнуць мане
І выпуклую радасьць пазнаваньня.
Рыданьне аанідаў страшна мне
І водзван, і туман, і зьзяньне!

Ва ўладзе сьмертных і кахаць, і пазнаваць,
Для іх і гук у ксты пральецца,
Ды я забыўся, што хачу сказаць, –
Душа пад ценяў столь бясплотная прыб'ецца.

Празрыстае ўсё не аб тым цьвярдзіць,
Бо ластаўка, сяброўка, Антыгона...
А на губах, як чорны лёд, гарыць
Стыгійскага прыпамінаньне звону.

***

Калі з ударамі ўдар сустракаецца,
І нада мною, як кон,
Забыўшы стому, маятнік гайдаецца,
І хоча быць мне лёсам ён,

Сьпяшаецца, і груба супакоіцца,
І выпадзе верацяно, –
І немагчыма ўбачыцца, дамовіцца,
І не ўхіліцца ўсё адно.

Узоры вострыя пераплятаюцца,
І, ўсё шпарчэй, імпэтней зноў,
Атручаныя дроцікі ўзьвіваюцца
Ў руках адважных дзікуноў...

З расейскае пераклаў Рыгор Барадулін



Рыгор Барадулін

ВОСІП МАНДЭЛЬШТАМ

Беспрытульны, як восеньскі вецер,
Клаў у дзьверы даверу ксты.
І ў раку шанцаваньня венцер
Ставіў
І выцягваў пусты.

І бядачыў, і бачыў зоры
Там,
Дзе бачылі вугалі.
Утрапёны,
На радасьць хворы
Слухаў,
Як завірухі гулі.

Гналі, мучылі, зьневажалі,
І на неба саслалі.
Там
Можа, будзе боскага жалю
І павагі варт
Мандэльштам...

маразы, самыя сумёты. Карлавы Вары таксама сьнегам заваліла. А тут сонца: сьнег на дарожным адхоне растаў, і ў вялікай праталіне зялёная, сьвежая, вясновая трава. Чэху тая трава ня ў дзіва, а мяне парадавала. Можа, і ў Беларусі ёсьць шмат розных цудаў, паўзь якія праходзім, не спыняючыся? Можа, наш бацька нацыі – таксама цуд неацэнны? Гумар, канечне.

Чэхі, дарэчы, нацыя з гумарам. Яны заўсёды ў гуморы. Адно цяжка зразумець: чаму яны носяць такі сьмешны, швейкаўскі, дзябёлы абутак фірмы Bat'a. І абуваюцца ў яго ўсе пагалоўна. Мусіць, іхны прэзыдэнт з драматургаў, Вацлаў Гавэл, гэтаксама крочыць у аб'яднаную Эўропу ў бацявых чаравіках. У кожнага народа свой баця. Чэхі, пэўна ж, дзівяцца зь беларусаў, якія маюць у прэзыдэнтах бацьку з саўгасных дырэктароў.

Лёс кпіць з кожнай нацыі па-свойму. І ў немцаў, былых гаспадароў Карлавых Вараў, быў свой «государственный лидер».

Немцаў тут процьма была, ёсць і будзе. У немца тут ці ня ўсе магчымыя перавагі, нават жывая гісторыя вялікай Германіі на кожным кроку: дом, дзе жыў Гётэ, віла, дзе адпачываў Бэтговэн, тэатральны гаўбец, зь якога гарлаў Гітлер... Грошай у немца больш, чым у чэха, і ён прыяжджае ў некалі свой Karlsbad, і не адзін, а з ладнай каханкаю. Залазіць у саўну, прэе, выскоквае, намазвае расчырванелую скуру кветкавым мёдам і боўтаецца ў дубовую бочку зь ледзяною вадой. Немец нікога не саромеецца: плавае ў агульным басэйне цалкам голы. А пасьля лазьні сядае ў бары, п'е нямецкае піва й гучна сьмяецца. Па немцы ня скажаш, што ён шкадуе страчаны Нямеччынай у 1945-м казачны Karlsbad, бо ён верыць у хуткае аб'яднаньне ўсёй Эўропы, ва ўрачыстае й пераможнае шэсьце нямецкага капіталу на чэскія тэрыторыі, у сваё канчатковае вяртаньне ў Карлавы Вары ня госьцем, а гаспадаром. Перад немцам – доўгатэрміновая пэрспэктыва, а вось у ягонай каханкі, з выгляду вугоркі, пэрспэктываў нямашака. Па ўсім відаць, наступным разам немец прыедзе разам з жонкаю, каб палекаваць прыпсаваныя півам ныркі. А гэтым разам прамываць ныркі прыехаў казах.

У казаха выдатны гарнітур-тройка. Такі строй можа сабе пашыць толькі дзяржаўны чыноўнік найвышэйшага рангу. Казах загадвае мытнямі і нядаўна балятаваўся ў прэзыдэнты Казахстану. Таму ўсе навокал – патэнцыйныя парушальнікі мытнага заканадаўства Рэспублікі Казахстан. Адпаведна, трымаецца пэўная адлегласьць. І ў шатні, калі ён быў загорнуты ў прасьціну, а я выкручваў плаўкі, дыстанцыя захоўвалася. І цыцкастая мэдсястра, што заляцела ў разьдзявалку, ні на мілімэтар не парушыла той адлегласьці. «Я нічэвоо нэ відела!» – прагаварыла жанчына, утаропіўшыся ў мой чэлес. «Слепая, да? Ты – слепая?» – чамусьці вельмі бадзёра спытаў казах. Мэдсястра сумелася ня столькі ад маёй аголенасьці, колькі ад мытнікавага мядзьведжага жарціку.

Казах заўсьміхаўся. Паказаў кепскія, але яшчэ свае зубы. Галава ў казаха падобная да меднага сагана. Твар нязвыкла шырокі. І я зусім не чакаў, што ўсьмешка зробіць казахскі твар яшчэ шырэйшым. Гэта той выключны выпадак, калі твар чалавека ўшыркі большы, чым увышкі.

У Карлавых Варах усьміхаюцца ўсе, усім весела, ня сумна й мне, але хочацца яшчэ спакойнага, немітусьлівага сяброўства. Такога, каб пагаварыць, выпіць разам грамаў чатырыста мінэральнай вады, пагуляць па гарах, зьесьці ў рэстарацыі стронгу, абмеркаваць чэшак і звычайнай травой палюбавацца. Шукаў я такога сябра і знайшоў. Ён, як ты здагадваесься – чэх. Такі сапраўдны чэх у чорным капялюшыку, з усьмешкай, з гонарам, але без фанабэрыі. Я яго любіў зь дзяцінства. Спадзяюся, я таксама зачытваўся ягонымі вясёлымі апавяданьнямі з розных кішэняў. Я выбраў сабе ў сябры Карэла Чапека. Бо шмат разоў перачытваў ягоныя нататкі з розных куткоў тады яшчэ неаб'яднанай Гітлерам Эўропы, бо люблю паразглядаць наіўныя, зробленыя зь ненавязлівай дакладнасьцю малюнкі, бо шаную ягонае знаёмства-сяброўства з самым грунтоўным раманістам XX стагодзьдзя Томасам Манам. У творчасьці Чапека мне падабаецца ўсё: і мэтафізычныя фатаздымкі з бацевымі чаравікамі, і афарыстычныя жарты, і нянавісьць да гітлерызму, і нарысы пра тое, як рабілася чэскае кіно й чэская газэта. Вось з кім хацелася б пагаварыць у карлаварскай альтанцы. Сказаць яму dіkі за геніяльна вынайдзенае слова робат. Сапраўды геніяльнае. Паслухай, як гучыць... Паўстаньне робатаў пад кіраўніцтвам Спартака. Чуеш? І так, як ты чуеш мяне, я чую Карэла Чапека. Яшчэ ж засталіся ягоныя старонкі, не прачытаныя мной. Dixi.

Карлавы Вары. Люты. 1999 год.



Чэслаў Сэнюх:
«Я ПАПРАСІЎСЯ Ў ГРАМАДЗЯНСТВА БНР»

Працяг са старонкі 1.

«НН»: Хто быў разам з Вамі ў СБМе?

Ч.С.: На жаль, з тых часоў у мяне сяброў не засталося. Пра падзеі той пары добра напісаў знаёмы мне Юры Туронак у сваёй кнізе «Беларусь пад нямецкай акупацыяй».

«НН»: Як даўна Вы працуеце ў літаратуры і над перакладамі?

Ч.С.: З канца 70-х і да пачатку 90-х супрацоўнічаў з маскоўскім часопісам «Советская литература», галоўным рэдактарам якога была дачка пісьменьніцы Ванды Васілеўскай Ева Васілеўская. За беларускую паэзію ўзяўся ў 1982 годзе, калі адзначаўся стогадовы юбілей Янкі Купалы й Якуба Коласа. Дарэчы, Купалавага «Прарока» я чытаў з эстрады ў Любчы і Навагрудку яшчэ падлеткам. Хацеў бы сказаць вось яшчэ што. Ёсьць у мяне цікавы дакумэнт — мэтрыка, альбо пасьведчаньне пра шлюб маіх бацькоў, якім яны пабраліся ў Кіеве 1914 году. Сьведкам на шлюбе быў родны брат бацькі, які вярнуў сабе старое прозьвішча. І атрымалася, што бацька мой — Сэнюх, а родны дзядзька — Сэняўскі. А ўсяго ў бацькавай сям'і было пяць братоў і дзьве сястры, якія, як сьведчыць сямейная легенда, сваім родапачынальнікам лічаць літоўскага гетмана Міколу Сэняўскага. На жаль, пасьля полымя войнаў, татальных разбурэньняў і мітусьлівых пярэбараў зь бяды ў гора толькі й засталося, што шлюбнае пасьведчаньне.

«НН»: Дык усё ж кім вы сябе адчуваеце?

Ч.С.: Па крыві я належу напалову Беларусі, напалову — Польшчы. разам з тым, нацыянальнасьць мая — як у Адама Міцкевіча, калі трымацца ў гэтым пытаньні таго падыходу, што вызначаецца яна сьвядомасьцю і ёю ж ствараецца. Між іншым, у верасьні 1998 году я напісаў заяву з просьбай лічыць мяне грамадзянінам Беларускай Народнай Рэспублікі. Ідэю грамадзянства БНР падтрымліваю ўсёй душою, бо нам у Польшчы вельмі важна ведаць, з кім у недалёкай будучыні мы будзем межаваць: з Расеяй ці ўсё ж зь незалежнай Беларускай Дзяржавай.

Запісаў С.А.



НАША НІВА 90 ГАДОЎ ТАМУ

5, 12 сакавіка 1909 году

СЭРБІЯ І АЎСТРЫЯ.

Калі Аўстрыя прылучыла да сябе Босьнію і Герцэговіну, дзе жывуць таксама сэрбы, Сэрбія апынулася як у меху: няма ёй выхаду да мора. Сэрбія пачала гвалту крычаць, варушыцца і дамагацца, каб ёй іншыя царствы далі кавалак зямлі, каб зрабіць праход да Адрыятыцкага, або «Сіняга, славянскага» мора. Пачалі сэрбы і ў Босьніі гудзець: яны ня хочуць сядзець пад Аўстрыяй. Вось, Аўстрыя накіравала гарматы на Сэрбію, а Сэрбія ізноў на Аўстрыю; дый Сэрбія пачала енчыць прад усімі царствамі Эўропы на сваю крыўду. А з Сэрбіяй такая справа, што і ваяваць ёй кепска, і не ваяваць кепска, Сэрбія найбольш жыве з таго, што прадае дабро, жывёлу, сьвіней і др. Аўстрыі, а калі хоча прадаваць ня Аўстрыі, а другому, дык усё роўна трэба везьці праз Аўстрыю.

Цяпер Сэрбіі няма як жыць, няма і надзеі на лепшую долю. Раней яна чакала, што Босьнія і Герцэговіна злучацца зь ёю ў адно Вяліка-Сэрбскае гасударства. Але гэтага Аўстрыя і Немцы ня могуць дапусьціць, бо тады Расея, быццам, будзе камандаваць сэрбамі, і Аўстрыі цяжка будзе ўткнуцца на Балканскі паўвостраў. Апошнімі днямі ўсе думалі, што вось-вось пачнецца вайна. Але, пакуль што, да яе ўсё яшчэ толькі рыхтуюцца. Які будзе канец гэтага, пабачым скора.

З НАВАГРАДЗКАГА ПАВ. Нядаўна каля маёнтку Бардзяч — графіні О'Рурк — знайшлі нежывога чалавека, катората аб'елі сабакі, а як пасьля дазналіся, дык нябожчык гэты быў зь вёскі Клюковічы; ён яшчэ за тры дні перад гэтым вышаў за інтарэсамі да другой вёскі. Цікавая рэч, што было прычынаю яго сьмерці: ці яго хто забіў, а труп ужо сабакі аб'елі, ці можа яго жывога заелі сабакі з таго двара, бо, як людзі кажуць, то яны быццам чулі, як нехта крычаў ратунку, а тымчасам сабакі вельмі ўядаліся, — але ніхто не прыбег на помач. Нябожчык — яшчэ саўсім малады чалавек — пакінуў жонку і чацьвёра малады дзяцей. Хоць сабак у гэтым маёнтку толькі пяць, але яны затое вялікія, прымерам кажучы, як гадавыя жарабяты, і вельмі многа нарабляюць шкоды: нападаюць на людзей, душаць сьвіней, авечак і т.д., бо ніколі іх не прывязываюць.

«Сусед».

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА.

Ракаў Менск. губ. і павету. Трыэдору:

«Недалёка на сьвеце,
У Віленскім павеце,
Ёсьць двор, Пранчэйковам зван,
Ён графу Тышкевічу прынадлежны
І з Чэрнеўскім дваром сумежны,
Пад каманду камісару Стэфановічу дан...»
«Мужчыны любяць аглядаць
Паненак мерных і здаровых,
Бяз вымыслаў гэтых новых...»

Дзядзенька, гвалт!!!

ПІВА ЗА БЕЛАРУСЬ

прэм'ера акцыі

Асабіста я люблю піва «Хольстэн». Люблю, пачынаючы з далёкага дзяцінства, бо, яшчэ не пакаштаваўшы таго смаку, атрымаў у падарунак ад старэйшага брата, што вярнуўся з вандроўкі па Прыбалтыцы, значак – рыцара на коні зь мячом і тарчай, а на тарчы – літара «Н». Гэтая першая мая «Пагонька» праіснавала ў мяне на галаўных уборах без малога гадоў дваццаць. Але смак у піва «Хольстэн» ня лепшы. А ў якога лепшы смак? – стаў я сабе думаць неяк, стаў апытваць сяброў рэдакцыі. І выявіліся паміж нас аматары наступных марак:

«Ракаўскі бровар» (Менск)
«Рэчыцкае» (Рэчыца)
«Кароль хмелю» (Ліда)
«Старажытнае» (Менск)
«Граф Таўбэ» (Берасьце)
«Князь Рагвалод» (Полацак)
«Чорны прынц» (Ліда)
«Клясычнае» (Ліда)
«Геральд» (Пружаны)
«Аліварыя» (Менск)
«Легенда» (Магілеў)
«Князь Альгерд» (Віцебск)
«Портэр» (Менск)
«Алімпійскае» (Ліда)
«Старыя Трокі» (Вільня)

Але гэты сьпіс і няпоўны, і няпэўны.

Без сумневу народны рэйтынг нашага нацыянальнага напою могуць вызначыць толькі думкі чытачоў першай беларускай газэты.

Увага! Пачынаем стварэньне рэйтынгу беларускага піва. Абярыце 5 найлепшых і 1 найгоршы, на Ваш погляд, гатунак піва і павядаміце сваю думку лістом ці паштовай карткай на адрас «Нашай Нівы», прыпісаўшы, калі Вы п'еце піва, з кім, з чым, як, з чаго і дзеля чаго. Будзе ясна, будуць прызы, будуць і пераможцы, і піва. Панове, піце піва і пішыце ў «Нашу Ніву»!

Андрэй Мельнікаў

Паштовая скрынка

Л.Ахр. зь Берасьця. Вы асучасьнілі цытаты зь Леніна. Як жа нам тады гэта друкаваць? Цытатамі нельга распараджацца абы-як. Думкі Вашыя бярэм пад увагу і перадамо тым, каму трэба, каб узялі пад увагу.

Міхаілу І. з Холмечы. Цяпер рэдакцыя не прадае кніжок, але мы зьбіраемся вярнуцца да гэтай практыкі. Фактычна ўсе кнігі апошніх гадоў, што яшчэ ёсьць у продажы, можна замовіць у фондзе «НН» праз пошту: а/с 71, Менск, 220123. Мы перадамо ім Ваш ліст, каб яны выслалі сьпіс таго, што маецца. Адрас кнігарні «Падпісныя выданьні»: пр. Скарыны 14, Менск, 220050. Але ў Рэчыцы ж таксама павінна быць кнігарня, у якой можна на энцыкляпэдыі падпісацца, дык, мабыць, выгадней там. Калі будзеце ў Менску, можна паспрабаваць зьвярнуцца таксама ў выдавецтва «Беларуская энцыкляпэдыя». У іх там непасрэдна мусіць быць таньней: вул. Скарыны 15а, Менск, 220072.

Аляксандру Н. зь Пецярбургу. Перакладзенае Вамі апавяданьне пачынаецца: «Даўно калісьці давялося мне наведаць псыхіятрычную бальніцу Ўлёры, якую тамтэйшыя жыхары дасьціпна называлі «вар'ятняй». Наведаў не таму, што прагнуў пабачыць няшчасных хворых, а дзеля таго, каб перадаць невялічкую пасылку роднаму дзядзьку, які хварэў на нэрвы». Або ў перакладзе конь не валяўся, або Вінцэсь М. маніць, пішучы, што творы Аголы пазначаныя «тонкім псыхалягізмам».

Газэце «Р-я Б-ь». Постмадэрнізм – гэта калі разумеюць тысячы, а сьмяюцца мільёны.

Васілю Ц. зь Менску. Такі тонкі сьцёб ня ўсе зразумеюць.

Андрэю Ю. з Горадні. Летась былі надрукаваныя дзёньнікавыя запісы розных асобаў – ад Панчанкі да Коржа. Вашыя, на жаль, сваёй патрабавальнасьцю, дзяржаўна-гаспадарчым клопатам і адвольнымі пералікамі «правільных» герояў нагадалі запісныя кніжкі Алеся Адамовіча. Вось Вам чатыры цытаты з Адамовіча, параўнайце: «... калі чуеш, што двухтомнік Быкава перакладзены ў Кітаі, разумееш, што можа, можа беларуская літаратура гаварыць і там, дзе яе слова асабліва патрэбна. Выходзіць са сваім антываенным словам як мага далей (вось як Быкаў – у Кітай). Гэта павінна быць справай грамадзян. нашага сумленьня»; «Вясковая літаратура папярэднічала важнейшаму рашэньню – заняцца нарэшце нечарназем'ем. Ну, а якія мы не ўзьнялі праблемы, пакуль ня ўперліся ў іх ілбом: гэта аб уласнай гаспадарцы калгасьнікаў. Перлі да канца разам з чыноўнікамі, пакуль не дажыліся да закрытага стала заказаў пры СП»; «Неужели те стороны, те правительства, ученые, промышленники, которые готовы принимать участие в СОИ, не осознают, что, создав эту систему, люди отдадут жизнь, судьбу в руки роботов, компьютеров»; «Вазьміце сучасных – Броўку, Быкава, Танка, Панчанку, Барадуліна, Стральцова, Казько, Чыгрынава і іншых, яны выдатная атэстацыя беларускай літаратуры – як белар., высокаразьвітай: глыб. псыхал., філяз. бачаньне сьвету і г.д.». Як у Вас, толькі вэктары зьмененыя, а новага нічога Вы ня кажаце. І ў Вас, і там, дарэчы, гэтыя рысы слабей вытыркаюцца ў расейскамоўных, а мацней у белмоўных запісах. Дзёньнік можа быць пісаным з разьлікам на публікацыю або інтымным. Ваш нібыта інтымны, але ствараецца ўражаньне, што пісаўся з улікам будучага друку. Выходзіць няшчыра, быццам над Вамі і аркушам стаяў нехта трэці і пільнаваў, каб Вы адкрылі сваю душу «ў луччым відзе». Вы просіце падправіць пунктуацыю, не парушаючы стыль. Але ж пунктуацыя – гэта і ёсьць стыль, гэта самая праўда. Нішто так ня здраджвае, як пунктуацыя. І ці чыталі Вы ўспаміны В. Стомы-Сініцы ў «Полымі» 9–12/1998, якія называюцца «Маё мястэчка»?

Дзянісу Дз. з Гомеля. Любыя антысэміцкія намёкі брыдкія.

Кастусю Т. зь Менску. Зьвярніцеся ў рэдакцыю па ганарар.

У наступным нумары. Тэксты песень «Народнага альбому» і новыя творы М.Анемпадыстава і Л.Вольскага. Тэма нумару: Крыўда і Праўда ў беларускім культурным кантэксьце XX ст. Маналёгі С.Алексіевіч: «У мяне ёсьць нацыянальная афарбоўка»

Наступны нумар газэты выйдзе 29 сакавіка.

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

КУПОН БЯСПЛАТНЫЯ ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. 220050, а/с 537

Тэкст ______

______

Імя і прозьвішча ______

Адрас, тэлефон ______

«Наша Ніва» незалежная газэта, заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991. Галоўны рэдактар Сяргей Дубавец. Рэдактар выпуску Андрэй Дынько. Мастацкі рэдактар Сяргей Харэўскі. Набор Аляксандры Макавік. Выдавец: рэдакцыя газэты «Наша Ніва». Заснавальнік Павал Жук. Адрас для допісаў: 220050 Менск а/с 537. Tel/fax (017) 227-78-92 E-mail: niva@user.unibel.by http://members.xoom.com/Nasa_Niva.

Наклад 3425. 8 палос фарматам A2. Нумар падпісаны ў друк 18⁰⁰, 14.03.1999. Друкарня выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, праспэкт Францішка Скарыны, 79. Замова №1178

Кошт свабодны.

Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня N 581 ад 4-га ліпеня 1996 г., выдадзенае Дзяржаўным камітэтам па друку Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, пр. газэты «Известия», д. 8, кв. 173.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12